**Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь**
**Беларускі дзяржаўны інстытут праблем культуры**

**Галіна Каржанеўская**

# На сцэне дня

**Зборнік п'ес**
**для лялечных і драматычных**
**аматарскіх тэатраў**

**МІНСК**
**БелДІПК**
**2004**

УДК 821.161.3-2
ББК 84(4Беи)-6
К 23

**Каржанеўская Г.**

**К 23**

**На сцэне дня: Зб. п'ес для лялеч. і драм, аматар. тэатраў**

**Галіна Каржанеўская. — Мн.: БелДІПК, 2004. — 184 с.**

**ISBN 985-6138-86-8**

Галіна Каржанеўская ўмее сказаць пра важнае проста і вобразна. Гэта тычыцца як яе вершаў, так і драматургіі. Псіхалагізм, гумар і чалавечнасць — вось асноўныя асаблівасці яе п'ес для дзяцей і дарослых.
У зборнік «На сцэне дня» увайшлі новыя творы драматурга, а таксама лепшае з раней напісанага і ўвасобленага на сцэнах аматарскіх і прафесійных тэатраў.
Кніга адрасавана лялечным і драматычным самадзейным калектывам установаў культуры, школ і бібліятэк, усім, хто цікавіцца тэатральнай творчасцю і шануе роднае слова.

УДК 821.161.3-2
ББК 84(4Беи)-6
К 23

ISBN 985-6138-86-8

© Каржанеўская Г.А., 2004
© Афармленне БелДІПК, 2004

## НА СЦЭНЕ ДНЯ

Рассоўваем мы штору, як заслону,
Выходзячы
на сцэну дня
штодзённа.
Хто ў галоўнай ролі,
хто статыст,
Узнагарода — воплескі і свіст.

Здараецца,
як найвышэйшай ласкі
Чакаем мы нябачнае падказкі
Перад рашучым крокам —
і дарма:
Суфлёра аніводнага няма.

Як рэжысёр, кіруе намі лёс,
Усмешак патрабуе ён і слёз.
Выкладваемся:
плачам і рагочам.
На сцэне дня
халтурыць мы не хочам

*Галіна Каржанеўская лічыць сваёй малой радзімай Міншчыну: нарадзілася каля Слуцка, падрастала на Капыльшчыне, закончыла школу і настаўнічала ў Лагойскім раёне. З 1980 г. жыве ў Мінску.*

*Працавала на Рэспубліканскім тэлебачанні, а пасля звыш 15 гадоў аддала журналісцкай працы ў газеце «Літаратура і мастацтва». Узнагароджана нагрудным знакам «Выдатнік друку».*

*Паэт, драматург, публіцыст. Выдала звыш дзесяці паэтычных зборнікаў, сярод якіх «На мове шчасця» (1973), «Жыла-была...» (1983), «Званы гадоў» (1987), «Невымоўнае» (1991), «Асенні мёд» (1999) і іншыя. Напісала некалькі кніг паэзіі і прозы для дзяцей.*

*У драматургіі дэбютавала п'есай «Зуб мудрасці» пра настаўніцкае жыццё («Маладосць», 1979).*

*Першая пастаноўка адбылася на сцэне Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Якуба Коласа («Іван Світаннік», 1980).*

*Аўтар многіх п'ес для дзяцей і дарослых, увасобленых аматарскімі і прафесійнымі тэатрамі Беларусі.*

**Дзяцінства сцежкі і прысады...**
**Мы ўжо туды не пападзём.**
**А свет яго такі багаты,**
**Што не апішаш і пяром.**

## ЧАСТКА 1

## ШУКАЙЦЕ КВЕТКУ-ПАПАРАЦЬ

П'еса для тэатра лялек

Дзейныя асобы:

ХЛОПЧЫК.
КУПАЛКА.
ХОХЛІК.
АСОТ.
КРОТ, служка Асота.
БАБУЛЯ.
ВЕЦЕР.
ВУСЕНІ.
МАТЫЛІ, СТРАКОЗЫ.

## Уступ

*Усмешлівая Бабуля рассоўвае заслону. Плот і пудзіла на заднім плане паказваюць нам, што мы на агародзе.*

БАБУЛЯ. Падрыхтаваліся слухаць? Ну і малайцы. А я вось тут з пустазеллем ваюю. Ой, нарасло, ой, насеялася!.. Лебяда-бяда ды макрыца-чужаніца... Палоць не спраўляюся, спіну не разагну. Каб не ўнук — зусім бы рукі апусціліся.
ГОЛАС ХЛОПЧЫКА. Эй, бабуля!
БАБУЛЯ. Што, унучак?
ХЛОПЧЫК *(з'яўляючыся)*. Дапамажы мне асот выцягнуць.
БАБУЛЯ. Кінь, дзіцятка. Я сама яго выкарчую.
ХЛОПЧЫК. Во, рукі пакалоў, а ён — ні з месца.
БАБУЛЯ. Ён такі — злосны, чэпкі.
ХЛОПЧЫК. А калі злосны, то навошта ён вырас?
БАБУЛЯ. Усё хоча жыць, дзіцятка. І сонца ў небе, і дуб у полі, і казурка ў жыце. Асот — таксама... Хай бы і жыў, толькі нам не шкодзіў.
ХЛОПЧЫК. А давай яго ўсе разам — як рэпку. А? Вераніку пазавём...
БАБУЛЯ. Сястрыца твая ўжо на луг збіраецца. Купалле ж сёння. Ці не чуў? Кветка-папараць апоўначы расцвіце.
ХЛОПЧЫК. А-а, помню. Ты расказвала. Чароўная яна, так?
БАБУЛЯ. Чароўная. Шчасце прыносіць.
ХЛОПЧЫК. Давай і мы з табой яе пашукаем, а?
БАБУЛЯ. Малы ты яшчэ, унучак. А я старая. А бывала, і я на лузе карагоды вадзіла, песні спявала, вяночкі пляла ды на ваду пускала.

*Бабуля ўспамінае маладосць. Мы бачым яе стройнай і прыгожай, у народным вышытым строі. Яна апускае на гладзь ракі два вяночкі. Тыя плывуць, калышуцца, злучаюцца і разлучаюцца. Гучыць мелодыя «Купалінкі».*

ХЛОПЧЫК *(нэндзіць)*. Хачу на Купалле... На Купалле хачу... *(Паўза.)* Бабуля, а раней часу кветку гэту ніхто не сарве? Падкрадзецца які-небудзь злыдзень і...
БАБУЛЯ. Не бойся, нічога з ёй не здарыцца. Яе, кажуць, сама Купалка ахоўвае. Ды і ноч не за гарамі. А заўтра сястра ўсё чыста табе раскажа. *(У залу.)* Ой, і не хацелася ж яму спаць ісці! Ледзьве ўгаварыла.

*Ранейшыя дэкарацыі знікаюць, і мы бачым Хлопчыка ў ложку. Бабуля папраўляе на ім коўдру. Па-ранейшаму гучыць мелодыя песні.*

ХЛОПЧЫК *(праз сон).* Бабуля, а яе праўда ніхто не сарве?
БАБУЛЯ. Спі, горачка ты маё! Набраў у галаву. Добрых табе сноў! *(Ціхенька выходзіць.)*

**Карціна 1**

*Хлопчык спіць. Гучыць мелодыя фантастычнага сну. Ва ўладаннях Купалкі многа сонца, кветак, зеляніны. Купалка (дзяўчына ў летняй сукенцы, з вянком на галаве і гірляндай на шыі) здзьмухвае з далоні нейкае насенне. Спявае.*

ПЕСНЯ КУПАЛКІ

Расла краска на паляне,
Расла-расцвітала,
А дзяўчына тую краску
Бачыць пажадала.
На лугах шукала, у полі,
У бары-барочку.
Не знайшла яе дзянёчкам,
Дык спаткала ноччу.
Краску гожую ў вяночак
Дзеўчына ўплятала,
І навокал, як ад сонца,
Светла-светла стала.

*Пасеяныя зёлкі на вачах пачынаюць расці і расцвітаць. За ўсім гэтым назірае Хлопчык, якому сніцца дзівосны сон.*

ХЛОПЧЫК. Глянь, расцвітаюць! Во дзівосы! *(Прыгледзеўся да дзяўчыны.)* Хто ты такая?
КУПАЛКА. Не назнаеш?
ХЛОПЧЫК. Не-а.
КУПАЛКА. Хіба бацькі не расказваюць табе казак, паданняў?
ХЛОПЧЫК. Расказваюць.
КУПАЛКА. Пра каго?
ХЛОПЧЫК. Пра Бураціна, пра Снежную каралеву, пра Дзюймовачку...

КУПАЛКА *(расчаравана.)* А-а-а… Пра мяне, значыць, забыліся.
ХЛОПЧЫК. Бабуля штось казала. Пачакай, я ўспомню.
КУПАЛКА. Так я і ведала. І вогнішчы паляць, і вянкі плятуць, і песні спяваюць, а мяне… мяне быццам і няма. Бывай! *(Адыходзіць.)*
ХЛОПЧЫК. Чакай! Я ўспомніў!
КУПАЛКА *(абнадзеена).* Праўда?
ХЛОПЧЫК. Купалка, вось ты хто!
КУПАЛКА. Дзякуй табе, хлопчык.
ХЛОПЧЫК. За што ты дзякуеш?
КУПАЛКА. У цябе добрая памяць. А памяць — гэта вельмі важная рэч. Без яе чалавек не быў бы чалавекам. *(Паўза.)* А цябе як завуць?
ХЛОПЧЫК. Андрэйка.
КУПАЛКА. Хочаш, Андрэйка, я пакажу табе сваё царства?
ХЛОПЧЫК. Ца-арства?
КУПАЛКА. Ну так. Я не ведаю, як гэта можна назваць па-іншаму.
ХЛОПЧЫК. А карона ў цябе ёсцека?
КУПАЛКА *(паказвае на вянок).* Вось мая карона.

*Побач праляцела вялікая лупатая Страказа, Хлопчык спалохана адхіснуўся.*

ХЛОПЧЫК. Ну, вымахала!
КУПАЛКА. Не бойся, гэта наш верталёцік. Хочаш пакатацца? *(Пляскае ў далоні.)*

*«Верталёцік» апусціўся, Хлопчык сеў на яго і трошкі палятаў.*

ХЛОПЧЫК. Здорава! З матылямі ты таксама сябруеш?
КУПАЛКА. Так. *(Уздыхнула.)* Але ў мяне ёсць і ворагі.
ХЛОПЧЫК. Ворагі? Мне гэта не падабаецца.
КУПАЛКА. Мне тым больш. *(Тры разы пляскае ў далоні.)*

*З'яўляецца Хохлік — маленькі, смешны і адначасова важны дзядок у шапачцы набакір.*

ХОХЛІК. Я тут.
КУПАЛКА. Знаёмцеся.
ХЛОПЧЫК. А гэта што за цуд?
ХОХЛІК *(з годнасцю).* Я не цуд. Я Хохлік.

ХЛОПЧЫК *(смяецца).* Ой, смяхоцце! Ой, памру! Пад табурэтку ходзіць пешшу!
ХОХЛІК *(стрымана).* Малады чалавек, мне ўчора споўнілася роўна дзвесце год.
ХЛОПЧЫК *(свіснуў ад здзіўлення).* Дзвесце?! Ніколі б не падумаў.
ХОХЛІК. Нашто зоркі — каб мігцелі, нашто вочы — каб глядзелі. *(Спявае.)*

ПЕСНЯ ХОХЛІКА

На лузе я нібыта дома,
Мне сцежка кожная знаёма,
Бо я жыву на белым свеце
Не год, не два, а цэлых дзвесце.
Буджу я кветкі раніцою,
Паю іх свежаю вадою,
І для мяне яны што дзеці,
Не год, не два, а цэлых дзвесце.
Хвілінкі вольнае не маю,
Я людзям радасці жадаю.
Для іх стараюся, паверце,
Не год, не два, а цэлых дзвесце.

КУПАЛКА. Што ў нас новага, паважаны Хохлік?
ХОХЛІК. Званочкі сёння праспалі. Чмялі папрасілі выхаднога. Страказа пасварылася з мурашом.
КУПАЛКА. З-за чаго?
ХОХЛІК *(развёў рукамі).* Не прызнаюцца.
КУПАЛКА. Ну а як пажывае наша прыгажуня?
ХОХЛІК *(пачціва).* Рыхтуецца расцвітаць.
КУПАЛКА. Дзіўна. Колькі разоў бачыла, як расцвітае кветка-папараць, і заўсёды — як упершыню.
ХЛОПЧЫК. А ці можна мне на яе зірнуць? Хоць адным вочкам.
ХОХЛІК. Але яна баіцца чужых вачэй.
КУПАЛКА. У гэтага хлопчыка добрыя вочы.
ХОХЛІК *(вагаецца).* Так і быць. Пакажу я табе чароўную кветку. Хадзем.

*Аглушальна зазвінелі званочкі.*

КУПАЛКА. Нешта здарылася!

ХЛОПЧЫК. А што тут у вас можа здарыцца? Сонейка, кветачкі, матылёчкі...
ХОХЛІК. Зараз даведаюся. *(Пляснуў у долоні і паляцеў на верталёцiку.)*
КУПАЛКА. Можа, вусені?
ХЛОПЧЫК. Калі вусені, то я такую бяду рукамі развяду.

*Вярнуўся Хохлік і ў адчаі закрыў твар рукамі.*

КУПАЛКА. Што з табой, даражэнькі?
ХОХЛІК. Бяда! Бяда! Кветку-папараць...
КУПАЛКА. Што з ёй?
ХОХЛІК. Яе... Яе... Не, не магу.
КУПАЛКА. Няўжо...
ХОХЛІК. Так. Яе... яе сарвалі.
ХЛОПЧЫК. А што я казаў бабулі!
КУПАЛКА. Сарвалі!.. Нашу чароўную кветку... Не магу паверыць!..
ХОХЛІК. Гэта я, я не збярог яе! Эх! *(Садраў з галавы і шпурнуў пад ногі шапачку.)* Усё я!
КУПАЛКА. Як жа цяпер? Якая ж гэта купальская ноч без купальскай кветкі? І нашто тады я? *(Плача.)*
ХЛОПЧЫК. Не бядуйце. Што-небудзь прыдумаем.

## Карціна 2

*Хохлік рашуча тупае наперад, Хлопчык ідзе за ім. Ён прыстаў і ледзьве паспявае. Паказваюцца крылы ветрака.*

ХЛОПЧЫК. Мы скора прыйдзем, а? Ногі баляць.
ХОХЛІК. А ў мяне ніколечкі.
ХЛОПЧЫК. За дзвесце год і я натрэніраваўся б.
ХОХЛІК. Вось мы і прыйшлі. У тым ветраку, малады чалавек, жыве...
ХЛОПЧЫК. Ведаю, млынар там жыве.
ХОХЛІК. І зусім не. У ветраку жыве магутны Вецер.
ХЛОПЧЫК. А навошта нам гэты Вецер?
ХОХЛІК. Ён шмат дзе бывае і пра ўсё ведае. Ён падкажа нам...
ХЛОПЧЫК. ... хто знішчыў кветку?
ХОХЛІК. Правільна. Але яго, на жаль, няма дома. Бач, крылы не круцяцца.

*Прымчалася Страказа-верталёцік.*

СТРАКАЗА. Хутчэй! Хутчэй! На мальву напалі вусені!
ХОХЛІК *(Хлопчыку).* Чакай мяне тут. Я скора вярнуся. *(Паляцеў.)*

*Хлопчык застаўся адзін. Паблізу пралятае Матыль.*

ХЛОПЧЫК. Здароў, матыль! Давай з табой у хованкі пагуляем.
МАТЫЛЬ. Я заняты. Мне засталося апыліць яшчэ дзесяць медуніц.
ХЛОПЧЫК. Хіба гэта работа? Ведаў бы ты, колькі ў мяне летам спраў у бабулі! Агуркі паліваць *(загінае палец)* — раз, грады палоць — два, карову сустракаць з поля — тры, з пеўнем біцца — чатыры...
МАТЫЛЬ. Біцца з пеўнем — не работа, а гульня.
ХЛОПЧЫК. Добрая гульня! Ледзь мне вока не выдзеўб...
МАТЫЛЬ. Бывай! *(Паляцеў.)*
ХЛОПЧЫК. Як жа тут прыгожа! Як у Батанічным садзе.

ПЕСНЯ ХЛОПЧЫКА

Ці дарослы, ці малы ты,
А жыві з душой адкрытай.
І адкрыецца пагляду
Свет, дзівосамі багаты.
Ці малы ты, ці дарослы,
Трэба верыць у дзівосы,
Трэба меней ленавацца
І ў дарогу выпраўляцца.
Пройдзеш лугам, пройдзеш полем —
Назаўжды палюбіш волю
І пачуеш ты, як сэрца
І спявае, і смяецца.

*Хлопчык паляжаў, пагуляў з дубчыкам. Па ўсім відаць, што яму сумна.*

ХЛОПЧЫК. Штосьці Хохліка даўно няма. Скрозь зямлю ён праваліўся, ці што?

*За яго спіной з-пад зямлі вылазіць Крот.*

КРОТ *(голасам Хохліка).* Я тут.

*Хлопчык на ўсякі выпадак адступіў.*

КРОТ. Не бойся, я не кусаюся.
ХЛОПЧЫК. Я і не думаю цябе баяцца.
КРОТ. Што ты тут робіш?
ХЛОПЧЫК. Чакаю. І Хохліка, і дзядзьку Ветра. Няма нікога.
КРОТ. Вецер у камандзіроўцы.
ХЛОПЧЫК. Шкада. Ён нам вельмі патрэбен.
КРОТ. А хочаш, я цябе яшчэ з адным пазнаёмлю? Ён тут самы круты.
ХЛОПЧЫК. І ён нам дапаможа?
КРОТ. Вядома. Калі захоча. *(Штось шэпча яму на вуха.)*
ХЛОПЧЫК. Ну добра. Вядзі.
КРОТ. Кіруй ву-унь туды. А я падземнымі шляхамі. Прывычка! *(Знікае.)*

**Карціна 3**

*Уладанні злога Асота. Гаспадар у шырокім плашчы, таму калючак яго не відно, і выгляд досыць прыстойны. Вусень нешта шэпча яму на вуха, Асот задаволена хіхікае.*

АСОТ. Малайцом! Хвалю. Старайся і далей.

*Вусень папоўз. З'яўляюцца Крот і Хлопчык. Асот сустракае госця з перабольшанай радасцю.*

АСОТ. Х-хто да нас прыйшоў! Рады, вельмі рады.
ХЛОПЧЫК. Дык гэта ты хацеў мяне бачыць?
АСОТ. У нас не так час-ста з'яўляюцца гос-сці. Няма з кім, прызнацца, душ-шу адвесці. А як прыемна пагаварыць з раз-зумным чалавекам пра футбол, палітыку... Ці мала пра што! *(Крату.)* Пачас-стунак для дарагога госця!

*Крот пабег і вярнуўся з суніцамі на лісце лапуха.*

АСОТ. Ну, с-сядай, расказвай, як табе ў нас-с падабаецца.
ХЛОПЧЫК *(есць ягады).* У вас? Нармальна ў вас. Памойму, жыць можна.
АСОТ. Так, я ўсё раблю для таго, каб у маім царс-стве жылося вольна і шчасліва.

ХЛОПЧЫК. Чакай, а хіба гэта тваё царства?
АСОТ *(самазадаволена).* Вядома, маё!
ХЛОПЧЫК. А Купалка хто тут?
АСОТ. Бедная с-сіротка... Недзе ёй было прытуліцца, ну я і пашкадаваў: жыві тут, кажу, памес-сцімся... А Хохлік — мой былы служка.
ХЛОПЧЫК. Няўжо?
АСОТ. Я яго звольніў. С-стары стаў, нерас-старопны...
ХЛОПЧЫК. А-а-а... А ты не ведаеш выпадкам, хто сарваў чароўную кветку?
АСОТ. Якую кветку? Чароўную? Першы раз пра такую чую.
ХЛОПЧЫК. Ну як жа... Яна расцвітае раз на год і...
АСОТ *(перабівае).* Выдумка ўсё гэта, дурата. Байка для ж-жаўтароцікаў — такіх, як ты.
ХЛОПЧЫК *(пакрыўджана).* Я не жаўтароцік. Восенню пайду ў першы клас.
АСОТ. Го-го-го! *(Рагоча.)* У першы клас! А я думаў — у акадэмію...
ХЛОПЧЫК. Ты дарма смяешся. Хохлік, ведаеш, як да мяне звяртаецца? «Малады чалавек», вось.
АСОТ. Дык вы ўжо здружыліся? Знюхаліся, значыцца?

*З-пад яго плашча вылазіць вострая калючка.*

ХЛОПЧЫК. Ой, што гэта?
АСОТ. Дзе? Тут? А-а, гэта для парадку. Для самаабароны, так сказаць. Ці мала хто можа напас-сці...
ХЛОПЧЫК. А-а-а...
АСОТ. Колькі вакол нес-справядлівасці, колькі ў с-свеце зла... С-сэрца крывёю абліваецца. За кожную мошку, кожную казурку зас-ступіцца с-стараюся... Хто ж іх, гаротненькіх, абароніць, як не я?

*Два вусені валакуць Матыля, той упіраецца.*

АСОТ. *(Грозна.)* А гэта ш-што такое?
ВУСЕНІ *(разгубіўшыся).* Нам загадана... Вы самі...
АСОТ. Адпус-сціць! З-зараз жа! І на вочы мне больш не паказ-звацца!

*Вусені задам адпаўзаюць, Матыль паляцеў.*

ХЛОПЧЫК. Так ім і трэба! *(Спахапіўся.)* Ой, загуляўся я... Мне пара.

АСОТ. Прых-ходзь, гос-сцем будзеш...
ХЛОПЧЫК. Паслухай, а як цябе завуць?
КРОТ *(злёгку падштурхоўвае, шэптам).* Ідзі, ідзі, пакуль цэлы... Потым даведаешся.

**Карціна 4**

*Хлопчык набліжаецца да ветрака, дзе ўжо бегае занепакоены Хохлік.*

ХОХЛІК. Дзе ж ён? Куды падзеўся? *(Убачыў Хлопчыка.)* Ідзе! *(Строга.)* Куды вы зніклі, малады чалавек?
ХЛОПЧЫК. У госці хадзіў. Да гэтага... Як яго... Ну, зялёны такі.
ХОХЛІК. Ты быў у асота?!
ХЛОПЧЫК. Я... я не ведаў, што ён асот. (*Ваяўніча.)* А калі і асот, то што? Чым ён горшы за нас? Суніцамі мяне частаваў. І за матыля заступіўся. Я сам бачыў!
ХОХЛІК. Нашто зоркі — каб мігцелі, нашто вочы — каб глядзелі.

*Крылы ветрака закруціліся.*

ХОХЛІК. Зірні, круцяцца! Ён дома! *(Кліча.)* Вецер Буранавіч! *(Адказу няма.)* Вецер Буранавіч!
ХЛОПЧЫК. Эй, дзядзька Вецер!
ВЕЦЕР *(незадаволена).* Хто не дае мне спакою? Я адагнаў вялізную хмару, поўную граду, і цяпер павінен спаць. *(Пазяхае.)*
ХОХЛІК. Выслухайце нас, шаноўны Вецер Буранавіч!
ВЕЦЕР. Не, не магу. Заўтра. Альбо паслязаўтра.
ХОХЛІК. Заўтра будзе позна.

*Вецер зноў пазяхае.*

ХЛОПЧЫК. Ну і соня ён у вас. *(Ветру.)* Паслухай, дзядзька Вецер! Хіба табе не шкада Купалку, якая горка плача?
ВЕЦЕР. Купалка плача? Хто пакрыўдзіў нашу Купалку?
ХОХЛІК. Мы цэлы год даглядалі папараць, мы чакалі купальскай ночы, а нехта падкраўся і...
ХЛОПЧЫК. Чыя гэта работа, дзядзька Вецер?
ХОХЛІК. Мы вырошчвалі кветку для людзей, а яна нават не паспела зацвісці.

ВЕЦЕР. Хвіліначку, я павінен агледзецца. *(Крылы ветрака закруціліся мацней.)*

ПЕСНЯ ВЕТРА

Я там, дзе вышыня,
Дзе спее навальніца.
Мне гром замест каня,
Я свісну — і прымчыцца.
Дзе вольна і высока,
Зусім не адзінока.
Мне зоркі — сваякі,
Я тайны неба знаю,
Стракаты свет людскі
Амаль не заўважаю.
Дзе вольна і высока,
Зусім не адзінока.
Але мяне, сябры,
Гукніце хвіляй злою —
Усе воблакі ўгары
Я разганю сабою.
Дзе вольна і высока,
Бывае адзінока.

ВЕЦЕР. Слухайце. Чароўная кветка ў Асота.
ХЛОПЧЫК. У Асота?!
ХОХЛІК. Як жа я сам не здагадаўся!
ХЛОПЧЫК. Значыць... Значыць, ён вадзіў мяне за нос?
ХОХЛІК. Цяпер ты ведаеш, у каго гасцяваў.
ХЛОПЧЫК. Ну, пачакай, зялёненькі! Пачакай! І я харошы: знайшоў перад кім вушы развешваць! *(Хохліку.)* Пойдзеш са мной?
ХОХЛІК. Куды?
ХЛОПЧЫК. На вайну з Асотам.
ХОХЛІК. Не магу. Я даў слова Купалцы, што буду асцерагацца яго. Інакш яна застанецца зусім адна.
ХЛОПЧЫК. А ты, дзядзька Вецер?
ВЕЦЕР *(пазяхаючы).* Я стараюся не ўмешвацца ў зямныя справы. У мяне і нябесных хапае.
ХЛОПЧЫК. Ага, твая хата з краю? Ну, як хочаце. Я пайшоў.
ХОХЛІК. Не хадзі! Асот хітры і жорсткі!
ХЛОПЧЫК. Ну і што? Мая бабуля вырывае яго голымі рукамі.

ХОХЛІК. Ён задумаў увесь свет пакарыць, усю зямлю аплесці сваімі каранямі!
ХЛОПЧЫК. Каб нейкая калючка ды надумала пакарыць свет! Не будзе гэтага. Бывайце! *(Пайшоў.)*
ХОХЛІК. Пайшоў... Не паслухаўся. Што я цяпер скажу Купалцы?
ВЕЦЕР. Усё будзе добра. Добра будзе... Добра... *(Храпе.)*

## Карціна 5

*Уладанні Асота. Цяпер мы бачым яго ў поўнай красе: з дзікай зеляніны тырчаць даўжэзныя калючкі. На іх нанізаны высушаныя матылі і стракозы. Гаспадар заняты: нанізвае на калючку чарговую ахвяру.*
*Перад Асотам схіліўся ў паклоне Крот. Лапамі ён закрывае вочы ад святла.*

КРОТ. Ваша міласць...
АСОТ. Калі я працую, не смей мне наз-заляць.
КРОТ *(прыніжана)*. Я разумею, пан Асот...
АСОТ. Ш-швэндаюцца тут, гультайнічаюць... Колькі кус-стоў маліны ты с-сёння паш-шкодзіў?
КРОТ. Два, пан Асот.
АСОТ. Два! Вы толькі ўявіце: ус-сяго два!
КРОТ. Я стараюся, я чэсна служу вашай міласці.
АСОТ. Ты прыйшоў мне надакучаць?
КРОТ. Не, пан Асот, але...
АСОТ. Ніякіх «але»! Бачыш, якая тонкая, якая ювелірная работа. Хаця — што ты можаш бачыць?..
КРОТ. Вось я і хацеў напомніць вашай міласці, што вы мне абяцалі...
АСОТ. Я? Табе?
КРОТ. Так. Вы абяцалі за верную службу... зрабіць мяне відушчым.
АСОТ *(нанізаў апошняга матыля)*. Ну цяпер поўны парадак. Уф! Як усё-ткі с-стамляе творчая праца. *(Кроту.)* Ну і што, што абяцаў? На ўс-сякае х-хаценне ёсць цярпенне. Зразумеў?

*Крот пакланіўся і выйшаў. Асот спявае.*

ПЕСНЯ АСОТА
Я, мажа, некаму не любы,
Не ўмею падабацца ўсім.

Мае калючкі — быццам зубы,
І зубы вострыя прытым.
Мяне баяцца не дарэмна,
Мяне прывыклі вырываць.
Маё магутнае карэнне
Дапамагае акрыяць.
Перажыву я ўсе нягоды,
А можа, й вас перажыву.
Спяшайце кланяцца Асоту,
Схіляйце нізка галаву.

*Асот захапіўся спевамі і не заўважыў з'яўлення Хлопчыка. Той іранічна апладзіруе.*

ХЛОПЧЫК. Брава, Асот! Вось ты які, аказваецца!
АСОТ. С-страшны, праўда?
ХЛОПЧЫК. Ды не, праціўны проста.
АСОТ *(рагоча).* Го-го-го... А ты смелы. С-смелых я паважаю. Ну, гавары, чаго прыйш-шоў.
ХЛОПЧЫК. А так проста. Рабіць няма чаго.
АСОТ. Я знайду табе работу. Налаві мне гэтых... пырх-пырх-пырх *(Паказвае.)* Каб не служ-жылі Купалцы. На. *(Працягвае сачок.)*
ХЛОПЧЫК *(нібы не заўважаючы сачка).* І табе не шкада іх, Асот?
АСОТ. Ш-што зробіш, я не раўнадуш-шны да ўсяго прыгож-жага. Люблю глядзець, як яны трапечуцца на маіх калючках. У мяне, малыш-ш, страш-шэнна вострыя калючкі. Х-хочаш пакратаць?
ХЛОПЧЫК *(кратае).* Ага, як пруткі ў бабулі.
АСОТ. Але ты мож-жаш не баяцца. Я гас-сцей не крыўджу, Я с-стары і мудры, я с-справядліва кірую с-сваім царствам.
ХЛОПЧЫК *(не стрываўшы).* І няпраўда! Не тваё гэта царства!
АСОТ. Ш-што?! *(Уздымаецца над Хлопчыкам, натапырыўшы ўсе свае калючкі.)*
ХЛОПЧЫК. Ты падмануў мяне, Асот! Ты хлус і шкоднік, вось хто ты!
АСОТ *(забаўляецца).* Дапус-сцім...
ХЛОПЧЫК. Гэта ты сарваў папараць-кветку!
АСОТ. Пратэс-стую! Ірваў мой с-служка, гэты с-сляпы дурань... *(Трасецца ад смеху.)* Ён с-спадзяецца, што я зраблю яго відушчым!
ХЛОПЧЫК. А-а, вось яно што... Дык ты яшчэ і подлы, аказваецца... Але Купалка пераможа цябе, рана ці позна пераможа.
АСОТ. Ніколі! Я муж-жэйшы! У мяне болей с-слуг!

ХЛОПЧЫК. Затое ў яе больш сяброў.
АСОТ. Хто ж яе с-сябры?
ХЛОПЧЫК. Хохлік, Вецер і я.
АСОТ. І ты?! *(Абхоплівае яго сваімі калючымі лапамі.)*
ХЛОПЧЫК *(спрабуючы вырвацца).* Пусці, чуеш! Пусці!
АСОТ. Адным с-сябрам стане меней. Не пабачыць твая Купалка ні цябе, ні чароўнай кветкі. Вось яна! *(Паказвае калючку з нанізанай зморшчанай кветкай.)* Я высушу яе і падару с-сваёй нявес-сце — крапіве. *(Рагоча.)* Эй, с-слута!

*З'яўляецца Крот.*

АСОТ. З-звязаць і кінуць у падзямелле!
КРОТ. Слухаюся.
АСОТ. І не с-спускаць з яго вока!

## Карціна 6

*Хлопчык у падзямеллі. Зверху звісаюць карані дрэў. Цёмна, змрочна. На варце стаіць Крот. Хлопчык спрабуе вызваліць звязаныя рукі.*

КРОТ. Дарма стараешся. Вяроўка моцная.
ХЛОПЧЫК. Адпусці мяне, Крот. *(Маўчанне.)* Ён заб'е мяне, ён наніжа мяне на калючку, як матыля.
КРОТ. Можа быць.
ХЛОПЧЫК *(азіраецца).* Ніколі не думаў, што пад зямлёй так змрочна. І як ты тут трываеш?
КРОТ. Бацькі жылі, і я жыву. *(Уздыхае.)* Ды хіба гэта жыццё? Эх, быў бы я не кратом, а белым голубам! Лятаў бы па свету, зямлёй і небам любаваўся б...
ХЛОПЧЫК. Навошта ты служыш Асоту?
КРОТ. Ён самы дужы.
ХЛОПЧЫК. Злыдзень ён, твой гаспадар. А ты яшчэ горшы.
КРОТ. Чаму?
ХЛОПЧЫК. Ну гэта ж ты загубіў кветку-папараць.
КРОТ. Не я! Чэснае кратовае — не я! Я звычайны мак сарваў для асотавай нявесты.
ХЛОПЧЫК. Ты добра бачыў гэты мак?
КРОТ. Не, я ж слепаваты. Вусені прывялі, ну я і сарваў...
ХЛОПЧЫК. Эх ты, цемната падзямельная!

КРОТ. Невінаваты я! Вочы мае невідушчыя вінаваты! Вось прамые іх Асот жывой вадой…
ХЛОПЧЫК. Ага, прамые! Знайшоў каму верыць!
КРОТ. Ён абяцаў!
ХЛОПЧЫК. Ды ён смяяўся з цябе і тваёй мары! Ён проста качаўся ад смеху, а ты…
КРОТ. Няпраўда!
ХЛОПЧЫК. Клянуся! Сонцам клянуся!
КРОТ. Ну калі сонцам… Давай я развяжу табе рукі. *(Развязвае.)*
ХЛОПЧЫК. Зусім анямелі…
КРОТ. Пройдзе.
ХЛОПЧЫК. Растлумач ты мне, кроце: за што Асот так узненавідзеў кветку-папараць?
КРОТ. Старая мыш наваражыла, што сёлета, як толькі папараць расцвіце, Асоту прыйдзе канец.
ХЛОПЧЫК. Здорава ж ён цябе абдурыў! І як толькі твая рука… лапа паднялася?!

*Зверху чуваць голас Купалкі.*

КУПАЛКА *(кліча).* Андрэйка! Дзе ты, Андрэйка?
ХЛОПЧЫК. Мяне Купалка шукае!
КРОТ. І дарма. Сама пападзецца.
КУПАЛКА. Адгукніся, Андрэйка!.. Ау-у-у…
ХЛОПЧЫК *(крычыць).* Я тут, Купалка! Я пад зямлёй!

*Раптам Купалка ўскрыкнула. Раздаецца зларадны голас Асота.*

АСОТ. Ш-што, папалася, даражэнькая… Будзеш ведаць цяпер, дзе ракі зімуюць. Эй, с-слуга!

**Карціна 7**

*Падзямелле. Хлопчык развязвае рукі Купалцы.*

КУПАЛКА. Што ён зробіць з намі, Андрэйка?
ХЛОПЧЫК. Не бойся, мы выберамся адсюль.
КУПАЛКА. А калі не выберамся?
ХЛОПЧЫК. Мая бабуля памрэ з гора.
КУПАЛКА. А Хохлік кінецца мне на выручку і…

ХОХЛІК *(як звычайна)*. Я тут.
КУПАЛКА, ХЛОПЧЫК *(разам)*. Хохлік! *(Абдымаюцца.)*
ХОХЛІК *(Купалцы, строга)*. Ты зноў не паслухалася?
ХЛОПЧЫК. Але як ты сюды трапіў?
ХОХЛІК. Мне паказаў дарогу крот, ён болей не слуга Асоту. А яшчэ я меў гутарку з Ветрам Буранавічам, і ён сказаў мне… *(Урачыста.)* Ён сказаў, што мы можам вырасціць новую кветку!
КУПАЛКА. Як — новую?
ХЛОПЧЫК. Да поўначы?
ХОХЛІК. Калі мы пальём папараць жывой вадой, то яна зацвіце зноў!
КУПАЛКА. Гэта немагчыма! Крыніца з жывой вадой даўно захоплена Асотам, і яе вартуюць вялізныя вусені!
ХОХЛІК. Усё так. Але мы…
КУПАЛКА. Цішэй, хтосьці ідзе.

*Убягае задыханы Крот.*

КРОТ. Хутчэй бяжыце адсюль! Асот точыць свае калючкі!
ГОЛАС АСОТА. Ну, падрамаў — і досыць. Эй, с-слуга! *(Паўза.)* І дзе яго носіць? Так, спачатку распраўлюся з сябрамі-таварышамі. Эй, жаўтароцік, ты мяне чуеш?
ХОХЛІК. Уцякайце, я затрымаю яго*! (Голосам Хлопчыка.)* Чую, чую.

*Купалка і Хлопчык уцякаюць.*

АСОТ. Дрыж-жыш?
ХОХЛІК. Дрыжу.
АСОТ. Дык хто тут самы дужы?
ХОХЛІК. Ты, Асот.
АСОТ. А самы галоўны?
ХОХЛІК. Таксама ты.
АСОТ. То-та! Эй, вусені! Падаць яго мне!

*На Хохліка накідваюцца два вусені і валакуць яго за сабой.*

## Карціна 8

*Ля крыніцы-зруба з жывой вадой поўзаюць па кругу два вялізныя вусені. У бліжэйшых дрэў аб'едзены галіны.*
ВУСЕНЬ. Есці ахвота.

ВУСЕНЬ. Ага.
ВУСЕНЬ. Лісціка б смачненькага...
ВУСЕНЬ *(аблізваецца).* Ага.

*З'яўляецца Крот.*

КРОТ. Як служба ідзе вартаўнічая?
ВУСЕНЬ. Дзень доўгі нейкі... Нескончоны.
ВУСЕНЬ. Ага, абед даўно быў і вячэра не скора.
КРОТ. Я тут непадалёку адзін кусцік нагледзеў — смаката. Магу паказаць.
ВУСЕНЬ. Служба не дазваляе.
КРОТ. Ну, як хочаце. Калі вам не трэба, то я і сам магу паласавацца.
ВУСЕНЬ. Перакусім, а?
ВУСЕНЬ. Гаспадар дазнаецца...
КРОТ. Зроду ні на кога не даносіў. Клянуся, браткі! *(Стукае сябе ў грудзі.)*
ВУСЕНЬ. Іншыя могуць згледзець...
КРОТ. А вы па-адным.
ВУСЕНЬ *(падумаўшы, другому).* Паўзі, толькі хуценька. Дзесяць ног тут, дзесяць — там. І мне пакінь!
ВУСЕНЬ. Куды паўзці?
КРОТ *(паказвае).* Ву-унь туды. Перш прама, потым за рабіну налева, а там усяго з паўкіламетра ў бок гары.

*2-гі Вусень папоўз, 1-шы аблізваецца, праводзячы яго позіркам.*

КРОТ. Добра, кажаш, служыцца?
1-шы ВУСЕНЬ. Хаця б усё не злопаў...
КРОТ. А я стаміўся. Папрашуся хутка ў адстаўку.
1-шы ВУСЕНЬ. А што там за кусцік?
КРОТ. Кусцік як кусцік. З таго боку яшчэ смачнейшы ёсць. З кветачкамі.
1-шы ВУСЕНЬ. Гаспадар дазнаецца. Крыніца, каб ты ведаў, — аб'ект нумар адзін.
КРОТ. Так і быць, павартую твой аб'ект. Чаго не зробіш дзеля добрага чала... вусеня, значыцца.
1-шы ВУСЕНЬ *(уздыхаючы).* Не, не магу.
КРОТ. Ты мо не давяраеш мне? Мне, вернаму слузе Асота? Правай руцэ, можна сказаць!

1-шы ВУСЕНЬ. Служба не дазваляе.
КРОТ. Ну, браце, да цябе папугаяў трэба пасылаць — на вучобу. Гаспадар, служба, гаспадар, служба... Быццам яна некаму патрэбна — ваша жывая вада!
1-шы ВУСЕНЬ. Асоту патрэбна.
КРОТ *(убок).* Цьфу, тупіца... *(З-за куста выглядвае Хлопчык, Крот засцерагальна махае лапай. Вусеню.)* Паўзі ды еш на здароўе.
1-шы ВУСЕНЬ. Добранька, вартуй. Ды глядзі, шэфу не прагаварыся! *(Папоўз.)*

*Выбягаюць Купалка і Хлопчык, што хаваліся непадалёку.*

ХЛОПЧЫК. Тут замок.
КРОТ. Збівай, ключы ў Асота. Ён паліваў жывой вадой сваё карэнне.

*Хлопчык збівае каменем замок, і Купалка набірае ваду ў плас-цікавую бутэльку з-пад мінеральнай.*

ХЛОПЧЫК. Дзякуй табе, кроце!
КУПАЛКА. Даруй, я дрэнна пра цябе думала.

*Купалка і Хлопчык пабеглі, памахаўшы Крату на развітанне.*

КРОТ. Ну, цяпер мая чарга.

*Ён нагнуўся над зрубам, але вады зачарпнуць не змог.*

КРОТ. Кароткія лапы! Не дастану!

*Крот нагнуўся яшчэ ніжэй — і боўтнуўся ў ваду. А праз імгненне адтуль вылятае белы голуб і пырхае ў неба.*

ПЕСНЯ КРАТА

Падміргвалі зоркі. Усходы
Смяяліся барвай гарачай.
Сплывалі вясновыя воды —
Ды я іх не бачыў, не бачыў.
Смугою зацягвала далі,
Усмешкі змяняліся плачам.
Пацiху сябры пакідалі,

Ды я іх не бачыў, не бачыў.
Сваёй слепаты невыноснай
Ланцуг я парваў. Як іначай?
Хай чуюць зямля і нябёсы,
Што бачу, нарэшце ўсё бачу!

## Карціна 9

*Змяркаецца. Здалеку даносяцца дзявочыя спевы. На паляне расцвітае кветка-папараць. Над ёю схіліліся Купалка і Хлопчык.*

КУПАЛКА. Зірні, яна расцвітае!
ХЛОПЧЫК. Каб ведаў — узяў бы свой фотаапарат.
КУПАЛКА. Шкада, што яе не бачыць наш мілы Хохлік.

*Ляціць Страказа.*

СТРАКАЗА. Бяжы, Купалка! Асот штосьці задумаў!
ХЛОПЧЫК *(Купалцы).* І я з табой!
КУПАЛКА. Не, заставайся ля кветкі. Яе нельга пакідаць без нагляду.
ХЛОПЧЫК *(услед).* Сцеражыся! *(Прылёг на траву.)* Сёння і праўда самы доўгі дзень. *(Пазяхае.)*

*Непрыкметна для сябе Хлопчык заснуў. Да чароўнай кветкі падкрадваецца Асот, ён перасоўваецца карэннямі, як нагамі. Вось-вось ён дастане кветку і сарве яе.*

АСОТ *(свісцячым шэптам).* Ненавіджу!.. Усіх ненавіджу... І ганарліўку з яе з-зёлкамі, і Х-хохліка, і гэту нікчомную папараць, і гэтага ж-жаўтароціка... Бач, разлёгся на шляху...

*Трывожна зазванілі званочкі. Хлопчык прачнуўся і кінуўся на Асота. Усчалася бойка. У нейкі момант здаецца, што Асот адужае, але тут на дапамогу Хлопчыку прыйшоў Вецер. Ён падняў ускудлачанага, патрапанага ворага і панёс.*
*Прыбегла Купалка, абдымае Хлопчыка.*

КУПАЛКА. Ты перамог яго!
ХЛОПЧЫК. Дзякуй Ветру Буранавічу. *(Прыслухоўваецца.)* А што за песні?

КУПАЛКА. Купальская ноч пачалася. *(Вешае яму на шыю сваю гірлянду.)*

*Ляцяць начныя матылі, несучы нежывога Хохліка. Апусцілі яго на зямлю і паляцелі.*

ХЛОПЧЫК. Бедны Хохлік. Ён выратаваў нам жыццё, а сам...
КУПАЛКА. Ты забыўся пра жывую ваду. *(Пырскае на Хохліка вадой.)*

*Хохлік адкрыў вочы і сеў.*

ХОХЛІК. Я тут.
ХЛОПЧЫК. Ты жывы?
ХОХЛІК. Нашто зоркі — каб мігцелі, нашто вочы — каб глядзелі.
КУПАЛКА. Вітаю цябе, паважаны Хохлік! Як добра, што ты жывы і здаровы!
ХЛОПЧЫК. Бывайце, сябры!
КУПАЛКА. Ты пойдзеш ужо?
ХЛОПЧЫК. Бабуля зачакалася. Але мне вельмі, вельмі не хочацца вас пакідаць. Да сустрэчы!
КУПАЛКА, ХОХЛІК *(разам).* Да сустрэчы наступным летам!

*Купальская песня гучыць мацней. Яна расце, шырыцца, запаўняе сабой залу. Вакол чароўнай кветкі водзяць карагод матылі і стракозы. У карагод уключаюцца акцёры з лялькамі. Бабуля, усміхаючыся, закрывае заслону.*

**Канец**

## ЧАРНАБОГ

Сучасная казка ў дзвюх дзеях

Дзейныя асобы:

МАРА.
МАСТАК.
ЧАРНАБОГ.
КЛЁН.
КРЫНІЦА.
ВЯСКОВЫ БУСЕЛ.
ГАРАДСКІ БУСЕЛ.
ДРУЖОК, сабака-дварняк.
АНЁЛАК.
АХОЎНІК.
БЕЗАБЛІЧНЫЯ.

## ДЗЕЯ 1

### Карціна 1

*Майстэрня. Пачатыя і незавершаныя работы, раскіданыя фарбы, паламаныя рамы — усякая адсутнасць парадку. Мастак на канапе, ён спіць. Яму сніцца Дзяўчына — з доўгімі валасамі, з вянком на галаве. Яна летуценна кружыцца па пакоі.*
*Званок тэлофона. Мастак заварушыўся, дзіўнае відовішча знікае.*

МАСТАК. Алё... Не, вы не туды трапілі. Не туды, кажу!

*Хвіліну раздумвае, потым пачынае штосьці настойліва шукаць: выварочвае шафы, скрыні. Нарэшце з антрэсоляў скідвае рукзак, здзьмухвае пыл.*

МАСТАК. Паеду. Кіну ўсё — і з'еду. Буду хадзіць па вёсках і слухаць старых. Буду піць крынічную ваду. Буду маляваць — палі, рэкі, чаромху... Яна якраз зацвіла. Абавязкова паеду. Заўтра ж.

ДЗЯВОЧЫ ГОЛАС. Ты нікуды, нікуды не паедзеш...
МАСТАК. Хто тут? *(Азіраецца.)*
ГОЛАС. Ты маніш сам сабе.
МАСТАК. Я не прывык размаўляць з невідзімкамі.
ГОЛАС. Я даўно з табою. Хіба не пазнаў?

*Дзяўчына зноў у пакоі — прыгожая і светлая, якой і павінна быць мара. Яна такая ж, як і ў сне, толькі без вянка.*

МАСТАК. Не памятаю... *(Здзіўлена разглядае, нават абыходзіць такое дзіва.)* Не ведаю я цябе!
МАРА. Я — твая мара.
МАСТАК. Мара? Вось ты якая... *(Злёгку кратае яе валасы.)* Дык гэта ты да мяне прыходзіла ў снах?
МАРА. Іначай ты зусім бы пра мяне забыўся.
МАСТАК. Ну, прыйшла, дык сядай. Госцяй будзеш.
МАРА *(агледзеўшыся).* Сесці тут можна толькі на стол.
МАСТАК. Я зараз. *(Вызваляе ад завалу крэсла.)* Не зважай. Ведаеш, стаміўся... Столькі клопатаў.

МАРА. Ведаю. Я ўсё пра цябе ведаю.
МАСТАК. А ў мяне няма сакрэтаў. Чалавек як чалавек. Не без таленту. Праўда, адзінокі. Я аднаго не разумею: а пра што я такое марыў?
МАРА. Ты марыў намаляваць карціну.
МАСТАК. Я іх шмат намаляваў. Вунь колькі! *(Паказвае.)*
МАРА. Я не пра іх. Ты хацеў намаляваць карціну, якая зрабіла б людзей лепшымі. Можа, яна вось тут? *(Паказвае на завешаную работу.)*
МАСТАК. Не чапай! Яна яшчэ не закончана!
МАРА. Яна не пачата. *(Скідвае тканіну, пад ёй — пустое палатно.)*
МАСТАК. Я быў заняты! Я ездзіў у Парыж! У мяне не было ні хвілінкі вольнага часу!
МАРА. Я памятаю цябе малым. Да школы ты гадаваўся ў бабулі, любіў збіраць суніцы і гуляць у кубікі.
МАСТАК. У кубікі?
МАРА. Ну так, у звычайныя кубікі. *(Дастае іх з шуфляды стала, складвае.)* Вось гэта — твой дом. Колькі ў ім паверхаў? Дзевяць. На шостым жывеш ты. Чалавек, які меў мару. І які не пазнаў яе.
МАСТАК *(падключаецца да гульні).* А тут наша вуліца. А там плошча. Каб скласці горад, у нас не хопіць кубікаў.
МАРА. Калі над горадам выпусціць ластаўку, яна ўпадзе нежывой.
МАСТАК. Хіба дзесьці яшчэ захаваліся ластаўкі?
МАРА. Так. І кажаны, і ядловец, і кветка-сон. Ты памятаеш, як выглядае кветка-сон?
МАСТАК. Блакітная, здаецца...
МАРА *(парушыўшы кубікі).* Збірайся. Ты пойдзеш са мною.
МАСТАК. Так вось, адразу? Я так не магу. Тут маё жыццё, мая майстэрня, мае карціны...
МАРА. Тут цесна і душна. Тут памрэ, як тая ластаўка, твая душа. Хадзем!

*Як малога, яна вядзе яго за руку. На момант ён адрываецца, але толькі для таго, каб узяць рукзак і падрамнік.*

**Карціна 2**

*Мы пераносімся ў свет, дзе святло і прастора. Лясная паляна, дзе расце Клён. Крыніца поіць яго з вялікай кварты.*

КЛЁН. Як пап'ю тваёй вады, дык адразу і падужэю. Дзякуй, крыніца-сястрыца.
КРЫНІЦА. Штосьці бусел даўно не прыходзіў.
КЛЁН. Даўно.
КРЫНІЦА. І Мара кудысьці прапала.
КЛЁН. Ты ж ведаеш нашу пястуху-Мару. Яна не можа на адным месцы. Як і ты.
КРЫНІЦА. На адным месцы нават валун мохам абрастае. Не крыўдуй, клён, я не пра цябе. Твае лісты далёка паляцяць, як восень настане.
КЛЁН. Не трэба мяне суцяшаць. Раскажы лепей, дзе была, што чула...
КРЫНІЦА. Кажуць, што раку нашу выпрамляць збіраюцца.
КЛЁН. Як тэта?
КРЫНІЦА. А так. Выпрастаюць рэчку — і да мяне дабяруцца. Мне і сон благі нядаўна сніўся. Слухай. *(Прысела на пянёк.)* Снілася мне, што паўзе з-за небакраю вялізная чорная хмара. Напаўзла, насунулася, закрыла сабою ўсё неба. А потым...
КЛЁН. А потым, мабыць, дождж лінуў. Што ж тут нядобрага?
КРЫНІЦА. Ага, дождж-та лінуў, ды кроплі чорныя-чорныя. Як з дзёгцю. І дзе кропля ўпала, там і трава пажухла, і кветка асыпалася, і колас зярняты пагубляў... Злавесны сон.
КЛЁН. Людзі кажуць — куды ноч, туды і сон. Не думай пра яго.
КРЫНІЦА. Добра. А зараз пабягу, я яшчэ кароў не даіла. *(Пайшла.)*

*Крочыць Вясковы бусел з лічыльнікамі. Ён у ботах, у ватоўцы, з торбай цераз плячо.*

ВЯСКОВЫ БУСЕЛ. 31, 24, 17, 6... Колькі будзе? Збіўся.
КЛЁН. Дзень добры, бусел!
ВЯСКОВЫ БУСЕЛ. Ат, які ён добры...
КЛЁН. Працаўнік ты ў нас. Усё лічыш ды лічыш, носіш ды носіш дзетак вяскоўцам...
ВЯСКОВЫ БУСЕЛ. Трэба шукаць іншую работу.
КЛЁН. А хто замест цябе?
ВЯСКОВЫ БУСЕЛ. А гэта іхні клопат. Хай ім дзяцей вароны носяць. Вунь іх колькі... Або сарокі — на хвасце.
КЛЁН. Дарма ты, птушка, на людзей злуешся.
ВЯСКОВЫ БУСЕЛ. Усе балоты асушылі, мне ні лужыны не пакінулі. Жабы і той днём з агнём не адшукаеш. Пра сябе толькі думаюць, каб ім было што есці. А я што — нежывы? Мне хіба харчавацца не трэба?
КЛЁН. Мо калі і людзі паразумнеюць.

ВЯСКОВЫ БУСЕЛ. Калі тое будзе!.. *(Махмуў крылом.)* Ад галадухі і збіваюся, дзяцей падлічыць не магу. Значыцца, так: пазалетась — семнаццаць, летась — шасцёра, а сёлета, толькі адно нарадзілася.
КЛЁН. Ты выпадкам Мару не сустракаў?
ВЯСКОВЫ БУСЕЛ. У горад падалася.
КЛЁН. У горад?! Дубца просіць дзеўка.
ВЯСКОВЫ БУСЕЛ. Ты ёй не бацька і не пастух. І яна вам не нянька.
КЛЁН. Што ты разумееш! Без яе мы б тут даўно загінулі.
ВЯСКОВЫ БУСЕЛ. Дык яна і людзям патрэбна — каб на зоркі часцей пазіралі, каб пра высокае думалі. Ну, забалабоніўся тут з табою... Бывай.

**Карціна 3**

*На лугавой сцежцы сышліся два буслы-сябрукі. Гарадскі нашмат імпазантней — у касцюмнай пары, пры гальштуку, з прыкметным жывоцікам. У руцэ — салідны саквояж.*
*Паціснулі адзін аднаму рукі.*

ГАРАДСКІ БУСЕЛ *(выціраецца насоўкай).* Цёпла, як летам, а яшчэ ж і май не пачаўся.
ВЯСКОВЫ БУСЕЛ. Старыя кажуць — лета выдасца засушлівае.
ГАРАДСКІ БУСЕЛ. Мне-то што? Вады ў горадзе хапае. Праўда, хлоркай пахне, ды я прывык. І корму — во *(паказвае на горла).*
ВЯСКОВЫ БУСЕЛ. Як ты яго знаходзіш?
ГАРАДСКІ БУСЕЛ. Маладажоны падкідваюць. Думаеш, я ім за так малых прыношу? За так у горадзе ўжо даўно нічога не робяць. Во, зірні. *(Адчыняе саквояж.)* Поўненькі.
ВЯСКОВЫ БУСЕЛ. Навошта табе столькі?
ГАРАДСКІ БУСЕЛ. Дык я непадалёку дачу будую. На вашай ежы тут капыты адкінеш. Перакусім?

*Размяшчаюцца на траве. Адзін дастае палку каўбасы, другі — сушаную плотачку.*

ГАРАДСКІ БУСЕЛ. Таксама падарылі?
ВЯСКОВЫ БУСЕЛ. Сам летась злавіў. Мае НЗ, можна сказаць.
ГАРАДСКІ БУСЕЛ. Табе, братка, не пазайздросціш...
ВЯСКОВЫ БУСЕЛ. А каму тут дзяцей насіць? Моладзі няшмат, ды і тая распілася. Учора да адных у акно стукаў-стукаў — не зважаюць.

ГАРАДСКІ БУСЕЛ. А што робяць?
ВЯСКОВЫ БУСЕЛ. Быццам сам не ведаеш: тэлевізар глядзяць!
ГАРАДСКІ БУСЕЛ. І нашых не адцягнуць. Дык я тады лячу на дах і антэну калыхаю. Каб памехі, значыцца, былі.
ВЯСКОВЫ БУСЕЛ. Хітры ты!
ГАРАДСКІ БУСЕЛ. А аднойчы...

*Яго перабіў сабачы брэх. Бяжыць Дружок, прынюхваецца.*

ДРУЖОК. Ці мне здаецца, ці зямля гудзе.
ГАРАДСКІ БУСЕЛ. Па-першае, вітацца трэба. А па-другое, мірсціцца табе нешта, псіна. Ніякага гулу не чуваць.
ДРУЖОК. Даўно я табе хвост не караціў, задавака! *(Спрабуе ўхапіць яго за хвост.)*
ГАРАДСКІ БУСЕЛ *(адбягае).* Асцярожней, дзеравеншчына!
ВЯСКОВЫ БУСЕЛ. Калі гутараць два паважаныя буслы, то сабаку лепей бегчы міма.
ДРУЖОК *(зноў прынюхваецца).* А па-мойму, гудзе. І мурашкі з мурашнікаў павылазілі.
ГАРАДСКІ БУСЕЛ. На сонцы грэюцца, балбес!

*Дружок зноў ашчэрыўся.*

ВЯСКОВЫ БУСЕЛ. Табе што сказалі? Тупай міма.

ДРУЖОК. Ну, не пападайся мне на вузкай сцежцы... *(Пабег.)*
ГАРАДСКІ БУСЕЛ *(пазірае на гадзіннік).* Пара, аднак... Між іншым, японскі. І мікракалькулятар у мяне ёсць. Во! Мне нават зялёненькія, калі хочаш ведаць, даюць. Ты бачыў хоць адну зялёную?
ВЯСКОВЫ БУСЕЛ. Не.
ГАРАДСКІ БУСЕЛ. Во яны якія! *(Хваліцца.)* Пайду, мабыць... Графік ёсць графік. Ну, бывай здаровы і не вешай дзюбу. *(Пайшоў.)*

Вясковы бусел дастаў з торбы лічыльнікі, крытычна агледзеў іх, а потым шпурнуў у куст.

## Карціна 4

*Знаёмая нам паляна. Клён сумуе ў адзіноце.*

КЛЁН. Хоць бы птушка якая прыляцела... Хоць бы дварняк праведаў. Няма горш, як на адным месцы. Жукі поўзаюць, воблакі снуюць, птушкі некуды спяшаюцца... Эх, жытка мая раслінная... Што гэта? *(Прыслухаўся.)* Як бы гул нейкі? Ці здалося?

*Лёгка ступае Мара, а за ёй валачэцца стомлены, без настрою Мастак.*

МАСТАК. Не сядзіцца ў хаце хлопчыку малому...
МАРА. Паглядзі, якое хараство!
МАСТАК. Хараство будзе, калі прыйдзем і адпачнём.
МАРА. Дык мы прыйшлі ўжо.
МАСТАК. Не веру свайму шчасцю. *(Скідае з плячэй груз.)*

*З палёгкай садзіцца на пень, скідае красоўкі і вытрасае пясок. Для пэўнасці пагрукаў аб ствол Клёна.*

КЛЁН. Эй ты...
МАРА. Знаёмцеся.
МАСТАК. З кім? З ім? *(Вешае красоўкі на сук.)* Няхай прасохнуць.
КЛЁН *(Мары).* Навошта ты яго сюды прывяла?
МАРА. Не сярдуй. Я ўпэўнена — вы пасябруеце.
КЛЁН. З кім? З ім? *(Закідвае абутак далёка-далёка.)*
МАСТАК. У вас тут усе з характарам?

*Чуецца брэх, красоўкі прыносіць Дружок. Кладзе іх перад Мастаком, лашчыцца да дзяўчыны.*

МАРА. А гэта яшчэ адзін мой сябра. Яго так і завуць — Дружок.
МАСТАК. І якой жа мы пароды?
ДРУЖОК. Тутэйшай.
МАСТАК. Вось і я з тутэйшых. Будзем знаёмы.
МАРА. Дружок, ты зноў пакінуў статак?
ДРУЖОК. Я ненадоўга. Піць хачу.
МАРА. Не любіш ты сваёй работы.
ДРУЖОК. Наадварот, гэта работа мяне не любіць. Забадаць хоча.
МАРА *(смяецца).* Ты пра кароў?
ДРУЖОК. Ну. Я іх то ад жыта адганяю, то ад лесу заварочваю...
КЛЁН. Каровы як людзі — не разумеюць дабра.

*З'яўляецца Крыніца з квартай. Дварняк радасна гаўкае.*

КРЫНІЦА. Дзень добры, каго не бачыла.
МАРА. Падмацуй, калі ласка, нашага госця.
КРЫНІЦА *(працягвае конаўку Мастаку).* Мая вада — незвычайная. Хто яе пакаштуе, усё бачыць па-іншаму.

*Мастак п'е, потым задуменна выцірае вусны.*

ГОЛАС ХЛОПЧЫКА. Бабуля, а чаму рэкі маюць назвы, а крыніцы — не?
ГОЛАС БАБУЛІ. Значыць, так трэба, унучак.
МАСТАК. Знаёмая нейкая мясціна. Мне нават здаецца, што я тут некалі быў.
КЛЁН. З памяццю ў людзей таксама не ўсё ў парадку.
МАСТАК. І што табе кепскае людзі зрабілі?
КЛЁН. Не мне, майму сябру. *(Паказвае на пень.)* Во што ад яго засталося.
МАРА *(Мастаку).* Гэты клён — твой равеснік. Калі ты вучыўся хадзіць, ён быў во такусенькі.

*Даносіцца ледзь чутны глухі гул.*

КЛЁН. Ты што-небудзь чуеш, Дружок?

*Дварняк прынюхваецца.*

КЛЁН. Нешта гудзе. Каранямі чую. Як быццам непадалёку вулкан прачынаецца.
КРЫНІЦА. Пра вулканы не памятае нават валун, а яму мо тысяча гадоў.
КЛЁН. І вулканаў нямашака, і землятрусаў не было... Тады што гэта?
ДРУЖОК. Пап'ю — і пабягу даведаюся. *(Папіў з конаўкі і знікае.)*
КРЫНІЦА. Ой, нездарма мне сон нядобры сніўся...

*Вяртаецца задыханы Дружок.*

ДРУЖОК. На ўзлесак! Збірайцеся! Як сонца зойдзе!
МАРА. Даўно ён нас не збіраў...
МАСТАК. Хто?

МАРА. Пабачыш...
КРЫНІЦА *(Клёну).* Усё табе раскажу, слова ў слова!

**Карціна 5**

*На ўзлеску ля вялікага валуна — Мара і Мастак. Астатніх мы не бачым, толькі чуем трывожныя галасы птушак і звяроў.*
*Змяркаецца. На небасхіле — злавесныя барвовыя палосы.*

МАРА. Гэта мясціна асаблівая. Тут калісьці людзі маліліся старажытным багам, а цяпер, як пашанцуе, можна сустрэць лесавіка.
МАСТАК *(шэптам).* Каго-каго?
МАРА. Трымаецца яшчэ неяк, трывае...
МАСТАК. Ты сапраўды бачыла лесавіка?
МАРА. Я ўсіх бачыла. І русалак з вадзянікам, і Жыжаля, і Зюзю.
МАСТАК. Мяне Зюзяй бабуля страшыла, узімку. Я і не ведаў, што так завецца бог.

*Бліскавіца, першыя раскаты грому.*

МАРА. Зараз з'явіцца...
МАСТАК. Хто?
МАРА. Ён!

*Маланкі ўсё часцей паласуюць неба, гром узмацняецца. І раптам нібы віхор пранёсся над усім: закрычала птаства, забрахалі сабакі, завыў воўк.*

МАРА. Ён прыходзіць толькі перад бядой. Папярэджвае ўсё жывое.
МАСТАК. І людзей таксама?
МАРА. Людзі даўно нікому не вераць — ні старым багам, ні новым. *(Паўза.)* Глядзі! Вось ён — Пярун!

*У святле бліскавіц мы бачым сілуэт барадатага старога асілка. Ён кудысьці паказвае рукой. Толькі міг мы бачым гэта відовішча, потым грымоты аціхаюць, хмары разыходзяцца, усё змаўкае.*
*Прыбег Дружок, ён жаласна скуголіць.*

МАРА (гладзіць яго). Ну, супакойся. Гэта ж не вайна. Людзі кажуць, што самае страшнае — гэта калі вайна. *(Мастаку.)* Не ў пару я цябе

сюды паклікала. Пераначуеш у вёсцы — Дружок завядзе — і вернешся дамоў. За ноч мы паспрабуем папярэдзіць людзей.
МАСТАК. Якая веліч!.. Якая сіла! *(Мары.)* Дай я цябе пацалую. *(Дружок завурчаў.)*
МАРА. Чаму ты радуешся?
МАСТАК. Як ты не разумееш? Такога ніхто ніколі не бачыў, толькі мне пашчасціла! Я намалюю яго! Такая ўдача!.. Уяўляеш — вялікая выстава, а на самым відным месцы, у цэнтры — мая карціна. Сполахі маланкі, цемра — і ён, Пярун... *(Захоплена абхапіў дзяўчыну і падняў угару.)*

## Карціна 6

*На паляне сабраліся амаль усе нашы знаёмыя. Мара праводзіць сход.*

ДРУЖОК. Я брахаў каля кожнай хаты, але мяне праганялі. Адна бабуля ледзьве качаргой не заехала.
ВЯСКОВЫ БУСЕЛ. Я стукаў дзюбаю ў шыбы і тройчы абляцеў бліжэйшыя вёскі. Нуль увагі.
КЛЁН. Я размаўляў з птушкамі.
МАРА. І што?
КЛЁН. Яны сказалі, што тут іхнія гнёзды і яны нікуды не паляцяць.
ДРУЖОК. Звяры таксама застануцца.
МАРА. Я так і думала. Ніхто не скранецца з месца.

*З'яўляецца Мастак з падрамнікам.*

МАРА. Ты чаму не паехаў?
МАСТАК. А чаго мне ехаць? Я на пленэры. І прытым ніхто не ў курсе, што за бяда такая насоўваецца. *(Рыхтуецца да малявання.)*
МАРА. Пярун дарма пужаць не будзе.
МАСТАК. Дык ён не сказаў, калі тое здарыцца. Мо праз месяц, мо праз год...
КЛЁН. Сёння тое будзе. Каранямі чую.

*Прыбегла, задыхаўшыся, Крыніца.*

КРЫНІЦА. З вамі хачу быць! Разам! Разам жылі — разам памром.
МАРА *(закрыла твар рукамі).* Што з намі ўсімі будзе? Хто за нас заступіцца?

МАСТАК. Я і заступлюся. Мужык я ці не мужык? Для чаго я ў войску служыў?
ДРУЖОК. Я з табой, камандзір! Гаў!
КЛЁН. Зброю дапамагу хаваць.
ВЯСКОВЫ БУСЕЛ. Сувязным буду.
КРЫНІЦА. Магу раны прамываць, забінтоўваць...
МАРА. Родныя вы мае... Любыя... Дзякуй вам, што вы ёсць на белым свеце. Дзякуй, чалавек. Хай збудзецца твая запаветная мара. Дзякуй, дрэва! Сто год табе расці і моцы набірацца. Дзякуй, птушка...
ДРУЖОК. Ты так гаворыш, як быццам развітваешся з намі.
КРЫНІЦА. Бяда звычайна адна не прыходзіць.
КЛЁН. Цішэй! Вы чуеце?

*Непадалёку адбываецца нараджэнне страшнага. Выбух, зарыва, выццё сірэны, устрывожаныя людскія галасы.*
*Хадзіце сюды, я закрыю вас галінамі!*
*Усе збіраюцца вакол Клёна.*
*Нарэшце ўсё навокал сціхае, толькі злавеснае мёртвае святло працінае прастору. Потым пачынае марудна насоўвацца хмара.*

КРЫНІЦА. Вось яна — тая хмара, што мне снілася! *(Кідаецца на калені і моліцца — як заклінае.)* Сілы нябесныя і сілы зямныя! Спыніце чарнату-бяду, звяжыце ёй рукі-ногі, не дайце ёй атруціць нашы далі і рэкі. Даруйце грахі людскія. Змілуйцеся над намі...

## ДЗЕЯ 2

### Карціна 7

*Групка істот згрудзілася, калоціцца ад страху. Гэта і ёсць Безаблічныя, замест твараў у іх аднолькавыя невыразныя маскі. Імі кіруе такая самая істота, толькі маска ў яе анёлава, а па баках прышпілены крыльцы.*

АНЁЛАК. Ну, чаго калоціцеся! Ідзіце да яго! Адужайце! Скруціце!
ГАЛАСЫ. Не можам! Ён дужэйшы!..
АНЁЛАК. Затое ён — адзін, а вас — многа.
ГАЛАСЫ. Страшна... Боязна... Загінем...
АНЁЛАК. Вы самі ўзгадавалі яго.
ГОЛАС. Ён быў такі паслухмяны, такі пакорны...

АНЁЛАК. Знаў бы я... Цьфу! Памочнічкі!

*Анёлак адшпіліў белыя крылцы і павесіў на дрэва. Робіць размінку. Безаблічныя паўтараюць — хто як можа, стараюцца дагадзіць.*

АНЁЛАК. Эй вы, нязграбы! Усяму вас трэба вучыць. Паўтарайце за мной, дружна: «Мы — народ, мы — сіла, мы — праўда!»

*Безаблічныя нядружна паўтараюць, але іх хор парушыўся: набліжаецца ён. Гэта штосьці металічнае, нязграбнае, падобнае на робата.*

ЧАРНАБОГ. Добры дзень, шаноўныя!

*Разгубленасць сярод істот, Анёлак паспешна прышпільвае крылцы.*

АНЁЛАК. Дзень добры, калі не жартуеш.
ЧАРНАБОГ. Хіба я падобен на жартаўніка? *(Ушчыкнуў адну з істотаў, спрабуе пляснуць па азадку Анёлка.)*
АНЁЛАК *(ухіліўся).* Ну-ну, ты не вельмі...
ЧАРНАБОГ. Якія мы важныя... Якія ганарлівыя... Які ў нас нявінны тварык...
АНЁЛАК. Прашу без фамільярнасці.
ЧАРНАБОГ *(наўмысна, пісклявым голасам).* Болей не буду, татачка!
АНЁЛАК *(істотам).* Пайшлі адсюль! Каму сказана! *(Тыя знікаюць.)* Што ты вярзеш? Які я табе татачка?
ЧАРНАБОГ. Самы сапраўдны. Родненькі. Ты мяне прыдумаў, ты мяне стварыў.
АНЁЛАК. Я? Цябе?
ЧАРНАБОГ *(пацвельваецца).* Не чакаў, што татка не захоча мяне прызнаць. Сыночка свайго ненагляднага.
АНЁЛАК. Ведай сваё месца, а то...
ЧАРНАБОГ. Што — «а то»? *(Рагоча.)* Ой, як я напалохаўся! Як напужаўся! А давай рукамі падужаемся. Для размінкі проста. Не хочаш?
АНЁЛАК. Ідзі адкуль прыйшоў.
ЧАРНАБОГ. Э не. Я яшчэ твайго тварыка не бачыў.
АНЁЛАК. Я не дзяўчына, каб мной любавацца.
ЧАРНАБОГ *(пагрозліва).* Знімеш маску, а? *(Набліжаецца.)*

АНЁЛАК *(адступаючы, міралюбіва).* Ды не магу. Чаго ты прыстаў? Прырасла яна.
ЧАРНАБОГ. Ладна, хадзі такім, калі падабаецца. Мір заключым. Толькі дапаможаш мне ў адной справе.
АНЁЛАК. Гледзячы ў якой...
ЧАРНАБОГ. Аперацыю адну я задумаў. Важную. Красуню трэба скрасці.
АНЁЛАК. Хм... Мясцовую?
ЧАРНАБОГ. Як табе сказаць... Яна як птушка — то там, то тут. Волю любіць. А завецца — Мара.

*Нясмела набліжаецца Безаблічны.*

БЕЗАБЛІЧНЫ *(Анёлку).* Таварыш начальнік...
АНЁЛАК. Прэч адсюль! *(Той паслухмяна адступае.)* І навошта яна табе, тая Мара?
ЧАРНАБОГ. Мне яна, можа, і без патрэбы. Важна, каб у людзей яе не было. Разумееш? Без яе яны проста статак. Быдла. А людзьмі ж ты любіш кіраваць? Вось і павядзеш куды захочаш. І мне добра, і табе выгада. Лады?
АНЁЛАК. Ну, дапусцім. Але і ў мяне ёсць адна ўмова: мы вызначым тэрыторыю, на якой ты поўны гаспадар, але далей — ні-ні. Ні кроку.
ЧАРНАБОГ. Падумаць трэба... *(Прытворна.)* Эх, была — не была! Давай руку.

*Анёлак перш вагаецца, потым неахвотна яе паціскае. Чарнабог адыходзіць, мурлыкаючы песню.*
*З'яўляецца Безаблічны.*

БЕЗАБЛІЧНЫ. Таварыш начальнік...
АНЁЛАК. Чаго табе?
БЕЗАБЛІЧНЫ. Прасілі перадаць: чужы з'явіўся ў нашым раёне. Прыезджы. Нейкі мастак.
АНЁЛАК. Вядомы?
БЕЗАБЛІЧНЫ. Хто яго ведае...
АНЁЛАК. Што робіць?
БЕЗАБЛІЧНЫ. У вёсцы пасяліўся ды малюе.
АНЁЛАК. І наздароўе.
БЕЗАБЛІЧНЫ. А яшчэ народ заводзіць, радыяцыяй палохае.
АНЁЛАК. Гэта горш. *(Думае.)* Адзін прыехаў?

БЕЗАБЛІЧНЫ. З дзяўчынай яго бачылі. Дзіўная такая... Босая ходзіць. Імя ў яе таксама не як у людзей. Мара, ці што...
АНЁЛАК. Мара? А-а-а, дык гэта ж тая хворая. Малахольная. *(Круціць пальцам ля скроні.)* Пастарайся высачыць і тады кліч мяне. Усёк?

**Карціна 8**

*Безаблічныя паспешна наводзяць межы — адгароджваюць для Чарнабога тэрыторыю. Ён разваліўся ў крэсле, падобным на трон, і цешыцца ўвагаю да сваёй персоны.*

ЧАРНАБОГ. Мітусяцца, стараюцца... Яны думаюць, што я ім скарыўся, што прызнаю іхнія межы і іхнія законы. Дзівакі! Для мяне няма межаў і няма законаў — акрамя ўласных. Маё жаданне — вось мой закон. А мае магчымасці — мае межы. У мяне, калі па праўдзе, бязмежныя магчымасці. Я магу пранікнуць у любы дом, мне і сцены — не перашкода. І старога і малога магу зрабіць калекам. Шкадаваць людзей — гэта такі перажытак. Хто шкадуе людзей, той сам ужо хоць крышку чалавек. А я хіба падобен на чалавека? Гэтыя *(ківае на істот)* хочуць са мной паразумецца. *(Хіхікае.)* Дзівакі, далібог! Са мной, Чарнабогам, толькі смерць знаходзіць агульную мову. Яна ведае, як да мяне падступіцца... Разумная, чарцяка... Не тое, што гэтыя... *(Пацягваецца.)* Нешта вушы пухнуць, даўно не курыў. *(Адмыкае сейф і дастае люльку, істоты насцярожыліся.)* Баяцца. І правільна робяць.

*Чарнабог распальвае люльку, Безаблічныя ў паніцы разбягаюцца.*

**Карціна 9**

*Сялянскі падворак. На заднім плане Мастак штосьць майструе, ён захапіўся сваей справай.*

ГОЛАС ХЛОПЧЫКА. Бабуля, а чаму ты ўвесь час хрысцішся?
ГОЛАС БАБУЛІ. Бо крыжа ўсялякая нечысць баіцца.

*На пярэдяім плане Мара пляце вянок і размаўляе з Дружком. Мастак іх не бачыць.*

ДРУЖОК. Я толькі гляну — адразу бачу, які чалавек перада мною.
МАРА. На лбе не напісана, хто добры, а хто дрэнны.

ДРУЖОК. Яшчэ як напісана! А самыя паскудныя — гэта тыя, што добрымі прыкідваюцца. Ні колі не ведаеш, чаго ад іх чакаць.
МАРА. Устрывожаны людзі. Разгублены. Хто не з'ехаў — малако на вуліцу выліваюць... Атручанае. Расказваюць, пачвара нейкая ў зоне пасялілася. За агароджаю.
ДРУЖОК. Гаў!
МАРА. А яшчэ кажуць, што агароджа гэта ўвесь час пасоўваецца — бліжэй і бліжэй да нас...
ДРУЖОК. Пабягу праверу. Гаў! Мне сем кіламетраў — не круг. *(Пабег.)*

*Дзяўчына прымярае вянок, ціха напявае купальскую песню. Мастак са свайго месца спрабуе падпяваць.*

МАРА. І што ты такое майструеш?
МАСТАК. Пабачыш.
МАРА. А ў мяне вянок не атрымліваецца. У руках кветкі вянуць, галоўкі звесілі... Можа, мне пагадаць на рамонку? Не, не буду. Рамонкі ўсё роўна не скажуць праўды.

*Гул аўтамабіля, грукат дзверцаў.*

МАРА. Госці прыехалі, ці што?

*Ідуць двое Безаблічных. Мара накіроўваецца ім насустрач. Яны нечакана хапаюць яе і цягнуць за сабою. Дзяўчына спрабуе супраціўляцца. На шум выбягае Мастак, бяжыць і сабака.*

ДРУЖОК. Праваронію!
МАСТАК. Разам праваронілі... *(У скрусе кідае долу малаток.)* Бяжы паглядзі, куды паехалі!

*Дружок панёсся. Усхваляваны Мастак мерае прастору крокамі. Ідзе Вясковы бусел з белым скруткам — дзіцем.*

ВЯСКОВЫ БУСЕЛ. У суседняй вёсцы хаты апусцелі, вокны крыж-накрыж пазабіваны. І дзе яны ўсе падзеліся? Куды паз'язджалі? Людзі, дзе вы? Трухлеюць вашы хаты, зараслі вашы падворкі, дзічэюць вашы сады. Адгукніцеся, людзі!

## Карціна 10

*Чарнабог у сваім лежбішчы. За агароджай на варце — Безаблічныя. Двое ўпіхваюць Мару.*

ЧАРНАБОГ. Ну нарэшце!
МАРА. Вось ты які...
ЧАРНАБОГ. Уяўляю, што пра мяне гавораць... Няўжо я на самай справе такі страшны? Што, размаўляць не жадаеш? Разумею. Цябе сілком схапілі, прывалаклі... Бедненькая. Што зробіш, што зробіш... Бывае. У свеце столькі зла. Але са мной ты можаш быць абсалютна спакойнай. Я сам — зло. І стары як свет.
МАРА. Ты не стары. Ты — новенькі.
ЧАРНАБОГ. У нейкім сэнсе — так. Я толькі што нарадзіўся. Яшчэ, можна сказаць, у пялюшках. *(Хіхікае.)*
МАРА. Збіраешся падрасці?
ЧАРНАБОГ. Ёсць у мяне адна невялічкая мара, але пра яе — пасля.

*Ён дастае з сейфа люльку, закурвае. Безаблічныя мітусяцца і нацягваюць процівагазы.*

ЧАРНАБОГ. І так заўсёды. Як толькі закуру — адразу гвалт.
МАРА. Так баяцца?
ЧАРНАБОГ. Мяне не баіцца толькі той, хто не чуў пра мяне. Але такіх усё меней і меней. Пра мяне хутка ведацьме цэлы свет. Па праўдзе сказаць, гэта і ёсць мая мара, мае найвялікшае жаданне. Я б прапанаваў табе служыць мне, але ж ты не пагодзішся.
МАРА. Служаць толькі людзі. Хто чужым, хто ўласным жаданням... Ніжэйшай сваёй прыродзе. А я не здольна. Я ж толькі мара, сон, фантазія... Я ёсць — і мяне няма.
ЧАРНАБОГ. О не! Ты не ведаеш сваёй улады над людзьмі.
МАРА. Уладу любяць тыя *(ківае ў бок істот)*. А мне яна непатрэбна.
ЧАРНАБОГ. Тыя? Яны нікчэмнасці. Яны думаюць, што я буду выконваць іх умову. *(Рашуча паднімаецца.)* Але я — Чарнабог! На калені, няшчасныя!

*Пераможна разрывае агароджу. Безаблічныя ў паніцы разбягаюцца. За трыбуну схаваўся Анёлак — адно крылцы відаць. Мара, непрытомная, ля ног пачвары.*

## Карціна 11

*Палонніца Чарнабога ў адчаі, яе распушчаныя валасы зблытаны... Яна ў клетцы, як звер, і спеў яе падобен на галашэнне. Безаблічны-Ахоўнік праяўляе да яе ўвагу, ходзіць вакол.*

АХОЎНІК. Па-мойму ты не Мара, а Плакса. А што? Няблага гучыць — Плакса Мікалаеўна. Альбо Іванаўна. *(Мара не зважае.)* А ў мяне ёсць нештачка цікавае. *(Падае праз пруты букецік незабудак.)* Вазьмі. Ну, вазьмі, прашу цябе.

*Набліжаецца Вясковы бусел з немаўлём на руках. Безаблічны насцярожыўся, а потым адвярнуўся — быццам не заўважае і нюхае кветкі.*

ВЯСКОВЫ БУСЕЛ *(Мары).* Нашы дзяўчаты такіх песень не пяюць.
МАРА. А-а, гэта ты, птушка...
ВЯСКОВЫ БУСЕЛ. Пад тваю песню нават дзіця спаць не хоча. *(Калыша.)*
МАРА. Ляці адсюль, пакуль цэлы, і дзіцятка ратуй.
ВЯСКОВЫ БУСЕЛ. Апаіў ён цябе нечым, паганы.
МАРА. Што?
ВЯСКОВЫ БУСЕЛ. Сама на сябе не падобна. Крылы апусціла...
МАРА. Ляці, бусел, ляці...
ВЯСКОВЫ БУСЕЛ *(гушкае дзіця).* Не плач, маленькае... Знойдзем табе маму. Во, брат, гісторыя! Хоць ты сам бярыся і гадуй. Ніхто браць не хоча!

*Звініць званочак.*

МАРА. Чарнабог вяртаецца!

*Ахоўнік становіцца на сваё месца, птушка знікае. Чарнабог ужо тут, задаволена паціра рукі.*

ЧАРНАБОГ. Як ніколі ўдалы дзень. Шырацца мае ўладанні, множацца мае слугі. Людзі пакідаюць свае сядзібы, і ўсё застаецца мне. Цяпер я не толькі страшны, але і багаты. Во, гэта для цябе. *(Паказвае каралі.)* На, красуня. Але не... Непрыгожа так...

*Выводзіць дзяўчыну з клеткі і зашпільвае каралі на шыі. Тая рванула нізку, пацеркі пасыпаліся долу.*

ЧАРНАБОГ. Ты што нарабіла? *(Поўзае на каленях, збірае, крэхча.)* І праўда — стары. Гэй, слуга! Люстэрка мне!

*Ахоўнік прыносіць люстэрка, Чарнабог глядзіцца ў яго.*

ЧАРНАБОГ. Старэю. Трачу таварны выгляд. *(Прытворна збедніўся.)* Памру, мабыць, скора. *(Становіцца на калені.)* Палюбі мяне, ластаўка. Ну, не можаш палюбіць, дык хоць пашкадуй. Ты адна ў мяне такая — светлая, чыстая. Надакучылі мне гэтыя шэрыя злыдні. Ды і твае сябры не лепшыя: пакінулі ў бядзе, адцураліся...
МАРА. Не веру я табе, д'ябал.
ЧАРНАБОГ. Што-што? Як ты мяне назвала?
МАРА. Ты д'ябал, а не чорны бог. І справы, і словы твае д'ябальскія. І за якую правіну цябе Ўсявышні наслаў?
ЧАРНАБОГ *(торкае пальцам угару).* Яму відней!.. Зрэшты, не будзем пра сумнае. Давай лепей анёлка паклічам, адзначым сённяшні дзень... Эй, злыдні! Паклічце гаспадара!
АХОЎНІК. Нямашака.
ЧАРНАБОГ. Вось як? А дзе ягамосць знаходзіцца?
АХОЎНІК. На семінар падаўся міжнародны. Ці сімпозіум... Па ліквідацыі наступстваў аварыі.
ЧАРНАБОГ. Няхай сабе ліквідуе... Мы і без яго пагуляем. Праўда?

*Дзяўчына маўчыць.*

ЧАРНАБОГ. Ну, ці прывыкла ты да мяне хоць крышачку?
МАРА. А мы такія... Мы да ўсяго прывыкаем. Нам галоўнае — каб хаця ні з кім не пасварыцца.
ЧАРНАБОГ. От і няпраўда. Са мной, Чарнабогам, ты сварышся пастаянна.

*Мара моўчкі падалася ў сваю турму.*

ЧАРНАБОГ. Ах так? Ну тады будзе сюрпрыз. Ты любіш сюрпрызы, светлая мая?

*Ён пазваніў у званочак. Двое безаблічных вядуць Мастака. Яго рукі за спіной у наручніках. Мара адчайна крычыць.*

МАСТАК *(Мары).* Я паспеў! Я дарабіў крыж!.. Ратуйцеся ім.

*Мастака выштурхоўваюць.*

ЧАРНАБОГ. Ну як сюрпрыз? Удаўся? *(Пайшоў, задаволены.)*

**Карціна 12**

*Паляна. Крыніца ў чорным, скручаная і пастарэлая, утрапёна кружыцца на адным месцы. За ёй з жахам назірае Клён. Ён такі ж скалечаны, не падобны на сябе.*

КРЫНІЦА. Надышла чорная хмара, паліліся чорныя струмені. Чорныя грыбы пашыліся з моху, чорныя кветкі выраслі на магілах.

*Пачынаецца гарачлівы, хваравіты танец. Нарэшце Крыніца, знясіленая, упала долу.*

КРЫНІЦА. Рукі баляць, ногі баляць...
КЛЁН. Уставай, крыніца-сястрыца. Травы засмяглі, дрэвы засмяглі...
КРЫНІЦА. Няможна піць маю ваду.
КЛЁН. А на маіх галінах мала птушак стала.
КРЫНІЦА. Прападзём, згінем нізашто!.. Адны засталіся.
ДРУЖОК *(з-за Клёна).* Гаў!
КЛЁН, КРЫНІЦА *(разам).* Дружок!
ДРУЖОК. Хопіць вам думаць пра свае болькі. Я ўжо тое-сёе зрабіў. Галоўнае — прыручыў ахоўніка.
КЛЁН. Ахоўніка?!
ДРУЖОК. А цяпер слухайце, які ў мяне план: трэба выкрасці ў Чарнабога атрутную люльку.
КЛЁН. Галава мая дубовая! *(Ляпае сябе па галаве.)*
ДРУЖОК. Без люлькі ён нікому не страшны.
КРЫНІЦА. Лёгка сказаць — выкрасці... Быў бы з намі Мастак...

*Крочыць Вясковы бусел з тым самым дзіцем.*

КЛЁН. Здароў, братка!

ВЯСКОВЫ БУСЕЛ. Цішэй, пабудзіш!
ДРУЖОК. Ну, хутчэй... Расказвай... Як яна там?
КРЫНІЦА. Помніць пра нас?
ВЯСКОВЫ БУСЕЛ. Седзіцё тут, лясы точыце... Іншыя даўно б ужо штосьці прыдумалі.
ДРУЖОК. А мы і прыдумалі. Памажы, дружа. Трэба ў Чарнабога атрутную люльку выкрасці.
ВЯСКОВЫ БУСЕЛ. Не магу. Пакуль дзіцятку маці не знайду — я вам не памочнік.
КРЫНІЦА. Мы яго дагледзім — накормім, закалышам...
ВЯСКОВЫ БУСЕЛ. Пакуль дзіця сіратою — не. У вас свае абавязкі, у мяне — свае.

*Брыдзе Гарадскі бусел з клункам. Засопся, цяжка дыхае.*

ГАРАДСКІ БУСЕЛ. Дзень добры панству. *(Пільна ўсіх агледзеў.)* Во якія парабіліся...
ВЯСКОВЫ БУСЕЛ. Мала ж ты пажыў на сваёй дачы.
ГАРАДСКІ БУСЕЛ. Гары яна гарам, тая дача! *(Крыніцы.)* Вадзіцы дай. *(Спахапіўся.)* Э не, страшная ты стала, і вада ў цябе, пэўна, атручаная. Усё ён, Чарнабог... Кара нябесная... *(Узваліў клунак на спіну.)*
ВЯСКОВЫ БУСЕЛ. Пачакай! *(Той спыніўся.)* Вазьмі дзіцятка.
ГАРАДСКІ БУСЕЛ. І так цяжка несці.
ВЯСКОВЫ БУСЕЛ. У горадзе яму рады будуць. Вазьмі, прашу. Жывы буду — аддзячу. Хочаш, усё лета жаб для цябе лавіць буду?
ГАРАДСКІ БУСЕЛ. А нашто мне жабоцькі з зоны? *(Думае.)* А хто ў цябе?
ВЯСКОВЫ БУСЕЛ. Дзяўчынка. Ды такая харошанькая!
ГАРАДСКІ БУСЕЛ. Пакажы. *(Адгінае ражок.)* А здаровая?
ВЯСКОВЫ БУСЕЛ. Дзякаваць Богу, здаровенькая.
ГАРАДСКІ БУСЕЛ. Жаласлівае ў мяне сэрца, сам ведаеш. Давай. *(Асцярожна ўзяў скрутах і пайшоў.)*
ВЯСКОВЫ БУСЕЛ *(сябрам)*. Цяпер я гатовы ісці з вамі.
КЛЁН. Паваражы, крыніца-сястрыца — ці пашчасціць, ці жывыя застанемся.

*Крыніца варожыць на вадзе, тройчы абыходзіць сваю кварту.*

КРЫНІЦА. Жыць будзем, але не ўсе. Аднаму з нас суджана галаву злажыць.
КЛЁН. Калі за волю, то я гатовы...
ВЯСКОВЫ БУСЕЛ. А я яшчэ пажыў бы, а то без мяне вяскоўцы зусім звядуцца.

**Карціна 13**

*Мара ў зняволенні. Вугалем малюе нейкія знакі на падлозе.*
*Ахоўнік прынёс міску з ежай.*

АХОЎНІК. Малюеш усё? Рыскі нейкія, знакі... Маўчыш. За чалавека мяне не лічыш.
МАРА. Хіба ты чалавек?
АХОЎНІК. А як жа. Такі ж, як і ўсе. І сэрца такое самае.
МАРА. У людзей ёсць твары. А што ў цябе?
АХОЎНІК *(мацае)*. І ў мяне твар. Думаеш, я не хацеў яе садраць? Думаеш, мне лёгка быць такім?

*Не дачакаўшыся адказу, пайшоў. Мы бачым яго на пярэднім плане.*
*Крадзецца Дружок.*

АХОЎНІК. Прывёў?
ДРУЖОК. Тут яна, блізка.
АХОЎНІК. Многа бярэ?
ДРУЖОК. Усе з кашальком.
АХОЎНІК. Я сур'ёзна.
ДРУЖОК. А мне перападзе? Як пасрэдніку?

*Звініць званочак.*

АХОЎНІК. Хавайся!

*Дружок хаваецца за клетку Мары.*
*Праходзіць Анёлак з сотавым тэлефонам, на хаду размаўляе.*

АНЁЛАК. Сітуацыя пад кантролем, так. У гэтыя цяжкія для народа часы мы павінны быць разам. Так і запішыце. Што? На першую паласу? Са здымкам? Не, здымка не трэба. *(Знікае.)*
АХОЎНІК *(набліжаецца да Мары)*. Прашу цябе, з'еш хоць крышку.

МАРА. А што ты так за мяне хвалюешся?
АХОЎНІК. Хіба не ясна? Я... Я...
ДРУЖОК. Бліжэй да справы.

*Падае выццём умоўны знак. Тупае сагнутая бабуля з кійком, хустка насунута на вочы. Гэта Крыніца. Мара адразу яе пазнала.*

АХОЎНІК. Страшная нейкая...
ДРУЖОК. Не страшней вашага шэфа.
БАБУЛЯ. Адыдземся... Далей ад чужых вачэй. Што трэба кавалеру? Адсушка? Прысушка?
АХОЎНІК. Якая яшчэ адсушка?!.
БАБУЛЯ. Любоўная, якая... Паваражу, вады вып'еш — і як рукой здыме ўсе твае любошчы. Адзін выпіў, дык цяпер ні на адну дзяўчыну глядзець не можа. Адвярнула.
АХОЎНІК. Не, на такі радыкальны варыянт я не згодны. Ты лепей яе прысушы.
БАБУЛЯ. Дык яна ж не п'е і не есць, вады маёй не возьме.
АХОЎНІК. А ты можаш так наваражыць, каб мая маска адклеілася?
ДРУЖОК. Ха! Без маскі цябе адсюль вытураць.
АХОЎНІК. А я на час здымаць буду. І заплачу нармальна.
БАБУЛЯ. Паспрабую. *(Паставіла конаўку і тройчы абышла кубак.)*
АХОЎНІК. Што, піць ужо можна?
БАБУЛЯ. Ты, хлопча, як той воўк з казкі, што лёгкага хлеба хацеў. *(Шэпча замову.)* Зара-зараніца, чыстая вадзіца...
АХОЎНІК. Так да ночы тут чараваць будзеш.

*Дружок тым часам пабег да дзяўчыны і штосьці ёй шэпча.*

АХОЎНІК. Ну, давай сваё пітво. *(Выпіў з конаўкі і чакае выніку.)* Не дзейнічае... *(Спрабуе садраць маску.)* Махлярка ты, а не варажбітка!
БАБУЛЯ. Падскоч.
*Ахоўнік падскочыў — і маска звалілася. Пад ёй просты кірпаты твар сялянскага сына.*

ДРУЖОК. Здорава!

*Ахоўнік мацае твар, разглядае скінутую маску.*

АХОЎНІК. Вось яно, маё другое аблічча. Маё другое «Я», можна сказаць... І каторае сапраўднае?
ДРУЖОК. Дай паглядзець.

*Бярэ маску, а потым нечакана кідаецці наўцёкі.*

АХОЎНІК *(услед).* Аддай! Кінь жартачкі!
БАБУЛЯ. Вой, вой, нячысцік!..
АХОЎНІК. А вы не згаварыліся, выпадкам? А?
КРЫНІЦА *(знімаючы хусту).* Верне ён табе тваю лічыну, няшчасны, калі паварушышся і дапаможаш нам.
АХОЎНІК. Што трэба зрабіць?
КРЫНІЦА. Перш выпусці Мару. Скажаш — сама збегла. А потым прынясеш нам ключ ад сейфа. Не пабяднее гаспадар, калі трохі грошай не далічыцца.
АХОЎНІК. Мне за ключ галаву знімуць.
КРЫНІЦА. Гэй, Дружок!

*Выглядвае Дружок з маскай.*

КРЫНІЦА. Раздзяры і выкінь!
АХОЎНІК. Не!!!

*Паспешна адкрывае клетку і бяжыць па ключ. Калі ён вяртаецца з ключом, Мара ўжо на волі. Ахоўнік перадае Дружку ключ у абмен на маску, той на момант знікае ў глыбіні памяшкання.*
*Крыніца абдымае Мару, Ахоўнік нацягвае маску. З'яўляецца Дружок з люлькай — і ў той жа момант дарогу яму заступае Чарнабог.*

ЧАРНАБОГ. Ахова!

*Прыбеглі Безаблічныя, але не ўмешваюцца, а толькі мітусяцца.*
*Чарнабог кідаецца на Дружка, але тут падаспеў Вясковы бусел, Крыніца з Марай пад ногі страшыдлу падкацілі калоду, той падае і ўсхопліваецца. Пачалося адчайнае, зацятае змаганне за люльку. Чым яно скончыцца, сказаць цяжка. Чарнабог мёртвай хваткай учапіўся ў Вясковага бусла, і калі ён, здаецца, вось-вось пераможа — да іх, цяжка перасоўваючы ногі-карані, набліжаецца Клён. На шляху пачвары ён ставіць змайстраваны Мастаком крыж.*

## ЭПІЛОГ

*Персанажы выходзяць па адным на прасцэніўм і прамаўляюць у залу.*

МАСТАК. Я ўспомніў гэту паляну! Мы з бабуляй збіралі на ёй суніцы.
КРЫНІЦА. Адна крыніца засохне — дзесяць рэчак абмялее.
КЛЁН. Адно дрэва высечаш — на сто птушак паменее.
ГАРАДСКІ БУСЕЛ *(знімае капялюш)*. Бывай, дружа! Хай будзе пухам табе родная беларуская зямелька!
ДРУЖОК. Хто пераможа, з тым і Божа.
АНЁЛАК. Самае цяжкае — гэта быць самім сабой. *(Адшпільвае крылцы. Безаблічнаму.)* Эй, няздара! Выкінь іх!
БЕЗАБЛІЧНЫ *(спокойна)*. Твае крылцы — ты і выкідвай. *(Здымае маску.)*
МАРА. Даўно пара!

*Падыходзіць да Мастака, прыхінаецца да яго пляча.*

ГОЛАС ХЛОПЧЫКА. Бабуля, а паміраць — страшна?
ГОЛАС БАБУЛІ. Будзем жыць, унучак.

**Канец**

## А ЯК ЖА НЕПАСЕДА?

П'еса для лялек у дзвюх дзеях

Дзейныя асобы:

НЕПАСЕДА, дзяўчынка Света.
ЗАБІЯКА, ён жа ВОЖЫК, хлопчык Андрэй.
ЛЕСАВІК.
БАГНЯНКА.
ПТУШАНЯ.
ВАДЗЯНІЧОК.
ВОЎК.
ПАЛЯЎНІЧЫ.

## ДЗЕЯ 1

### Карціна 1

*За школьнай партай, адсунуўшыся, сядзяць Непаседа і Забіяка. Непаседа ўвесь час круціцца (у такт рытмічнай музыцы): папраўляе бант і спаднічку, закідвае нагу за нагу, працірае вочы, штосьці шукае пад партай. Забіяка зыркае па баках, паказваючы то язык, то кулак.*

ГОЛАС НАСТАЎНІЦЫ. Дзеці! Заўтра мы пойдзем у лес на экскурсію.
ГАЛАСЫ ДЗЯЦЕЙ. Ура! Здорава!
НЕПАСЕДА. На экскурсію! На экскурсію! *(Апладзіруе.)*
ЗАБІЯКА. Навыдумлялі слоў — язык зломіш. Экскурсія, экспазіцыя.
НЕПАСЕДА. Вазьму з сабой скакалку і бутэрброд.
ЗАБІЯКА. Во-во. Бутэрброд, лагапед, галкіпер... *(Тузае суседку за стужку.)*
НЕПАСЕДА *(плаксіва).* Марыя Іванаўна, а ён чэпіцца...
ЗАБІЯКА *(паказвае кулак).* Ну, пачакай! Мала не будзе.
ГОЛАС НАСТАЎНІЦЫ. Прыйдзецца вас рассадзіць па розных партах.
НЕПАСЕДА. А па розных класах — нельга?
ЗАБІЯКА *(летуценна).* І чаму на Месяцы няма школ?..
НЕПАСЕДА *(дражніцца).* Забіяка, Забіяка...
ЗАБІЯКА. Непаседа! *(Пуляе ў яе гумкай. Непаседа прыгнулася і пабіла лоб.)*
НЕПАСЕДА *(плача).* А-а-а!

*Забіяка заціснуў вушы.*

НЕПАСЕДА. Марыя Іванаўна, а ён б'ецца...

*Званок.*
*Шум, дзіцячыя галасы.*

ПЕСНЯ ДЗЯЦЕЙ

У класе ціш, а непаседа
Круць налева, круць направа.
Што ёй сумная асвета?
Нам вучэнне, ёй — забава.
Прыпеў:
Непаседы, забіякі —

Вы ўсім даліся ў знакі.
На лінейцы лаюць клас
Цераз вас, цераз вас!
Са званком бяжым, гуляем.
Перапынак! Адпачынак!
Ваяўніча падступае
Забіяка да дзяўчынак.
Прыпеў:
І настаўніцы, вядома,
Не заўжды бываюць рады.
Ну а дома, ну а дома
Мамы сварацца і таты.
Прыпеў:
Непаседы, забіякі —
Вы ўсім даліся ў знакі.
Ды без вас, ды без вас
Сумаваў бы, пэўна, клас!

## Карціна 2

*Вясновы дзянёк. Лес. Чуваць птушыны шчэбет і дзіцячыя галасы. На дрэве відаць вялікае гняздо.*

ГОЛАС НАСТАЎНІЦЫ. Увага, дзеці! У лесе будзьце асцярожныя. Не адставайце ад класа, а то можна заблудзіцца.

*Непаседа скача цераз вяровачку. Забіяка зламаў галінку і поркае ёй у мурашнік.*

НЕПАСЕДА. Сто адзін, сто два, сто тры...
ЗАБІЯКА *(рагоча).* Вунь як забегалі!..
НЕПАСЕДА. Адчапіся ад мурашак. А каб цябе гэтак поркалі?
ЗАБІЯКА. Я — чалавек, мяне чапаць нельга.
НЕПАСЕДА. А дзе нашы?
ЗАБІЯКА. Там. *(Паказвае.)*
НЕПАСЕДА. Ой, адстану! *(Пабегла.)*

*Забіяка тым часам пакінуў у спакоі мурашак і звярнуў увагу на птушынае гняздо. Вяртаецца Непаседа.*

НЕПАСЕДА. Няма іх там.
ЗАБІЯКА. Глянь, Непаседа, гняздо.
НЕПАСЕДА. Ага. А чыё?
ЗАБІЯКА. Зараз праверым. *(Грукае па дрэве палкай, а потым спрабуе спароць.)*
НЕПАСЕДА. Не чапай! Я Марыі Іванаўне скажу. *(Кліча.)* Марыя Іванаўна!.. Ау-у-у...
ЗАБІЯКА *(злёгку ўстрывожаны).* Відаць, далёка адышліся.
НЕПАСЕДА. Усё з-за тваіх мурашак.

*Забіяка нарэшце спароў гняздо, адтуль вывалілася варанятка і закульгала паміж дрэвамі.*

НЕПАСЕДА. Бедненькае... Яшчэ лятаць не ўмее...
ЗАБІЯКА. Давай дагонім. *(Ганяецца за Птушанём.)*
НЕПАСЕДА. Не дагоніш! Не дагоніш!

*Кульгаючы, ідзе старэнькі барадаты дзядок. Гэта Лесавік.*

ЛЕСАВІК. Кхе-кхе... Што вы тут робіце, дзеці?
ЗАБІЯКА. Бегаем. Хіба не бачыш?
ПТУШАНЯ. Пр-р-рападу! Пр-р-рападу!
ЛЕСАВІК *(Хлопчыку).* І табе яго не шкада?
ЗАБІЯКА. О-го-го! Не ўцячэш! *(Птушаня, уцякаючы, адчайна каркае.)*
НЕПАСЕДА. Дзядуля, ты нашых не сустракаў?
ЛЕСАВІК. Не, унучка.
ЗАБІЯКА. Мы і без іх дарогу знойдзем.
ЛЕСАВІК *(з пагрозай).* Хто знойдзе, а хто і надоўта ў лесе застанецца.
НЕПАСЕДА *(Забіяку).* Перастань, Забіяка. Чуеш?
ЗАБІЯКА. Злавіў!

*Ён сапраўды злавіў Птушаня, але толькі дакрануўся да яго — і адбылося неверагоднае: хлопчык на вачах ператварыўся ў вожыка. Вожык чмыхае і азіраецца. Птушаня схавалася за куст.*

НЕПАСЕДА. Ой, мамачка!
ВОЖЫК. Нешта зямля блізка стала...
НЕПАСЕДА *(Лесавіку).* За што ты яго?
ЛЕСАВІК. Кхе-кхе... Каб мурашкам і птушкам спакайней жылося.
НЕПАСЕДА *(плаксіва).* Яго ж Марыя Іванаўна не пазнае.

ВОЖЫК. Не пазнае — і добра. Вучыцца не трэба будзе.
НЕПАСЕДА. Ты ведаеш... ведаеш, якім ты стаў?
ВОЖЫК *(абмацваецца).* Калючкі. *(Аглядае сябе.)* Прыгажун, нічога не скажаш.
НЕПАСЕДА *(Лесавіку).* Ён што — такім і будзе?
ЛЕСАВІК. Ён такім і быў. Проста вы не заўважалі.
НЕПАСЕДА. Злосны ты, дзядуля.
ПТУШАНЯ *(з-за куста).* Няпр-раўда! Няпр-раўда!
ЛЕСАВІК. Во, чуеш? Я не злосны. Я строгі.
ВОЖЫК. Мог бы прыдумаць іншую кару. А то адразу — вожыкам.
ЛЕСАВІК. У маім лесе свае законы.
НЕПАСЕДА. А, дык ты Лесавік!

*Абыходзіць яго, разглядаючы як дзіва.*

НЕПАСЕДА. Адчаруй яго, дзядуля Лесавік.
ЛЕСАВІК. Кхе-кхе... Час не прыйшоў.
ВОЖЫК. Як гэта не прыйшоў? Начаваць я тут не збіраюся, так і знай.
ЛЕСАВІК. Глядзі, каб зімаваць не давялося! *(Знікае.)*

## Карціна 3

*Адвячорак. Непаседа плача, Вожык тупае вакол яе.*

ВОЖЫК. Не плач, Непаседа.
НЕПАСЕДА. Мне страшна. Цямнее ўжо, а я адна.
ВОЖЫК. Як гэта адна? А я?
НЕПАСЕДА. Быў бы ты хлопчыкам, а так... *(Хліпае.)* Мне цябе шкада.
ВОЖЫК. Яшчэ чаго, шкада!.. Зараз выведу наўзлесак — і пойдзеш дамоў.
НЕПАСЕДА. Не, Забіяка. Аднаго цябе я тут не пакіну. Яшчэ воўк з'есць.
ВОЎК *(выходзячы з-за дрэва).* Хто мяне ўспамінае?
НЕПАСЕДА. Ой! *(Хоча схавацца за Вожыка.)*
ВОЎК. Не бойся, малая. Мне засталося мала жыць, а перад смерцю есці не хочацца.
НЕПАСЕДА. За табой гоняцца?
ВОЎК. Лічы — ужо дагналі.
ВОЖЫК. Хай не маніць. Ён бы ўцякаў.

ВОЎК. А навошта? Я апошні воўк у гэтым лесе. Не сёння, дык заўтра... Якая розніца?
НЕПАСЕДА. Уцякай, дзядзька воўк! Уцякай!

*Воўк нехаця патрусіў далей. З'яўляецца Паляўнічы са стрэльбай.*

ПАЛЯЎНІЧЫ. Зараз, зараз я яго застрэлю. Застрэлю — і атрымаю прэмію. Атрымаю прэмію — куплю новае ружжо. Куплю новае ружжо — заб'ю яшчэ сто ваўкоў. *(Паўза.)* Ух, натаміўся... *(Выцірае пот.)* А ты што ў лесе робіш, дзяўчынка?
НЕПАСЕДА. Я... я ландышы збіраю.
ПАЛЯЎНІЧЫ. Ландышы? Ну, збірай, збірай. А я на ваўка палюю. Зараз, зараз я яго... *(Пабег.)*
НЕПАСЕДА. Цяжка, мусіць, быць апошнім у лесе ваўком.
ВОЖЫК. Усім ты спачуваш, усіх шкадуеш... Дзявочая парода, адным словам.
НЕПАСЕДА. Парода... Парода... Затое пяцёрак у нас намнога болей, чым у вас.
ВОЖЬЖ. Я думаў, ты Непаседа. А ты, аказваецца, яшчэ і Задавака.

*Раздаецца гук стрэлу.*

НЕПАСЕДА. Забіў!
ГОЛАС ПТУШАНЯЦІ. Не патр-рапіў! Не патр-рапіў!

*Тым часам сцямнела. Непаседа калоціцца ад холаду.*

ВОЖЫК. На сыраежачку, з'еш.
НЕПАСЕДА. Сам еш. *(Села пад дрэвам.)* Ух, як холадна... Як у халадзільніку. Вясна называецца...
ВОЖЫК. Слухай, у мяне ж былі з сабой запалкі. Прынясу ламачча — і раскладзём вогнішча. Добра? Чакай, я хутка. *(Знікае ў цемры.)*

*Дзесьці вухкае сыч. Цёмна і страшна. Вожыка ўсё няма і няма.*

НЕПАСЕДА. Сказаў, што хутка, — і не ідзе. *(Кліча.)* Забіяка! Ау-у... Дзе ты, Забіяка?

*Раптам яна заўважыла агеньчыкі. Яны блішчаць, міргаюць, клічуць яе за сабой. Непаседа паднялася і, як зачараваная, пайшла следам за імі.*
*Вяртаецца Вожык з ахапкам ламачча.*

ВОЖЫК. Эй, Непаседа! *(Бурклiва.)* Куды яе панесла? Хвілінкі на месцы не пабудзе. Дзе ты, Непаседа? Ау-у-у!.. *(Адказала толькі рэха.)* Прапала!

*Непаседа ішла, ішла за агеньчыкамі і раптам апамяталася.*

НЕПАСЕДА. Ой, дзе гэта я? Мокра, купіны... Балота быццам.

*Чуецца нечы зларадны смех.*

ГОЛАС. Правільна, унучачка. Балота.
НЕПАСЕДА. Хто ты, невідзімка?
ГОЛАС. Ідзі да мяне, пабачыш...

*Непаседа ступіла крок — і па калена правалілася ў твань. Вылезла і адбеглася.*

НЕПАСЕДА. Э не. Не пайду я далей.

*Багнянка (а гэта быў яе голас) зноў смяецца. Нарэшце яна з'яўляецца — згорбленая, страхалюдная бабуля з кійком.*
*Непаседа міжволі адхіснулася.*

БАГНЯНКА. Не бойся, дурненькая. Прывыкай.
НЕПАСЕДА. Да вас?!
БАГНЯНКА. Да мяне. Унучачкай мне будзеш. Даўно хацела займець унучачку — ладненькую, рухавенькую... Такую, як ты.
НЕПАСЕДА. У мяне ўжо ёсць бабуля. Нават дзве.
БАГНЯНКА. Я згодна быць і трэцяй. *(Хіхікае.)* Будзем у гразьку ныраць, у цёпленькую, жабак слухаць вечарамі, п'явачак лавіць...
НЕПАСЕДА. Сама лаві сваіх п'явачак. Мне ў лес трэба, да Забіякі.
БАГНЯНКА. Нашто табе вожык, унучачка? Няхай сабе тупае, мышэй ловіць.
НЕПАСЕДА. Для каго вожык, а для мяне — аднакласнік.

БАГНЯНКА. На месцы майго брата я ператварыла б яго ў жука. Вунь іх колькі — майскіх жукоў, і ўсе аднолькавыя.
НЕПАСЕДА. Дык, значыць, Лесавік — твой брат?
БАГНЯНКА. Ага, брацік. Малодшанькі. Усім удаўся, але слабахарактарны. Іншая справа — Вадзянік. Таго я і сама баюся.

*Яна паволі падступае да Непаседы і нарэшце цапнула яе за руку.*

НЕПАСЕДА. Пусці! *(Хоча вырвацца.)*
БАГНЯНКА *(угаворвае).* Угаманіся, круцёлка. Ціха ў нас тут, хораша. Ні табе ўрокаў, ні ў магазін хадзіць. Пляменнічак у мяне ёсць — Вадзянічок. Пазнаёмлю. А можа, і замуж аддам за яго.
НЕПАСЕДА. Не хачу замуж! Я яшчэ школу не скончыла! Не хачу ў балоце жыць! Не хачу! *(Вырвалася з чэпкіх рук.)*
БАГНЯНКА *(пачынае злавацъ).* Цішэй ты! Усю жыўнасць распужаеш.
НЕПАСЕДА. І распужаю. Усё тваё балота падніму на ногі. *(Знарок лямантуе.)* А-а-а-а!
БАГНЯНКА *(заціснула вушы).* Сціхні! А не то... Бачыла мой кіёк?
НЕПАСЕДА. І не сціхну! Не замаўчу! Не...

*Багнянка дакранулася кійком да дзяўчынкі, тая адразу стала млявай і пакорнай.*

БАГНЯНКА. Вось і ўсё. *(Уладна.)* Давай руку. *(Непаседа падала.)* Ну што — добра ў балоце?
НЕПАСЕДА. Добра.
БАГНЯНКА. Будзеш маёй унучачкай?
НЕПАСЕДА. Буду.
БАГНЯНКА. Так бы і адразу. Слухай мяне ўважліва. Я — Багнянка, гаспадыня гэтага балота. Усе мяне тут слухаюцца і баяцца. Будзеш жыць у мяне. Хадзем, пакажу табе сцежкі патаемныя... *(Пайшлі.)*

## Карціна 5

*Лес. Вожык разгублена кружыць па паляне. Птушаня сядзіць непадалёку і назірае.*

ПТУШАНЯ. Р-разява, кар-р! Р-разява!
ВОЖЫК. Бач, разгаварылася. Ты лепей скажы, куды яна знікла.
ПТУШАНЯ. Не ведаю. Я др-рамала.

ВОЖЫК. Я шукаў яе цэлую ноч. Як скрозь зямлю праваліласяǃ

*Бяжыць Паляўнічы. Скорагаворкай паўтарае як заведзены адно і тое ж.*

ПАЛЯЎНІЧЫ. Заб'ю ваўка — атрымаю прэмію. Атрымаю прэмію — куплю новае ружжо. Куплю новае ружжо — заб'ю яшчэ сто ваўкоў.
ВОЖЫК *(у залу).* Хацеў бы я ведаць, дзе ён столькі знойдзе.
ПАЛЯЎНІЧЫ. А? Хто тут гаворыць? *(Азіраецца.)* Здалося, мабыць.

*Паляўнічы пабег, за ім па пятах крадзецца Воўк.*

ВОЖЫК. А, стары знаёмы!
ВОЎК. Тс-с!
ВОЖЫК. Аднакласніцу маю не бачыў?
ВОЎК. Што, і вожыкаў ужо вучыць пачалі?
ВОЖЫК. Я пра дзяўчынку пытаюся.
ВОЎК. А-а... Не траплялася.
ВОЖЫК. А як у цябе з апетытам?
ВОЎК. Не бойся, дзяўчынкі я не зачаплю. Бывай! *(Знікае.)*
ВОЖЫК. Народу цэлы лес — і ніхто не бачыў!
ЛІСА *(падыходзячы).* Чаму — ніхто? Я бачыла.
ВОЖЫК. Ты?
ПТУШАНЯ *(уцякае).* Р-рыжая! Р-рыжая!
ЛІСА. Ну так, я. Нейкая дзяўчынка мне сустрэлася на ўзлеску. Шустранькая такая.
ВОЖЫК. Ага.
ЛІСА. З банцікамі.
ВОЖЫК. Ага.
ЛІСА. Дык вось: яна пайшла дадому.
ВОЖЫК *(разгублена).* Дадому? А як жа... як жа я?
ЛІСА. А ты, вожычак, будзеш мне замест пеўня. *(Хапае яго.)*
ВОЖЫК. Ой! Ой! Ратуйце!
ЛІСА. З большага перакушу.
ВОЖЫК. Эй, рыжая, адумайся! Я прыёмы самба знаю!
ЛІСА *(не звяртаючы ўвагі).* Прыкоцімся да рэчачкі. Бухнемся ў вадзічку. У вадзічцы раскруцімся і пакажам голенькі жывоцік. Ружовенькі такі, апетытны...

*На крык Вожыка прыбегла Птушаня.*

ПТУШАНЯ. Паляўнічы са стр-рэльбай! Паляўнічы са стр-рэльбай! Кар-р-р!
ЛІСА. Дзе?
ПТУШАНЯ. Папалася, рыжая! Кар-р-р!

*Ліса кінула Вожыка і — наўцёкі. Вожык сеў, аддыхваецца.*

ПТУШАНЯ. Наманіла я р-рыжай. Р-рыжая дала др-рала!
ВОЖЫК. Бач ты, паснедаць мною захацела! *(Паўза.)* Непаседа ўжо, мусіць, дома. А казала — не пакіну аднаго. Дзявочая парода... адным словам.

*З'яўляецца Лесавік.*

ЛЕСАВІК. Кхе-кхе...
ВОЖЫК. А-а, гэта ты...
ЛЕСАВІК *(Птушаняці).* Вучышся лятаць?
ПТУШАНЯ. Стр-рашна.
ЛЕСАВІК. Вучыся, а не то пападзешся лісе ў зубы.
ВОЖЫК. Бач, добранькі... А мяне табе не шкада?
ЛЕСАВІК. Кхе-кхе...
ВОЖЫК. Ператварай мяне назад.
ЛЕСАВІК. Я б з радасцю... *(Развёў рукамі.)* Не магу!
ВОЖЫК. Што значыць не магу?
ЛЕСАВІК. Патрэбна жывая вада.
ВОЖЫК. Дастань. На тое ты і чараўнік.
ЛЕСАВІК. Раней мог, а цяпер — ніяк. Пасварыўся з родным братам, Вадзяніком. Якраз ён і сцеражэ крынічку. Нізавошта цяпер не дасць. Ні кроплі.
ВОЖЫК. З-за чаго сварка?
ЛЕСАВІК. Сястрычка звяла, Багнянка... Яна ўмее.
ВОЖЫК. Дружная сямейка, нічога не скажаш. *(Паўза.)* Што ж мне цяпер рабіць? *(Думае.)* Я сам пайду к Вадзяніку. Чуеш? Я сам здабуду жывую ваду!
ЛЕСАВІК *(хітранька).* Паспрабуй, паспрабуй...

ПЕСНЯ ЛЕСАВІКА

Я даўно ўжо прывык,
Што і дзед, і лесавік.
Я і юнаю парой

Быў, напэўна, з барадой.
У родным лесе не сумую,
Звера, птушку я ратую,
І таго, хто робіць шкоду,
Я спытаю за прыроду.
У лес заходзьце асцярожна,
Бессардэчным быць няможна.
Кожны жук тут і мураш —
Самы шчыры сябра наш.

## ДЗЕЯ 2

### Карціна 6

*Ля крынічкі, абнесенай плотам і замкнутай на замок, ганарліва праходжваецца Вадзянічок. Ён у сетчатай зялёнай апратцы, з невялічкай каронай на галаве. Да яго набліжаюцца Птушаня і Вожык. Вожык прыціскае да сябе бутэльку з-пад ліманаду.*

ПТУШАНЯ. Кар-р! Кар-р! Пр-рыйшлі!
ВАДЗЯНІЧОК. А гэта што за дэлегацыя?
ПТУШАНЯ. Дзень добр-ры! *(Павітаўшыся, адступае ўбок.)*
ВАДЗЯНІЧОК. Ну, кажы, што трэба.
ВОЖЫК. Трэба жывая вада.
ВАДЗЯНІЧОК. Што-што?
ВОЖЫК *(ужо менш упэўнена).* Вадзічкі, кажу, трэба... Жывой. Трошачкі.
ВАДЗЯНІЧОК *(здзекліва).* Не, вы чулі? Вадзічкі яму жывой, і трошачкі. А сам з вялікай бутэлькай.
ВОЖЫК. Я ж цябе па-добраму прашу. А прашу — значыць, сапраўды трэба.
ВАДЗЯНІЧОК. Давай адсюль. Давай, давай. Ножкамі. Жывая вада — для звяроў параненых і цяжка хворых.
ВОЖЫК. І не звер я зусім. Чалавекам я быў, тваім равеснікам. У школе вучыўся. Кніжкі чытаў. А цяпер — сам бачыш.
ВАДЗЯНІЧОК. А, дзядзькавы штучкі! Як я адразу не здагадаўся!
ВОЖЫК. А ты — сын Вадзяніка?
ВАДЗЯНІЧОК. Ну, сын. Я тут бацьку часам падмяняю.
ВОЖЫК. Дык дасі ці не?

ВАДЗЯНІЧОК. У нашага дзядзькі сем пятніц на тыдні. Сам зачаруе, сам адчароўвае. Але, па-мойму, ён умее гэта рабіць і без жывой вады.
ВОЖЫК. Сказаў — трэба вада, вось я і прашу.
ВАДЗЯНТЧОК *(мнецца).* Не магу я... Бацька ў мяне стары ўжо, нервовы. Як разбушуецца — апошнюю ваду з ракі расплешча. Калі чэсна сказаць — не вельмі ён вас, людзей, любіць.
ВОЖЫК. А чаму?
ВАДЗЯНІЧОК. Чаму, чаму... Бо з-за вас адны рэкі змялелі, а другія такія брудныя, што ў іх жыць немагчыма.
ВОЖЫК. Дык што — быць мне век у калючках? *(Не дачакаўшыся адказу, завярнуўся і пашыбаваў.)*
ВАДЗЯНІЧОК *(услед).* Пастой! *(Вожык спыніўся.)* Так і быць, дам я табе жывой вады. Толькі дай мне слова, што як вырасцеш і вывучышся — сам будзеш сачыць за лясамі і рэкамі. Каб зверу і рыбе было дзе прытуліцца. І каб наш вадзяніковы род не звёўся.
ВОЖЫК. Добра. Абяцаю табе.

*Вадзянічок адамкнуў крынічку і драўляным чарпаком наліў Вожыку крышку вады. Той узяў бутэльку і раптам заўважыў каля зруба знаёмую стужку.*

ВОЖЫК. Чыя гэта? *(Падняў стужку.)*
ВАДЗЯНІЧОК. А-а... Гэта ж цётка мая, Багнянка, прыводзіла сюды нейкую дзяўчынку.
ВОЖЫК. Шустранькую?
ВАДЗЯНІЧОК. Ды не. Сонная, вялая...
ВОЖЫК. Дзіўна. А стужка яе.
ВАДЗЯНІЧОК. Цётка мая, чэсна кажучы, з ведзьмаў ведзьма. Ты лепш ідзі, а то каб зноў сюды не прыкульгала.
ВОЖЫК. Дзякуй табе, сын Вадзяніка! *(Сабе.)* Ну, ліска, пачакай!

*Вожык адыходзіць, Птушаня важна яго суправаджае.*

ПТУШАНЯ (Вадзянічку). Пр-рабач, што патр-рыво-жылі! *(Знікаюць.)*
ВАДЗЯНІЧОК *(зазірае ў крыніцу).* Можа, бацька і не заўважыць.

*Прыбягае задыханая Багнянка.*

БАГНЯНКА. Ты... даў... яму... жывой вады?!
ВАДЗЯНІЧОК. Не-а. Не даваў.

БАГНЯНКА. Я бачыла! Ён нёс!
ВАДЗЯНІЧОК. А вы пры чым, цётухна? Вада не ваша.
БАГНЯНКА (тупае нагамі ад злосці). Хто дазволіў?! Бацьку скажу! Месяц гуляць не пусціць! На падводныя работы адправіць! Хуліган! Бандыт!
ВАДЗЯНІЧОК. Вы — і баіцёся нейкага вожыка?!
БАГНЯНКА. Я лепей ведаю, каго мне баяцца, а каго не.
ВАДЗЯНІЧОК. Эх вы, цётухна... Сядзелі б вы ў сваім балоце ды не рыпаліся. Дык не, швэндаецеся, дзяцей зводзіце...
БАГНЯНКА. Не твая справа!
ВАДЗЯНІЧОК. Адна дзяўчынка ўцякла, дык вы другую заманілі.
БАГНЯНКА. Заманіла, так. Можа, мне адной сумна. Можа, мне любіць некага трэба. І каб мяне любілі.
ВАДЗЯНІЧОК. Уцячэ і гэта.
БАГНЯНКА *(спахапілася)*. Ой, каб і праўда не збегла... *(Знікае.)*

*Зацямненне. Высвечваецца постаць Вожыка.*

ВОЖЫК. Адзін глыток — і я зноў стану чалавекам. І пайду шукаць Непаседу. А ці знайду яе ў балоце? Ці перахітру злую Багнянку? Не, лепей я пабуду вожыкам. А вадзічку прыхаваю. Правільна?

*Балота. Багнянка шэпчацца з Лісою.*

БАГНЯНКА. З вожыкам гаварыла?
ЛІСА. Разыграла як па нотах.
БАГНЯНКА. Паверыў?
ЛІСА. А як жа. Цяпер ён яе шукаць не будзе. Жыві, бабуля, спакойна і мяне ўспамінай.
БАГНЯНКА. Дзякуй табе, Патрыкееўна.
ЛІСА. Як кажуць людзі — дзякуй не масла, на хлеб не намажаш.
БАГНЯНКА. Зараз, зараз... *(Пайшла і вярнулася з кошыкам.)* На.
ЛІСА. І што ў кошыку?
БАГНЯНКА. Што наскрэбла. Пара яечак ды пара костачак.
ЛІСА *(расчаравана)*. І ўсё?.. Я думала — курка...
БАГНЯНКА. Адкуль тут куркам быць? Зусім ты, рыжая, адурэла.
ЛІСА. Няма куркі — давай качку. А то я табе болей не служка.
БАГНЯНКА. Разбой! Сярод белага дня! *(Пайшла і вярнулася з качкай пад пахай.)* Трымай.
ЛІСА. Гэта іншая справа. *(Пайшла, віляючы хвастом.)*

БАГНЯНКА. Не разумею: навошта яму жывая вада? *(Кліча.)* Унучачка!

*Паволі падыходзіць Непаседа. На галаве вяночак з лотацi.*

БАГНЯНКА. Ты жабак паслухала?
НЕПАСЕДА. Паслухала.
БАГНЯНКА. П'явачак палавіла?
НЕПАСЕДА. Палавіла.
БАГНЯНКА. Весела табе?
НЕПАСЕДА *(замагільным голосам).* Вельмі весела.
БАГНЯНКА. І табе нікуды не хочацца?
НЕПАСЕДА. Тут лепей, чым дзе.
БАГНЯНКА. Разумніца мая... Ну, а нырацъ сёння будзеш? У гразьку, у цёпленькую?
НЕПАСЕДА. Боязна.
БАГНЯНКА *(усё больш уладарна).* Добра. Заўтра будзем нырацъ. А сёння зварым варэнне з воўчых ягад. Смаката! *(Паўза.)* Ну, ты пагуляй, а я Вадзяніка праведаю. Родны брат усё-ткі...
НЕПАСЕДА. Бывай.
БАГНЯНКА. Скажы: «Бывай, бабуля».
НЕПАСЕДА. Бывай, бабуля.
БАГНЯНКА. Бабуля! Мяне першы раз назвалі бабуляй!

*Падскакваючы ад радасці, пайшла. Праз хвіліну з'яўляецца Вожык.*

ВОЖЫК. Вось ты дзе! Здароў, Непаседа.
НЕПАСЕДА *(не рэагуе).* А-а, ты...
ВОЖЫК. Што з табой? Ты хворая?
НЕПАСЕДА. Здаровая я.
ВОЖЫК. Ты не пазнала мяне? Я — Забіяка.
НЕПАСЕДА. Забіяка даўно стаў хлопчыкам і пайшоў дамоў.
ВОЖЫК. Табе сказалі няпраўду. Як жа я мог пайсці без цябе?
НЕПАСЕДА. Мне і тут добра. Сыра толькі... І жабы. Але нічога, да жабак я прывыкну.
ВОЖЫК. Што ты вярзеш? Якія жабкі? Дома, нябось, перапалох. Пайшлі, пакуль Багнянка не вярнулася! *(Бярэ яе за руку і цягне за сабой.)*

*Чуваць голас Багнянкі, якая напявае штосьць папулярнае.*

ВОЖЫК. Чуеш, пайшлі! Яна ідзе сюды! Эх, не паспелі... *(Хаваецца.)*

*Лес. Ліса гайдаецца ў гамаку. З'яўляецца Вожык.*

ЛІСА. Дзень добры, вожычак! Чаму такі сумны?
ВОЖЫК. Бо ты вясёлая.
ЛІСА. Ах, я ўсё зразумела! Ты думаеш, што я цябе падманула. Я проста абазналася. Тая дзяўчынка, на ўзлеску, была цёмненькая, а твая светленькая.
ВОЖЫК. А табе адкуль вядома, што светленькая?
ЛІСА. У лесе тайнаў не бывае, мой даражэнькі. Усе пра ўсё ведаюць. Нават пра тое, што Багнянка вучыць Непаседу сваім чарам. Змену рыхтуе.
ВОЖЫК. Не можа быць!
ЛІСА. Сімпатычная будзе ведзьмачка — з коскамі. *(Паўза.)* Ох і смачная папалася качачка, толькі піць ахвота. *(Злезла з гамака і некуды падалася.)*

*Вожык залез на яе месца, гайдаецца і думае ўслых.*

ВОЖЫК. І вожыку ясна: тут без чараў не абышлося. Вось чаму яна сама не свая...
ПТУШАНЯ *(яно, як заўсёды, паблізу).* Сцер-ражыся лісы! Кар-р!
ВОЖЫК. А, гэта ты...
ПТУШАНЯ. Давай пагавор-рым.
ВОЖЫК. Другім разам. *(Пазяхае.)* Я думаю.

*Птушаня не стала перашкаджаць. Вожык сцішыўся і заснуў. Вяртаецца Ліса.*

ЛІСА. Якая мілая карціна! *(У залу.)* Зараз ён у мяне пакруціцца.

*Яна асцярожна развязвае гамак, а потым звязвае канцы.*
*Вожык аказаўся нібы ў авосьцы.*

ЛІСА *(правяраючы вагу авоські).* А на выгляд худзенькі...
ВОЖЫК *(прачнуўся).* Ой, дзе я?
ЛІСА. Не палохайся, даражэнькі. Проста табе сніцца страшны сон.
ВОЖЫК. Ты куды мяне нясеш, ліса?

ЛІСА. У рэчачку. *(Спынілася.)* Не, я перадумала. За такі падарунак я атрымаю ад Багнянкі дзесяць качак. *(Паварочвае ў іншы бок.)*
ВОЖЫК. Стой! Не трэба да Багнянкі! Не трэба!

*Нечакана з'яўляецца Лесавік.*

ЛЕСАВІК *(з пагрозай).* Кінь свае жартачкі, рыжая.

*Ліса, спалохаўшыся, выпусціла з лап Вожыка і збегла. Птушаня, што сядзіць непадалёку, задаволена рагоча.*

ЛЕСАВІК. Дай развяжу. *(Вызваліў Вожыка.)* Усюды ты ўлезеш.
ВОЖЫК. Вочы самі заплюшчыліся...
ЛЕСАВЖ. А дадому табе не пара?
ВОЖЫК. А як жа Непаседа? Што будзе з ёй? Яна нейкая дзіўная стала. Мне і тут, кажа, добра. Не ведаю, што і рабіць.
ЛЕСАВІК. Ёсць выхад, кхе-кхе... Аддай дзяўчынцы жывую ваду — і чары з яе спадуць.
ВОЖЫК. Пачакай, што ж атрымліваецца? Непаседа вып'е жывую ваду, а я...
ЛЕСАВІК. А ты застанешся вожыкам. *(Хітранька.)* Кхе-кхе...
ВОЖЫК. Праклятыя калючкі! Хіба можна з імі змірыцца?!

*Балота. Багнянка праводзіць урок. Непаседа сядзіць на купіне, а для адказу ўстае. Замест дошкі — перавернуты пень.*

БАГНЯНКА. А цяпер мы зоймемся паўтарэннем... Ну, мая разумніца, раскажы, што мы ўжо ўмеем.
НЕПАСЕДА. Мы ўмеем... умеем зачароўваць жаб і змей, насылаць страшныя сны...
БАГНЯНКА *(падказвае).* І засуху.
НЕПАСЕДА. Засуху не праходзілі.
БАГНЯНКА. А-а, склероз... Праўда, не праходзілі. Што яшчэ?
НЕПАСЕДА. Яшчэ... Яшчэ...
БАГНЯНКА. Хопіць. Праверым на практыцы. *(Дастае з кішэні жабку.)*
БАГНЯНКА. Глядзі на яе так, як я вучыла, — і жабка засне.
НЕПАСЕДА. А як ты вучыла?
БАГНЯНКА. Ніякіх здольнасцей да чараўніцтва. Тры з мінусам. Перапынак. *(Пайшла.)*

*Непаседа сядзіць як і сядзела. З-за куста выглядвае Вожык.*

ВОЖЫК. Што ў вас яшчэ?
НЕПАСЕДА. Спевы і фізкультура.
ВОЖЫК. Я буду паблізу. *(Знікае.)*
БАГНЯНКА *(падыходзячы).* Пабегала б, ці што? А то як урасла ў гэту купіну. *(Уздыхае.)* А такая шустранькая была, такая рухавенькая... Ну, давай праспяваем песню, што ты сама склала. І... *(Дырыжыруе сваім кійком.)*

ПЕСНЯ НЕПАСЕДЫ

Можа, сніцца мне сон нехарошы:
У сябры набіваюцца мошкі,
Стала домам гнілая калода,
А кругом, дзе ні глянеш, балота.

БАГНЯНКА. Стой. Стой! Так не пойдзе. Не песня, а нейкае ныццё. Весялей трэба, энергічней! І...
НЕПАСЕДА. Я спяваю — адказвае рэха,
Я смяюся, а мне не да смеху.
Мне так весела — плакаць ахвота,
А кругом, дзе ні глянеш, балота.
БАГНЯНКА. Крыху лепш... І ўсё ж не тое, не тое... І...
НЕПАСЕДА. Так жыву паміж купін і твані.
Сюды шчасця прамень не дастане.
Тут пад кожным кустом адзінота,
А кругом, дзе ні глянеш, балота.
ПТУШАНЯ *(зводдаль).* Бр-рава! Бр-рава!
БАГНЯНКА. А ты тут што згубіла?
ПТУШАНЯ. Я замест інспектар-ра. Кар-р!
БАГНЯНКА. Кыш! *(Махае кійком.)* А цяпер у нас па раскладу фізкультура. Пачалі. Ногі на шырыні плеч, махі рукамі. Раз-два, тры-чатыры...

*Непаседа вяла выконвае практыкаванні. Кіёк Багнянцы замінае, яна паклала яго збоку.*

ПТУШАНЯ. А дзе твая фор-рма? Фізр-рук без фор-рмы! Фізр-рук без фор-рмы!

БАГНЯНКА. Ну не, гэта малая варона галаву адурыць! Кыш, я каму кажу!

*Багнянка пагналася за Птушанём, а Вожык тым часам схапіў кіёк.*

БАГНЯНКА. Аддай мой кіёк! Аддай!
ВОЖЫК. Зараз мы праверым, чаго варты твой кіёк.
БАГНЯНКА. Не, не! Толькі не датыкайся!

*Вожык дакрануўся да старой кійком, і тая адразу сцішылася.*

ВОЖЫК. Так вось будзе лепей.
БАГНЯНКА. Ага, лепей.
ВОЖЫК. Болей ён не будзе рабіць зла. *(Паламаў кіёк.)* А ты?
БАГНЯНКА. І я не буду. *(Хіхікае.)*
ВОЖЫК. Ідзі, бабуля, слухай жабак.
БАГНЯНКА. Ах вы, мае міленькія, мае харошанькія... *(Пайшла.)*
ВОЖЫК *(Непаседзе).* І мы пойдзем.
НЕПАСЕДА. Куды?
ВОЖЫК. Дадому.
НЕПАСЕДА. А навошта?
ВОЖЫК *(уздыхае).* Не, тут без жывой вады не абыдзешся. *(Пайшоў і вяртаецца з бутэолькай.)* На, выпі — і чары з цябе спадуць.
НЕПАСЕДА. А ты?
ВОЖЫК. А я... Што я? Нас у лесе многа, не прападу.

*Яны не бачаць, што за імі цішком назірае Лесавік. Непаседа пакорна выпівае ваду — і адбыўся цуд: вожык зноў становіцца хлопчыкам. У чупрыне яго застаўся лісток.*

ЗАБІЯКА. Ура! Гэта зноў я!
НЕПАСЕДА *(падскоквае).* У цябе лісцік у валасах, лісцік у валасах!

*Бяжыць задыханы Воўк.*

ВОЎК *(на хаду).* Усё... Канцы мне. Загнаў у балота. *(Пабег далей.)*

*Ваўка праследуе Паляўнічы. Раздаецца стрэл.*

НЕПАСЕДА. Не, не, не трэба! *(Заціснула вушы.)*

ПТУШАНЯ. Падстр-рэліў р-рыжую! Падстр-рэліў р-рыжую!

*Ідзе Паляўнічы, перакінуўшы цераз плячо Лісу.*

ПАЛЯЎНІЧЫ. Падстрэліў рыжую — атрымаю прэмію. Атрымаю прэмію — куплю новае ружжо. *(Пауза.)* А можа, не купляць? Мне і старое надакучыла... *(Выкідвае стрэльбу.)*
НЕПАСЕДА. Забіяка, ты што, сапраўды быў вожыкам?
ЗАБІЯКА. Дапусцім, быў. Ну і што?
НЕПАСЕДА. Раскажу ў класе — во смеху будзе!
ЗАБІЯКА. Паспрабуй толькі!
НЕПАСЕДА. Ды не, я жартую. У нас будзе свой сакрэт, добра?

*Чуваць галасы дарослых і дзяцей: «Ау-у-у... Света! Андрэй!»*

ЗАБІЯКА. Нас шукаюць! Хадзем! *(Бярэ Непаседу за руку.)* Чакай, а дзе птушаня?
ПТУШАНЯ *(ляціць).* Я тут! Кар-р-р!
ЗАБІЯКА. Здорава, ты ўжо лятаеш.
ПТУШАНЯ. Р-расту! Р-расту!
ЗАБІЯКА. Што ж, бывай. Мы так і не пагаварылі з табой як след.
НЕПАСЕДА. Бывай! *(У залу.)* Бывайце!
ЛЕСАВІК *(закрывае заслону).* Мая сястра Багнянка заўсёды казала мне, што я вельмі хітры. А вы як думаеце?

**Канец**

## ЗОРНЫ ХЛОПЧЫК

П'еса для тэатра лялек у трох з'явах
(Па казцы Антуана дэ Сент-Экзюпэры)

Дзейныя асобы:

МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ, зорны хлопчык.
РУЖА.
ЛІС.
ЛЁТЧЫК.
ЗМЯЯ.
КАРОЛЬ.
ДЗЕЛАВЫ ЧАЛАВЕК.
П'ЯНІЦА.
ЛІХТАРШЧЫК.
СТРАКАЗА.
ЗОРКА.

## З'ява I

## Планета Маленькага прынца

*На планеце Маленькага прынца нічога лішняга: азярынка ды тры невысокія вулканы. Ля аднаго з іх — лапата, мятла і лейка, ля другога — ляжанка для сну.*
*Гаспадар планеты-малюткі якраз завіхаецца: перш падмёў дол, потым лапатачкай чысціць вулканы.*
*На небасхіле мігціць апошняя начная Зорка.*

ЗОРКА. Гэй, хлопчык! Навошта ты іх чысціш кожны дзень?
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ *(азіраецца, заўважае Зорку).* Гэта ты, зорка?
ЗОРКА. Я, Маленькі прынц.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Днём я пра цябе зусім забываюся, бо цябе не відаць.
ЗОРКА. Адпачні. Хто замнога шчыруе, той не паспявае думаць.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. А навошта мне думаць, калі столькі спраў? *(Выцірае лоб.)* Маё правіла такое: раненька ўстаў, памыўся — і наводзь парадак. Калі я перастану, скажам, чысціць вулканы, яны выйдуць са строю. Дыму тут напусцяць, чаду... *(Штось угледзеў пад нагамі.)* Ах ты, шкоднік! *(Вырывае нейкую расліну.)*
ЗОРКА. І табе не надакучыла з імі змагацца? Такія на выгляд кволыя, бяскрыўдныя парасткі...
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Яны толькі здаюцца бяскрыўднымі і кволымі. А як вырастуць — кожны стане агромністым дрэвам. Баабаб — ён такі тоўсты! А карані ў яго — во такія! *(Паказвае.)* Калі іх не вырываць, яны вырастуць і раздзяруць маю планету на шматкі.
ЗОРКА. Ну, мне час знікаць. Добрага табе дня! *(Растае ў промнях сонца.)*

*Маленькі прынц працягвае сваю справу. Адзін з парасткаў яго зацікавіў.*

МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. А гэта што за кусцік? Здаецца, ён не падобны на баабаб. І бутончык ёсцека. Дзіўна... Што за расліну сюды занесла?

*Ляціць Страказа.*

МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Гэй, страказа! Ляці сюды. *(Страказа кружыць вакол.)* Ты не ведаеш, што гэта за парастак?
СТРАКАЗА. Здалёк не бачу. *(Апускаецца на парастак.)* Штосьь зялёнае. Калючае. Добра пахне.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Калючае? Ну, тады гэта штосці страшнейшае за баабаб.
СТРАКАЗА. Я так не думаю. Баабабы не пахнуць. Павер, я ў гэтым разбіраюся. *(Паляцела.)*
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Вось і думай — вырваць ці пакінуць? Прымаць рашэнні — гэта так адказна. Пачакаю, мабыць, да заўтра. Заўтра і вырашу. *(Пазяхае.)* На маленькай планеце і дзень маленькі.

*Змяркаецца. Хлопчык кладзецца на ляжанку і хутка засынае.*
*Між тым бутон на невядомай расліне пачынае паступова развінацца. Шкада, што ніхто не бачыць такога хараства, бо Зорка яшчэ не ўзышла, а ноч такая цёмная.*
*Калі нарэшце развіднела, мы бачым прыгажуню-Ружу. Яна глядзіцца ў люстра азярынкі і любуецца сабою.*

РУЖА *(пазяхаючы).* Ах, я ледзьве прачнулася... *(Азіраецца, круціць галавой.)* Куды ж я трапіла? А можа, я проста сплю і гэта ўсё мне толькі сніцца?
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ *(прачнуўся).* Хто тут? *(Працёр вочы, угледзеў госцю і войкнуў ад захаплення.)*
РУЖА. Маглі б пажадаць мне добрай раніцы.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Ты... Вы... Вы такая цудоўная!
РУЖА *(какетліва).* Праўда? Але я не паспела ўбрацца. І не прычасаная... *(Прыхарошваецца.)*
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Здаецца, я парушаю свой рэжым.

*Ён ускаквае, робіць практыкаванні і бярэцца за мятлу.*

РУЖА *(кашляе).* Ой, тут столькі пылу! Дыхаць няма чым.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Але я падмятаю кожную раніцу.
РУЖА. Маглі б перш падумаць пра мяне. Паліць, напрыклад.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. З радасцю. Я зараз... *(Зачарпнуў лейкай вады з азярыны і палівае кусцік.)*
РУЖА. Ну вось, пасвяжэла. Ды не стойце ля мяне, як быццамураслі. Займіцеся справамі.

*Хлопчык моўчкі паціснуў плячыма і пачаў чысціць вулканы.*

РУЖА. Між іншым, паблізу вулканаў жыць небяспечна. А вы нават спіцё пад адным з іх.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Дык ён даўно патух.
РУЖА. А чысціць тады навошта?
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. На ўсякі выпадак. А раптам прачнецца?
РУЖА. Вы проста час марнуеце. *(Паўза.)* Халодна тут у вас...

*Імкліва праляцела Страказа, Ружа міжволі прыгнулася ад страху.*

МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Не трэба палохацца. Гэта звычайная страказа. Ёй тут няма чаго рабіць, і яна толькі носіцца туды-сюды. Як верталёт.
РУЖА. І зусім я не баязлівая.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Што вы сказалі? *(Выглядвае на доле баабаб.)*
РУЖА. Ну вось. Мяне зусім тут не хочуць слухаць.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Прабачце, калі ласка.
РУЖА. Я кажу, што зусім не слабая і магу абараняцца. У мяне ёсць ажно чатыры калючкі.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ *(не без іроніі).* Так шмат? Цэлых чатыры калючкі?
РУЖА. Так! І ўсе вострыя! Няхай сабе і тыгры прыходзяць — мне ніколечкі не страшна.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. На маёй планеце не жывуць тыгры. І потым... Тыгры не ядуць траву.
РУЖА. Вы сказалі — траву?! Гэта я — трава?
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. О, даруйце...
РУЖА. Толькі чую — даруйце і даруйце. А ад ветру мяне няма каму засланіць.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Я аддам вам сваю шырмачку. Яна мне зусім непатрэбна. *(Падцягвае бліжэй сваю шырму.)*
РУЖА. Позна. *(Кашляе.)* Я, здаецца, прастудзілася. Няўтульная планета. Адны скразнякі. І не забудзьце на ноч прыкрыць мяне шкляным каўпаком.

*Наступае вечар. Хлопчык прыкрый Ружу і ўкладваецца сам. Але яму не спіцца. Ён сеў, гаворыць сам з сабою.*

МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Кветка, а баіцца звычайнага ветру. Дзе яна жыла раней, такая далікатная?
ЗОРКА. Добры вечар, Маленькі прынц!

МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Добры вечар. *(Зноў сабе.)* І так паводзіць сябе, быццам я ў нечым вінаваты.
ЗОРКА. Рада за цябе. Ты перастаў быць адзінокім.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Так, маё жыццё перамянілася.
ЗОРКА. Спадзяюся, да лепшага?
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Мне цяжка з ёю. Яна такая крыўдлівая... І ўвесь час гаворыць толькі пра сябе.
ЗОРКА. На тое яна і ружа.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Я нават не ведаю, што горай — адзінота ці яе бясконцыя капрызы. А можа, мне злётаць да цябе? А, зорка?
ЗОРКА. Я, прызнацца, і не зорка зусім. Я — планета, і завуць мяне Зямля.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Даўно марыў злятаць у падарожжа. Я вельмі лёгкі. Касмічны вецер мяне падніме, як толькі я гэтага пажадаю. І панясе куды захачу...
ЗОРКА. Не спяшайся, Маленькі прынц! Падумай добранька!

*Хлопчык скручвае сваю коўдрачку. Над Ружай лятае Страказа.*

СТРАКАЗА. Давай пазнаёмімся, кветка!
РУЖА. Ай, ты такая мітуслівая... Пасядзела б хоць хвілінку са мною.
СТРАКАЗА. А ты ўсё крытыкуеш. *(Села на вулканчык.)*
РУЖА. Такі ўжо ў мяне характар.
СТРАКАЗА. Характар — гэта тое, што можна змяніць.
РУЖА *(паказвае на Хлопчыка).* Ён зноў падняў пыл!
СТРАКАЗА. Бо ён адзіны гаспадар на гэтай планеце. Бачыш — мяце, поле... Завіхаецца.
РУЖА. А на мяне нават не зірне. *(Кашляе, каб звярнуць на сябе ўвагу.)*
СТРАКАЗА. Ды ён некуды збіраецца. Вось бачыш, ты даняла яго сваімі капрызамі!
РУЖА. Я цэлую раніцу не палітая.
СТРАКАЗА. Бедны хлопчык! І адкуль ты звалілася на яго галаву? Ты на самай справе горш за баабаб. *(Паляцела.)*

*Падыходзіць Маленькі прынц. З коўдрачкі ён зладзіў рукзак, на шыю завязаў доўгі шалік. Хлопчык і Ружа моўчкі глядзяць адно на аднаго.*

РУЖА *(ціха).* Мы развітваемся?
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Бывайце, цудоўная госця.
РУЖА. Мы... Мы болей не пабачымся?

МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Я пастараюся вярнуцца. *(Адыходзіць.)*
РУЖА. Чакай... Я хачу табе сказаць... *(Пяшчотна.)* Я... я была неразумнай. Даруй мне. І пастарайся быць шчаслівым.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Вы ніколі так са мной не размаўлялі.
РУЖА. І яшчэ... Апошняе... Я люблю цябе. І шкадую, што не прызналася ў гэтым раней. Ідзі, калі наважыўся. Ну, ідзі ж!

**З'ява II**

**У падарожжы**

*Маленькі прынц, як птушка, лунае паміж маленькіх і вялікіх планет, яго доўгі шалік падобен на парус. Ён тут свой, і музыка касмічных сфер для яго не чужая. Але прыходзіць час, і даводзіцца ўсё ж «прызямляцца» на бліжэйшыя планеты, знаёміцца з іх жыхарамі. Усе яны дзівакі, і кожны захоплены нечым сваім. Насельнікі планетак змяняюць адзін аднаго, як у калейдаскопе, але з кожным хлопчык паспявае пазнаёміцца і перакінуцца словам.*
*На троне сядзіць Кароль у раскошнай даўжэзнай мантыі. На галаве — карона, у руцэ знак улады — скіпетр.*

КАРОЛЬ. А вось і слуга! Падыдзі, я павінен цябе лепей разгледзець.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Вітаю вас! *(Азіраецца, дзе б гэта прысесці, пазяхае.)*
КАРОЛЬ. У прысутнасці манарха пазяхаць непрыстойна. Забараняю.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Але я так стаміўся за дарогу...
КАРОЛЬ. Ну, тады пазяхай сабе. Загадваю пазяхаць.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. А ці можна мне сесці?
КАРОЛЬ. Загадваю: сядай.

*Адсоўвае крысо сваёй мантыі, і хлопчык садзіцца ля яго ног.*

МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Ці дазволіце задаць адно пытанне?
КАРОЛЬ. Ну калі адно... Пытайся.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Ваша Вялікасць, скажыце, калі ласка, а чым вы ўладарыце?
КАРОЛЬ. Усім. *(Жэстам рукі ахапіў і неба ў зорках.)*
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Усім-усім?
КАРОЛЬ. Абсалютна ўсім.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. І нават зоркі вас слухаюцца?

КАРОЛЬ. Ну вядома! Зоркі — найперш. Я не цярплю непаслушэнства.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Ваша Вялікасць, а можа, Вы тыран, а не манарх?
КАРОЛЬ. Загадваю: забудзь гэта непрыемнае слова. Я ніякі не тыран, я проста ўладар.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Добра, я згодзен. Але тады... загадайце сонцу зайсці. Вельмі люблю назіраць захад сонца.
КАРОЛЬ. Ты абавязкова яго паглядзіш. *(Гартае каляндар.)* У 7 гадзін 40 хвілін сонца зойдзе. Па майму загаду, вядома.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ *(расчаравана).* Ах так... Мне, мабыць, пара. *(Паднімаецца.)*
КАРОЛЬ. Ты куды? Застанься! Я прызначу цябе міністрам юстыцыі.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Але ж тут няма каго судзіць!
КАРОЛЬ. Самае складанае — судзіць сябе самога. Ну, а калі захочаш судзіць іншых... На тым баку планеты жыве адзін стары пацук. Яго і судзі.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ *(убок).* Не ўжо, самі разбірайцеся са сваім пацуком. Ваша Вялікасць! Каб вы не трымалі на мяне крыўды, то загадайце мне пакінуць вашы ўладанні.
КАРОЛЬ *(падумаўшы).* Мудрае рашэнне. Прызначаю цябе паслом. *(Наўздагон.)* Чуеш? Будзеш маім паслом!
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ *(сам сабе).* Дзіўны народ — гэтыя дарослыя...

*Перад шарэнгай пустых і поўных бутэлек сядзіць самотны чалавек з азызлым тварам — П'яніца. На госця не рэагуе.*

МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Што вы тут робіце, дзядзечка?
П'ЯНІЦА. Хіба сам не бачыш? П'ю.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. А навошта?
П'ЯНІЦА *(уздыхаючы).* П'ю, каб забыць.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Што забыць?
П'ЯНІЦА. Хачу забыць, што мне сорамна.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Сорамна? А з-за чаго вам сорамна?
П'ЯНІЦА. З-за таго, што п'ю. *(Налівае ў шклянку.)* Шкада, што ты яшчэ малы. Ты б стаў маім кампаньёнам, і мы пілі б разам. А мо наліць кроплю?
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Што вы, дзядзечка! Я толькі на хвіліну завітаў, пазнаёміцца. Добрага вам здароўя.
П'ЯНІЦА. Якое ўжо тут здароўе!.. *(Чокаецца сам з сабою.)*
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ *(сам сабе).* Ну і ну!

*За пісьмовым сталом капітальна засеў Дзелавы чалавек, ён лічыць на калькулятары і таксама не зважае на госця: занадта заняты.*

МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Добры дзень. *(Не дачакаўшыся адказу.)* Ваша цыгарэта патухла.
ДЗЕЛАВЫ ЧАЛАВЕК. Дваццаць дзве тысячы плюс пятнаццаць... Добры дзень. Трыста трыццаць пяць плюс сто адзінаццаць... Прыкурыць няма калі. Усяго, значыцца, пяцьсот мільёнаў шэсцьсот дваццаць дзве тысячы семсот трыццаць адзін.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Пяцьсот мільёнаў чаго?
ДЗЕЛАВЫ ЧАЛАВЕК. Пяцьдзесят чатыры гады я жыву на гэтай планеце, і за ўвесь гэты час мне перашкаджалі тройчы. Дваццаць два гады таму сюды заляцеў хрушч. Ведаеш хрушча? Яго яшчэ майскім жуком завуць. З-за ягонага шуму я зрабіў у вылічэнні чатыры памылкі. Другі раз, дзесяць гадоў таму, у мяне быў прыступ раматусу — спіну скруціла, прасцей кажучы. Што зробіш... Сядзячая работа. Я чалавек сур'ёзны.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. А што было трэці раз?
ДЗЕЛАВЫ ЧАЛАВЕК. Трэці раз — ты і ёсць. *(Зноў бярэцца за калькулятар.)* Пяцьсот мільёнаў — не так і мала...
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ (не адступаючы). Мільёнаў чаго?
ДЗЕЛАВЫ ЧАЛАВЕК. Ну, ад цябе не адчэпішся. *(Уздыхае.)* Пяцьсот мільёнаў гэтых залатых штучак... Як іх... Ну, што ўверсе.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Мухі?
ДЗЕААВЫ ЧАЛАВЕК. Ды не. Бліскучыя такія...
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Пчолы?
ДЗЕААВЫ ЧАЛАВЕК. Не. На іх яшчэ гультаі любяць глядзець і паэты. А я чалавек сур'ёзны, мне няма калі.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. А-а, зоркі!
ДЗЕААВЫ ЧАЛАВЕК. Яны самыя. Зоркі.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. І што ты робіш з такой колькасцю зорак?
ДЗЕЛАВЫ ЧАЛАВЕК. Я нічога з імі не раблю. Я імі ўладару.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Але я знаёмы з каралём, каторы таксама ўладарыць зоркамі!
ДЗЕЛАВЫ ЧАЛАВЕК. Каралі толькі правяць. Гэта зусім іншая рэч.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. А навошта вам уладарыць зоркамі?
ДЗЕЛАВЫ ЧАЛАВЕК. Ну гэта ж проста: каб быць багатым.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. А багатым быць — навошта?
ДЗЕЛАВЫ ЧАЛАВЕК. Каб купляць усё новыя і новыя зоркі.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Вы разважаеце зусім як п'яніца.

ДЗЕЛАВЫ ЧАЛАВЕК. Ды ў п'яніцы нічога няма! Што ён пакладзе ў банк?
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Хіба пакладзеш у банк зоркі?
ДЗЕЛАВЫ ЧАЛАВЕК. Ну вядома. Я запісваю іх лік на паперы і хаваю ў сейф. Усё вельмі проста.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Хм... Куды ўжо прасцей. Ведаеце, у мяне ёсць кветка, якую я палiваў, і тры вулканы, якія штодзень чысціў. Ім была ад мяне карысць. А зоркам ад вас — які толк? Бывайце! Вы, можа, і дзелавы, але не такі ўжо і сур'ёзны.

*На наступнай планетцы размясціўся Ліхтаршчык. Ён штохвілінна то запальвае, то тушыць свой ліхтар.*

МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Добры дзень!
ЛІХТАРШЧЫК. Добры вечар. *(Запальвае ліхтар.)* А вось цяпер добры дзень. *(Патушыў.)*
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Навошта ты запальваеш яго так часта?
ЛІХТАРШЧЫК. Такая ўмова.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. А тушыш чаму?
ЛІХТАРШЧЫК. Я ж сказаў: умова. Работа ў мяне такая. *(Выцірае пот з ілба.)* Раней было інакш. Раніцай я ліхтар свой тушыў, а вечарам запальваў. У мяне заставаўся дзень, каб адпачыць, і ноч, каб выспацца.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. А потым умова змянілася?
ЛІХТАРШЧЫК. У тым і справа, што не. Планета круціцца ўсё хутчэй, а ўмова ранейшая. У мяне ні мінуты адпачынку.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Значыць, твой дзень доўжыцца ўсяго мінуту? Забаўна...
ЛІХТАРШЧЫК. Забаўнага тут мала.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Я разумею, табе цяжка, але ты верны свайму слову. Запальваць святло — у гэтым, памойму, нешта ёсць... Хочаш, я табе дапамагу? А ты адпачнеш.
ЛІХТАРШЧЫК. На маёй планетцы двое не памесцяцца. У кожнага павінен быць свой ліхтар.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Ну тады я палячу далей. Хачу пабываць вунь на той далёкай планеце. Бачыш? Яе завуць Зямля.
ЛІХТАРШЧЫК. Шчаслівага табе шляху. Мы і так прагаварылі цэлы месяц.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Бывай, ліхтаршчык!

*Хлопчык зноў лунае сярод зорак, у вушах яго яшчэ «пракручваюцца» рэплікі дзівакоў: «Загадваю: пазяхай!», «П'ю, каб забыцца», «Я чалавек сур'ёзны», «Работа ў мяне такая». З вышыні міргае знаёмая нам Зорка — Зямля.*

ЗЯМЛЯ. Ты стаміўся, мой хлопчык?
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Я наведаў столькі планет! Пабачыў столькі дзівакоў!
ЗОРКА. На мне дзівакоў жыве яшчэ болей — 110 манархаў, 900 тысяч дзелавых людзей і 7 з паловай мільёнаў п'яніц.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Колькі, колькі?!
ЗОРКА *(смяецца).* Не хвалюйся. Нармальных людзей жыве яшчэ болей. Ты пабачыш шмат цікавага — лясы і рэкі, горы і даліны, звяроў і птушак... Ляці сюды! Чакаю цябе! Чакаю!..

*Зорка павялічваецца ў памерах, яна ўсё бліжэй і бліжэй.*

**З'ява III**

**ЗЯМЛЯ**

*Маленькі прынц здзіўлена азіраецца. Вакол пуста, пясок, ні куста, ні дрэўца, ні людзей, ні будынкаў, толькі непадалёку напаўразбураны калодзеж.*

МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Дык гэта і ёсць Зямля? Так пуста і самотна яшчэ нідзе не было. *(Здымае рукзачок.)* Здаецца, я не туды трапіў.

*Паўзе Змяя.*

МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Ой, жывая істота! Добры вечар!
ЗМЯЯ. А ты ўпэўнены, што ён добры?
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Ты неяк дзіўна адказваеш. Скажы лепей, дзе я і чаму тут няма людзей.
ЗМЯЯ. Ты трапіў на ўскраек пустыні. А ў пус-с-тыні людзі не жывуць.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Як добра, што я цябе сустрэў. Без людзей усё ж адзінока.
ЗМЯЯ. Сярод ліюдзей таксама адзінока.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Хочаш, я пакажу табе сваю зорачку? Вунь яна. *(Паказвае.)*

ЗМЯЯ. С-с-сімпатычная зорачка. А чаму ты пакінуў яе?
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Я пасварыўся са сваей кветкай.
ЗМЯЯ. І толькі?
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Ну як табе растлумачыць... Яна ў мяне адна. Такой няма нідзе ў свеце, і я пакідаў яе з цяжкім сэрцам.
ЗМЯЯ. Вунь яно што... Калі захочаш вярнуцца — с-скажы. Я дапамагу табе.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Што ты можаш? З палец таўшчынёй і нават лап не маеш.
ЗМЯЯ *(смяецца.)* Няма лап, кажаш? Я магу цябе занесці далёка-далёка — далей, чым с-с-самалёт і карабель. *(Паказвае джала.)* Я магу-у-утная...
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Здаецца, я зразумеў. Але чаму ты ўвесь час гаворыш загадкамі?
ЗМЯЯ. Я адгадваю ўсе загадкі... *(Папаўзла.)*

*Маленькі прынц лёг, накрыўся коўдрачкай. Сцямнела. А калі настаў дзень, то непадалёку ўжо сядзіць Ліс. Ён цярпліва чакае, пакуль хлопчык прачнецца.*

МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ (разглядаючы звера). Ты хто такі?

*Ліс адбегся.*

МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Не бойся. Я не буду за табой ганяцца.
ЛІС. Звычайна і не ганяюцца. Проста страляюць — і ўсё.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. У мяне няма зброі. Давай пазнаёмімся.
ЛІС. Я — ліс. А ты, відаць, не мясцовы.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Так, я здалёку.
ЛІС. Што ты тут шукаеш?
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Людзей шукаю.
ЛІС. А я, наадварот, ад іх у пустыні хаваюся. Людзі — самыя небяспечныя стварэнні на свеце.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Я так не думаю.
ЛІС. Людзі ходзяць на паляванне, у іх ёсць стрэльбы. Адзінае, што яны ўмеюць, — страляць і разводзіць курэй. Эх, спаймаць бы зараз курачку на сняданак...
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Пагуляй са мной. Мне сумна.
ЛІС. Не магу. Я не прыручаны.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. А што гэта такое — прыручыць?

*Чуваць натужны гул самалёта. Ён ідзе на пасадку. Вялікую стальную птушку суправаджае слуп дыму. Самалёт прызямліўся па-за полем зроку.*

ЛІС. Тут становіцца людна. Ну, я набег... *(Знікае.)*

*З боку аварыі цяжка ступае Лётчык у вайсковай форме. Ён страшэнна змучаны. Падыходзіць, моўчкі здымае шлем і кладзецца на пясок.*

МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ *(не адразу).* Твой самалёт пацярпеў аварыю?
ЛЁТЧЫК *(сеў, углядаецца ў хлопчыка).* Здаецца, я трапіў у рай.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. У раі жывуць анёлы. А я звычайны Маленькі прынц. У мяне свая ўласная планета. Невялічкая... З дом усяго.
ЛЁТЧЫК. Калі твая планета з дом, то гэта астэроід.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Магчыма. Але іншай у мяне няма.
ЛЁТЧЫК. Дзіва дзіўнае! Пацярпець аварыю ў пустыні — і сустрэць зорнага хлопчыка!
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Намалюй мне баранчыка. Калі ласка...
ЛЁТЧЫК. Перш трэба знайсці ваду.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Яна ў тым калодзежы. *(Паказвае.)*
ЛЁТЧЫК. Гэта разбураны калодзеж, пусты. Такіх у пустыні сотні, я ведаю.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Хадзем, пабачыш.

*Ідуць да калодзежа, нахіляюцца.*

ЛЁТЧЫК. Вада! *(Апускае вядро, прагна п'е.)* А ты?
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Каб жыць, мне хапае сонечных промняў.
ЛЁТЧЫК. Ну і як табе жывецца на нашай планеце?
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Я тут не жыву, я проста госць. Дома мяне чакаюць.
ЛЁТЧЫК. Мяне таксама чакаюць дома. Хвалююцца. А яшчэ мяне чакаюць мае сябры-лётчыкі. Ведаеш, на планеце Зямля бываюць войны. Вайна — гэта страшная рэч. Калі-небудзь я раскажу табе пра яе.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Не хачу я ведаць пра вашу вайну. Хачу, каб ты намаляваў баранчыка.
ЛЁТЧЫК. Пазней. Перш я паспрабую адрамантаваць самалёт. *(Пайшоў.)*

*Тут жа з'яўляецца Ліс.*

ЛІС. І пра што можна так доўга размаўляць з чалавекам?
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Мы з ім падобныя. Мы абодва прыляцелі з неба.
ЛІС. А стрэльба ў яго ёсць?
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Дзіўна, усе чагосьці баяцца. Я баюся, каб не выраслі баабабы, ты — каб не застрэлілі людзі. І толькі мая ружа нічога не баіцца. Нават тыграў.
ЛІС. Раскажы мне пра сваю ружу.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Яна... Яна цудоўная. Яна пяшчотная. Другой такой не знойдзеш у свеце.
ЛІС. Ведаеш, я нядаўна трапіў у адзін сад... Па курыных справах... Дык там расце мо тысяча ружаў.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Маніш! Мая ружа — адзіная.
ЛІС. Гэта яна табе так сказала?
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Я сам ведаю!
ЛІС. Хадзем, сам пабачыш. Толькі не набліжайся, я ж не прыручаны яшчэ. *(Пайшлі.)*

*Паўзе Змяя.*

ЗМЯЯ. Нідзе няма с-с-пакою... Жалезныя птушкі, галодныя ліс-сіцы, зорныя хлопчыкі...

*Вяртаецца Лётчык. Міжволі войкнуў, убачыўшы Змяю, і выхапіў рэвальвер.*

ЗМЯЯ. Не с-спяшайся... Я не зраблю табе з-зла...
ЛЁТЧЫК. А яму?
ЗМЯЯ. Каму?
ЛЁТЧЫК. Зорнаму хлопчыку.
ЗМЯЯ. Схавай с-сваю ж-жалезку, чалавек. Мая зброя нашмат мацнейшая.
ЛЁТЧЫК *(пагрозна).* Калі ты... пасмееш яго ўджаліць...
ЗМЯЯ. Ха-ха-ха! А як іначай ён вернецца на сваю планетку? А ён жа засумуе па ёй. Абавязкова засумуе. Ды ты не бойся. Яшчэ мой час не нас-стаў...

*Каля агароджы, за якой віднеюцца кусты руж, горка плача Маленькі прынц. На аддегласці ад яго размясціўся Ліс.*

ЛІС. Ну, што я табе казаў?
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Тысяча руж... У адным толькі садзе... А я думаў, што такіх, як мая, нідзе болей няма...
ЛІС. Ну і што? Чаго тут гараваць?
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Звычайная, самая звычайная зямная кветка!..
ЛІС. А паляўнічыя на тваёй планеце ёсць?
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Няма.
ЛІС. А куры?
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. І курэй няма.
ЛІС. Няма дасканаласці ў свеце! *(Уздыхае.)* Ну што ў мяне за жыццё? Я палюю на курэй, паляўнічыя — на мяне...
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Чаму ты здалёк размаўляеш? Падыдзі бліжэй.
ЛІС. Падыду, калі прыручыш.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Але я не разумею — як. І што такое ўвогуле «прыручыць»?
ЛІС. Слухай. Зараз ты воддаль, так? Але паступова, па-ціху пачнеш набліжацца. І прыходзіць будзеш у адзін і той жа час, каб я цябе чакаў, рыхтаваўся да твайго прыходу. І калі сустрэча прызначана на чатыры, то ўжо ў тры гадзіны я адчую сябе шчаслівым. І ты станеш для мяне не проста хлопчыкам, і я для цябе — не проста лісам. Вось што такое «прыручыць».
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Здаецца, я зразумеў: мая ружа прыручыла мяне!

*Набліжаецца Лётчык, Ліс адразу хаваецца.*

ЛЁТЧЫК. Я ледзьве знайшоў цябе.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. А што здарылася?
ЛЁТЧЫК. Я не ведаў, дзе ты, і таму хваляваўся.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Выходзіць, я цябе таксама прыручаю.
ЛЁТЧЫК. Засталося замяніць пару дэталяў — і можна ляцець.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. А ты не ляці. Заставайся са мною. Ты намалюеш мне баранчыка, а я пазнаёмлю цябе з лісам. А яшчэ раскажу табе пра сваю планету, пра вулканы...
ЛЁТЧЫК. Лётчыку нельга без неба.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. А мне — нельга без ружы.
ЛЁТЧЫК. Прывыкнеш. Людзі да ўсяго прывыкаюць.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ *(папраўляе)*. Дарослыя людзі. Дарослыя не ўмеюць радавацца. Яны выдумляюць сабе праблемы. А жыццё ж — радасць. Кожнае імгненне зіхаціць, як зорачка, і пахне, як мая ружа. Ну вось, зноў я пра яе... Мусіць, час ляцець дадому.

ЛЁТЧЫК. Шкада, што я не магу цябе падвезці.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Толькі ты не забівай, калі ласка, змяю.
ЛЁТЧЫК. Адкуль... адкуль ты ведаеш, што я...
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Я трошкі ўмею чытаць думкі і бачыць будучыню.
ЛЁТЧЫК. І маю — таксама?

*Хлопчык адвярнуўся, унурыўся.*

ЛЁТЧЫК. Ну, кажы. Кажы, калі ведаеш.

*Маленькі прынц раптам абняў Лётчыка і заплакаў.*

МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ *(скрозь слёзы).* Не трэба табе ляцець на вайну. Твой самалёт... Твой самалёт могуць збіць.
ЛЁТЧЫК. Ну, гэта мы яшчэ пабачым, *(Выцірае хлопчыку слёзы.)* Галоўнае, каб ён завёўся.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Зямля такая вялікая, яна не хоча мяне адпускаць.
ЛЁТЧЫК. Не бядуй, што-небудзь прыдумаем...
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Яна ўжо прыдумала.
ЛЁТЧЫК. Хто?
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Змяя. Не, яна зусім не злосная. Яна проста мудрая. Мы нават пасябравалі.
ЛЁТЧЫК. Змяя не ўмее сябраваць. У яе халодная кроў і халоднае сэрца. *(Паўза.)* Ой, я зусім забыўся! Я абяцаў табе намаляваць баранчыка! *(Дастае з планшэта ліст, аловак, малюе.)* Такі падыдзе?
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Малы занадта.
ЛЁТЧЫК *(малюе другога.).* А гэты?
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Дык гэта ж дарослы баран, з рагамі! А я прасіў баранчыка.
ЛЁТЧЫК. Паспрабуем яшчэ. Ну як?
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Нармальна. Толькі намордніка не хапае.
ЛЁТЧЫК. Навошта баранчыку — намордні́к?
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Каб не з'еў маю ружу.
ЛЁТЧЫК. Ну тады хай будзе баранчык у скрынцы. Добра? *(Паказвае малюнак.)* Ну, мне пара збірацца.

*Ноч. Хлопчык адзін у пустыні. Яму не спіцца. Ён падняў галаву і пазірае ўвышыню.*

МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Недзе там, у зорнай далечы, мой астэроід. Мае тры вулканы... І яна, адзіная. Слабая і дужая. Гордая і безабаронная. Найлепшая ў свеце.

*Зорак на небе так многа, яны мігцяць, пераліваюцца, як алмазы, і вабяць да сябе. Хлопчык стаў на дыбачкі. Зорны карагод, здаецца, вось-вось закружыць яго, але на гэтай планеце вялікае прыцягненне... Пустыня. Ліс чакае сябра, азіраецца па баках. Убачыўшы Змяю, адбегся.*

ЗМЯЯ. Ты не бачыў зорнага хлопчыка?
ЛІС. Я сам яго чакаю.
ЗМЯЯ. Загасціўся ён у нас-с-с...
ЛІС. А табе якая справа?
ЗМЯЯ. У кожнага с-сваё месца, у кожнага свой час-с-с... *(Высоўвае джала.)*
ЛІС. Паўзі сваёй дарогай, грымучая.

*Змяя знікае, тым часам набліжаецца Маленькі прынц.*

МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Ну вось і я. Сёння добры дзень, дружа.
ЛІС. Сёння сапраўды добры дзень, бо я цябе дачакаўся.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Калі я ляцеў сюды, Зямля мне здавалася чужой і загадкавай. А цяпер усё іначай. Нават шкада, што час развітвацца.
ЛІС. Я буду сумаваць па табе. Можа, ты мне нават прыснішся. І калі я пабачу залатую пшаніцу, то ўспомню колер тваіх валасоў.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Ты сам захацеў быць прыручаным. А цяпер будзеш плакаць без мяне...
ЛІС. Так. Але не думай — я ні аб чым не шкадую. І маю для цябе адзін падарунак. На развітанне. Запомні гэтыя словы: самага галоўнага вачамі не ўбачыш — толькі сэрцам. Толькі сэрца відушчае.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ *(паўтарае, каб запомніць).* Самага галоўнага вачамі не ўбачыш...
ЛІС. Твая ружа табе дарагая, бо ты прыняў яе ў сваю душу.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. У сваю душу...
ЛІС. Мы ў адказе за тых, каго прыручылі.
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Бывай, дружа! Скажы лётчыку, што я не мог развітацца з ім. Не хачу, каб і ён плакаў па мне.

*Ноч. Пад святлом месяца серабрыцца Змейка. Да яе марудна набліжаецца хлопчык, у яго хадзе няма рашучасці.*

ЗМЯЯ. Я ведала, што ты прыйдзеш с-сёння. Ты гатовы?
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Так.
ЗМЯЯ. Ты плачаш?
МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ. Я плачу не ад страху — мне сумна. Я хачу да яе, сваей мілай кветкі, а ваша планета так проста не адпускае. Мне без цябе не абысціся. Ты была першай, каго я тут сустрэў...
ЗМЯЯ. І буду апошняй, каго ты тут бачыш. Не бойс-ся. Ты нічога не адчуеш. І не памрэш. Ты прос-ста апынешся там, дзе цябе чакаюць. Усе шляхі вядуць дадому. Успамінай нас ус-сіх — каго ты сустрэў тут, на Зямлі, і там, на небе. Мы любім, як умеем, кожны па-свойму. І жывём, як умеем. Даруй нам усім. Бывай, зорны хлопчык!

*Хлопчык узяў Змяю на рукі, і яна абвілася вакол яго шыі. Тысячы зорак раўнадушна пазіраюць на гэту драму, і толькі ціхенька-ціхенька непадалёку плача Ліс.*
*Маленькі прынц упаў паволі, як бы ў дрымоце.*
*«Бывай!» — сказалі ружы ў садзе.*
*«Бывай!» — паўтарыў самотны Ліс.*
*«Бывай!» — сказаў Лётчык, надзяваючы шлем.*
*І толькі Ружа ў прадчуванні хуткай сустрэчы радасна раскрыла свае пялёсткі.*

**Канец**

## ЛЯСНОЕ БРАЦТВА

Сцэнічны абразок для дзяцей

Дзейныя асобы:

САБАКА.
ВОЎК.
1-я АПЕНЬКА.
2-я АПЕНЬКА.
ГОЛАД.
ГАСПАДАР.

## З'ява 1

*Позняя восень. Лясны прагал. Бярозы, елкі, старыя і свежыя пні. Дзве апенькі, кожная на сваім пні. Пад елкай, скруціўшыся, спіць Воўк. Раз-пораз уздрыгвае, ускаквае — ці ўсё спакойна — і зноў дрэмле.*

1-я АПЕНЬКА. Сумна ў нашым лесе. Нічога не здараецца...
2-я АПЕНЬКА. Як гэта — не здараецца? На тым тыдні яшчэ адно дрэва ссеклі. Учора сойка прылятала. А сёння, бачыш, воўк наведаўся...
ВОЎК *(схамянуўся).* Хто тут? *(Зноў засынае.)*
1-я АПЕНЬКА. Ну вось. Сядзі цяпер і прытварайся нежывой.

*Азіраючыся, крадзецца Сабака. Апенькі хаваюцца за свае пні.*

САБАКА. Чарнее нешта... Ці не воўк? Не, камень проста. Валун.

*Крычыць крумкач. Сабака ўздрыгнуў, Воўк прачнуўся і ашчэрыўся.*

САБАКА. Ой, а я думаў — валун!
ВОЎК *(пагрозна).* А-а, чалавечы служка... Хатні падхалім... Ліслівец...
САБАКА. Я тут адзін. Чаго абзываешся? «Ліслівец, ліслівец...»
ВОЎК. Адзін, кажаш? *(Супакойваецца.)* Выгналі, нябось, з дому? І правільна зрабілі.
САБАКА. Усё табе раскажы.
ВОЎК. Як сабе хочаш... *(Чухае за вухам, пазяхае.)* Есці ахвота. *(У залу.)* Паснедаць ім, ці што?
САБАКА. Цябе Бог пакарае — што на брата паквапіўся.
ВОЎК. Ха! Які ты мне брат?
САБАКА. А такі. Ведаць трэба: вы, ваўкі, і мы, сабакі, паходзім ад аднаго продка. Толькі нас прыручылі, а вы засталіся дзікімі.
ВОЎК. Дзікімі, затое вольнымі. Куды хачу, туды іду.
САБАКА. Паспытаў я ўжо вашай волі. Трэці дзень па лесе бадзяюся. Галодны, як воўк!
ВОЎК. Давай пагрэемся. Калі цёпла, не так галадуха бярэ.
САБАКА. А як?
ВОЎК. Бегаць будзем — ад той елкі да той бярозы. *(Хіхікае.)* Пераможца з'ядае пераможанага.
САБАКА. Ты мне гэтыя песні кінь! І не збіраюся я брата есці. Ад той елкі, кажаш?

*Становяцца на старт.*

ВОЎК. На лік «тры» — бяжым. Раз... *(Сабака тузануўся.)* Два... *(Сабака пабег.)* Я цябе магу са старта зняць. Што, да трох лічыць не ўмееш? Паўтараю для някемлівых: раз... два... тры! *(Пабеглі.)*

*Бягуць, штурхаючыся. Сабака зачапіўся за пень і сутыкнуўся з Апенькай. Абое перапужаліся. Апенька прыклала палец да вуснаў — каб маўчаў — і замерла на пні, як нежывая.*

ВОЎК. А гэта што? *(Абыходзіць Апеньку).*
САБАКА. Я асабіста грыбоў не ем. *(Сеў на пень і дзьме на лапу).* Сам бегай, я ўжо сагрэўся.
ВОЎК. Аднаму бегаць нецікава. *(Прысаджваецца на суседні пянёк.)* Скажы чэсна: ты заблудзіўся ў лесе?
САБАКА. Збег я. Проста збег.
ВОЎК *(прысвіснуўшы, з павагай).* Ну, ты даеш... *(Абыходзіць Сабаку, як нейкае дзіва.)* Няўжо збег? Сам?!
САБАКА. Ты б пажыў, як я. Ніякіх умоў. Мала што на ланцугу, дык яшчэ і будка дзіравая, на галаву дождж капае. Во, паглядзі, як ашыйнікам шыю намуляў.
ВОЎК *(разглядвае).* Што робіцца! Што робіцца!
САБАКА. І кармілі дрэнна. То бульбу, то хлеб... Што я — свіння, ці што? І так з маленства. А матуля мая, між іншым, вольная была. Амаль як ты.
ВОЎК. А я сваю маці зусім не помню. Малы быў, як яе двухногія ўпалявалі. Ледзьве выжыў.
САБАКА. Ай-я-яй... Ну звяры!
ВОЎК. А я пра што? Сцяжкамі абнеслі, абгарадзілі, а воўк за сцяжкі не пойдзе.
САБАКА. Але чаму? Што ў іх страшнага — у сцяжках?
ВОЎК. Новае палохае, невядомае, разумееш? А цераз страх не пераскочыш.
САБАКА. А ты спрабаваў?
ВОЎК. Цьфу-цьфу... Не каркай.
САБАКА. Ну вось, мы не толькі браты. Мы яшчэ і сябры па няшчасцю.
ВОЎК. Змерз я тут з табою. *(Робіць практыкаванні, каб сагрэцца.)*
САБАКА. Біцэпсы ў цябе — што трэба! *(Разглядае ваўчыныя лапы.)*
ВОЎК. Ты тут надта не падлізвайся. Ведаю я вас, падхалімаў... А цябе, выпадкам, не падаслалі, а? Каб узяць мяне голымі рукамі?

САБАКА. Каб я здох! *(Грукае сябе ў грудзі.)*
ВОЎК. Важак сказаў: не вер двухногім і тым, што ля іх кормяцца. *(Слявае.)*

ПЕСНЯ ВАЎКА

Сярод елак, сярод соснаў
Ходзіць голад невыносны.
Чым яго мне адагнаць?
Толькі спаць!
Заснуць і спаць!
Чую кожны шолах лесу,
На ражон даўно не лезу.
Мала нас, дык берагуся,
За ваўчыны род баюся.

*2-я Апенька, захапіўшыся, спрабуе пapляскаць, 1-я цягне яе за спаднічку.*

### З'ява 2

*Тое ж месца. Воўк і Сабака клююць носам.*

ВОЎК *(пазяхае).* Ведаеш, ёсць ідэя: давай адпачнём. Будзем спаць па чарзе.
САБАКА. Ты першы!
ВОЎК. Не, першы — ты.
САБАКА. Добра. Толькі не задрамі хаця. *(Кладзецца ў лагчынку пад елкай.)*

*Воўк зноў размінаецца, спрабуе стаць на галаву, але падае.*

ВОЎК. Зусім форму страціў. Так мяне любы шаўка адужае. *(Глядзіць у бок Сабакі.)* Гэта ж прыдумаць — брат ён мне! А?

*Паказваюцца апенькі.*

1-я АПЕНЬКА *(другой).* Цікава, чым гэта ўсё скончыцца?

*З'яўляецца Голад — дробная непрыемная асоба незразумелага полу і ўзросту з капюшонам, што закрывае твар.*

1-я АПЕНЬКА. Ты яго ведаеш?
2-я АПЕНЬКА. Першы раз бачу!

*Голад моўчкі паклаў на плячо Ваўка руку.*

ВОЎК *(уздрыгнуўшы).* Га? Хто ты?
ГОЛАД. Што вушы развесіў? Слінкі пусціў?
ВОЎК. Не ведаю я цябе.
ГОЛАД. Яшчэ як ведаеш. Як ты нарадзіўся, я ўжо быў побач. Я бег за табой па пятах, калі ты гнаўся за здабычай. Я, калі падумаць, твой сапраўдны брат, а не ён! *(Паўза.)* Што, не дапетрыў? Я твой голад.
ВОЎК. Хто-хто? Голад?
ГОЛАД. І прыйшоў я не проста так. *(Паказвае на Сабаку.)* З'еш яго!
ВОЎК. Не такі ўжо я і галодны. Во, сыраежку магу з'есці. *(Падбірае з-пад ног грыб.)* Вітаміны... І апеньку магу. *(Апенькі пахаваліся.)*
Дзе яны ?
ГОЛАД. Ха-ха-ха! Мяне не падманеш, даражэнькі, не правядзеш... Хачу, каб яго *(паказвае на Сабаку).*

*Сабака праз сон скуголіць.*

ВОЎК. Сніць нешта страшнае. Мяне, напэўна.
ГОЛАД. Ну, рашайся!

*Воўк падбягае да Сабакі... і пачынае яго будзіць. Голад расчаравана перасмыкнуўся і прапаў у гушчары. Апенькі радуюцца.*

САБАКА *(прахапіўся).* Што? Хто? Дзе?
ВОЎК. Пад'ём, мая чарга класціся! Уставай, кажу!
САБАКА. Ды я толькі вочы звёў!
ВОЎК. Многа спаць — дабра не знаць. *(У залу.)* Сам прыдумаў.

*Сабака пацягваецца і неахвотна саступае месца.*

САБАКА. Во, бок адсырэў... Каб хаця раматусам не скруціла...
ВОЎК. Распанеў каля двухногіх. Я зімой на снезе сплю — і хоць бы што. Ну, добранька вартуй! *(Лёг і засынае.)*
САБАКА *(чухае патыліцу і разважае).* Дзе знайсці такую волю, каб есці давалі? *(У бок Ваўка).* І яму не соладка, бачу... Ды і колькі іх у нашым лесе засталося? *(Нягучна спявае.)*

ПЕСНЯ САБАКІ

Як дзеці любяць казку,
Як пчолы любяць мёд —
Люблю я, людзі, ласку
І жытку без прыгод.
Прыпеў:
Па галаве пагладзяць—
Я ўсё дарую,
На дварэ ўласным
Днюю і начую.
Зірну аддана ў вочы,
Ільну да вашых рук.
Я лепшы сторож — ноччу,
А днём я ваш сябрук.
Прыпеў.

*На апошніх нотах песні з'яўляецца Голад, знарок пляскае ў далоні. Сабака ашчэрыўся, гыркае.*

ГОЛАД. Здурнеў, далібог! Ад ваўка набраўся.
САБАКА. Не падыходзь, пачвара!
ГОЛАД. Я пакрыўджуся. Іду як белы чалавек, ветліва яму пляскаю — а ён, няўдзячны...
САБАКА. Дык ты голад, кажаш? А ты адкрый свой капюшончык, адкрый...
ГОЛАД *(адступае).* Не ўбярэш рукі — працягнеш ногі!
САБАКА. Валі адсюль, чуеш?
ГОЛАД. Чым далей, тым цікавей. *(Адступаючы, наступіў на нагу Апеньцы.)*
2-я АПЕНЬКА. А-а-а!
1-я АПЕНЬКА. Швэндаюцца тут усялякія. *(Разам выпіхваюць Голада.)*

**З'ява 3**

*Напяваючы, крочыць Гаспадар са стрэльбаю.*
*Сабака звыкла выцягнуўся ў струнку.*

ГАСПАДАР *(убачыўшы Сабаку).* А ты што тут робіш, псіна?! Во дзівосы! Пайшоў на ваўкоў, а знайшоў уласнага сабаку! Цю-цю... Давай пагладжу. *(Сабака адбегся і сеў воддаль.)* Здзічэў ты, бачу, у

лесе. Мабыць, гаспадара баішся... Знае котка, чыё мяса з'ела! Чаго маўчыш?
1-я АПЕНЬКА *(другой).* Уцякаем, тут разборка. *(Знікаюць.)*
ГАСПАДАР. Зараз я сцяжкі настаўлю на ваўка, а ты будзь напагатове.
САБАКА *(пасоўваецца далей ад спячага Ваўка).* Няма тут ніякіх ваўкоў.
ГАСПАДАР. Мне лепей ведаць. *(Абносіць сцяжкамі вялікі круг, у якім аказваецца і ваўчынае лежбішча.)*
САБАКА. Дык цяпер жа не сезон. Штрафануць могуць.
ГАСПАДАР. Інспектараў баяцца — у лес не хадзіць. Ну, гатовы мне дапамагаць?

*З-за дрэва паказваецца знаёмы капюшон. Голад задаволена пацірае рукі. Сабака не ведае, што казаць і што рабіць.*

ГАСПАДАР. Доўга думаеш, псіна.
САБАКА. Ну, калі дасі мне слова...
ГАСПАДАР. Якое яшчэ слова?
САБАКА. Што карміць мяне будзеш па-чалавечы...
ГАСПАДАР. Даю, даю табе сто слоў, толькі завалі звера. Шкуру яго табе ў будку пакладу.

*Голад актыўна радуецца.*

САБАКА.. Ды бачыў я яго, ваўчару. Вунь там, у лагчыне. *(Паказвае ў процілеглы бок.)*

*Гаспадар рэзка азірануўся — і ўбачыў постаць Голада. Той хаваецца.*

ГАСПАДАР *(трасе галавой).* Цьфу, цьфу, казала ўчора жонка — не пі... *(Паўза.)* Ён дакладна там?
САБАКА *(грукае сабе ў грудзі.)* Каб я здох!
ГАСПАДАР. Гэта мяняе мае планы. *(Наставіў стрэльбу і падаўся ва ўказаны бок).*
САБАКА *(будзіць Ваўка).* Бяда, бяда! Паляўнічы!
ВОЎК. Я ўсё чуў. Кранты мне.
САБАКА. Уцякай!

*Воўк кідаецца туды-сюды ў кругу сцяжкоў.*

САБАКА. Пераскаквай! *(Раздаецца блізкі стрэл.)* Прыгай!

*Воўк закрыў галаву лапамі і чакае смерці. Сабака схапіў шнур са сцяжкамі і разамкнуў круг.*

ВОЎК. Бывай, брат! *(Кінуўся наўцёкі.)*

*Сабака аднаўляе круг. Прыбег Гаспадар.*

ГАСПАДАР. Збег! За сцяжкі пайшоў! А ты куды глядзеў, балбес?
САБАКА. Сам цэліўся, сам прамахнуўся, а я вінаваты...
ГАСПАДАР. Даганяць трэба было.
САБАКА. Каб ты столькі, як я, пасядзеў на прывязі,— ото б даганяў, ото б імчаўся!..
ГАСПАДАР. Твая праўда. *(Чухае патыліцу.)* Што ж, хадзем дадому.
САБАКА. Мір?
ГАСПАДАР. Мір, мір. Ты ж на мяне не крыўдуеш?
САБАКА. Не-а. А ты на мяне?
ГАСПАДАР. Дарую, як усё раскажаш. *(Пайшоў першы.)*
САБАКА. Чакай, адна справа ёсць.

*Ён падаўся за елку і цягне Голада. Той вырваўся і ўцёк. Сабака вешае на галіну яго чорны плашч.*

САБАКА *(у залу).* Галоўнае, дзеці, — не баяцца сцяжкоў!
2-я АПЕНЬКА *(выходзячы, першай).* Той як стрэліць... А гэны... Праўда, здорава? Апошні герой!

*Садзяцца на пянькі, прыхарошваюцца.*

1-я АПЕНЬКА. Такое жыццё кароткае, а столькі здарэнняў!

**Канец**

## ЯК ПТУШКІ ДУБ РАТАВАЛІ

Сцэнічны абразок
(Паводле «Казак жыцця» Якуба Коласа)

Дзейныя асобы:

ДУБ.
САРОКА.
СОЙКА.
ГАЛКА.
КРУМКАЧ.
ДЗЯЦЕЛ.
БУСЕЛ.
БУСЛІХА.
ВЯДУЧЫ.

ВЯДУЧЫ. Пэўна не скажу, над якою рэчкаю векаваў магутны дуб: ці то над Нёманам, ці то над Свіслаччу. Ды гэта і не мяняе сутнасці справы. Важна тое, што год за годам на дуб навальвалася старасць.

*Лясная паляна. Вакол Дуба сабраліся птушкі, кожная занята сваім. Сойка прыхарошваецца, Галка шэпчацца з Варонай.*

ДУБ. О-ох, старасць не радасць... І верхавіна ўжо лысець пачала, і галіны голыя ў небе свецяцца... Ох, жыццё маё гарапашнае...
САРОКА. Чуеце? Чуеце? Наш дуб старэе! Дуб старэе! Хутка, не тут кажучы, на дол небарака рухне.
СОЙКА. Такі быў магутны, такі моцны, жалудамі нас карміў — і на табе! Засыхае, бедненькі...
ГАЛКА. А як ваяваў з бурамі ды навальніцамі!
САРОКА. Так, так! Мы ўсе пад яго галінамі хаваліся.

*Цяжка тупае стары згорблены Крумкач з тоўстаю кнігаю пад пахай.*

КРУМКАЧ. Ккруп... Ккруп... Ккруп...
САРОКА. Што ён кажа?
ПТУШКІ *(разам).* Што? Што ён сказаў? Труп?
ГАЛКА. А матачкі мае! Гэта ж крумкач варожыць, што скора наш дуб дуба дасць.
СОЙКА. І зусім не гэта хоча сказаць мудры прафесар. Ён проста дае параду, што хвораму дубу для папраўкі трэба круп.
САРОКА. Цішэй вы! Прафесар скажа прамову.
СОЙКА. Не проста прафесар — акадэмік! Пачынайце, шаноўны.

*Крумкач выйшаў у цэнтр і акінуў вокам усю птушыную грамаду.*

КРУМКАЧ. Ккрак! Усім ясна, шаноўнае грамадства: наш паважаны дуб цяжка хворы. Галава яго аблысела, а збоку пачало ўтварацца дупло. Трэба даследаваць, у якім стане знаходзіцца сэрцавіна дрэва.
САРОКА. Так, так! Даследаваць!
КРУМКАЧ. Я не ўсё сказаў. *(Пракашляўся.)* Прыйдзецца, шаноўнае птаства, запрасіць на кансультацыю Дзятла.
СОЙКА. Якая мудрая думка!
ПТУШКІ *(разам).* Дзятла! Дзятла! Доктара! Хірурга!
САРОКА. Ціха вы! Дзяцел зараз адпачывае — зрабіў аперацыю хворай сасне.

СОЙКА. Але наш хворы ў цяжкім стане.
КРУМКАЧ. Хто ўстане?
САРОКА. Ну, калі вы так рашылі, трэба клікаць. *(Галцы.)* Злётай, Галка, і запрасі далікатненька.
СОЙКА. Лепей я. Я, Сойка, да ўсіх падыход маю.
КРУМКАЧ. Ляціце разам.

*Дзяцел дрэмле ў сваім пакоі. Галка з Сойкай стукаюць у дзверы.*

ДЗЯЦЕЛ *(прахапіўся)*. Хто там?
ГАЛКА. Бяда ў нас, доктар. Дуб хворы.
СОЙКА *(штурхае яе)*. Ды не так! Табе ж сказалі — далікатненька! *(Дзятлу.)* Міленькі ты наш, даруй за клопат. Мы прыляцелі ад імя ўсёй птушынай грамады. Дуб стары, карміцель наш, заняпаў, занядужаў. Слаўны такі быў, ты сам не раз да яго прылятаў. *(Разам.)* Адведай хворага, калі ласка!
ДЗЯЦЕЛ. Добра, адведаю. *(Збірае прылады, надзяе белую шапачку.)*

*Дзяцел абстуквае і аглядае Дуб з усіх бакоў. Птушкі сочаць за кожным яго рухам.*

КРУМКАЧ. Ккрум... Ці будзе жыць?
ДЗЯЦЕЛ *(паправіў акуляры і вынес вердыкт)*. Дуб сапраўды хворы, але не настолькі, каб можна было трывожыцца за яго жыццё. Патрэбен поўны спакой. Дзіркі пазатыкаць, жалуды пазнімаць, лісты... Не, лісты хутка самі адваляцца. А галоўнае, ад сцюдзёнага ветру посцілкай захутаць.
ПТУШКІ *(разам)*. Дзякуем! Дзякуем, дарагі доктар!
КРУМКАЧ. Прыемна ведаць, што ў нашым лесе ёсць такія спецыялісты. *(Паціскае Дзятлу крыло.)*
СОЙКА. Мы вас правядзём, даражэнькі. *(З Сарокай праводзяць яго.)*
КРУМКАЧ. Што ж, будзем лячыць старога. Перш за ўсё заслонім яго ад ветру.
СОЙКА. Я! Я буду засланяць! Дазвольце мне!

*Птушкі апранаюць Дуб у вязаны каптур і рукавіцы, ахінаюць посцілкай і зверху завязваюць шалікам. Дуб толькі цяжка ўздыхае.*

ПТУШКІ. Вось так. Так добра будзе... Цудоўна. Поўны парадак.
ДУБ. Ох, зусім няма чым дыхаць...

САРОКА. Пацярпі. Увесну будзеш як новенькі!

*Птушкі, задаволеныя сабою, водзяць вакол дрэва карагод.*

ВЯДУЧЫ. Застаецца сказаць нямнога, каб закончыць казку. За зімою, як вядома, ідзе вясна. Вярнуліся з выраю буслы. І што ж яны бачаць? Ідуць з рукзакамі стомленыя буслы.
БУСЕЛ. Нарэшце мы дома... Вярнуліся. Гняздо падновім, дзетак выведзем... Сядай, жонка, адпачнём.
БУСЛІХА. Авой, зірні, што сталася з нашым дубам! У яго каптур, як у старой бабкі.
БУСЕЛ. Праўду кажаш, сам на сябе непадобны стаў. Збуцвеў, ледзь на нагах трымаецца...
БУСЛІХА. Дык што з нашым домам будзе? Дзе нам жыць цяпер, а?

*Іх акружылі птушкі.*

КРУМКАЧ. У буслоў праблема з жыллём. Ккрум...
СОЙКА *(Буслам).* Ой, мілыя! Мы так стараліся, так яго лячылі!
ГАЛКА. Дзятла-хірурга клікалі...
БУСЕЛ *(дражніць).* Стараліся яны... Лячылі... Перастараліся і залячылі. Давай, жонка, расхутваць будзем дуб.

*Буслы знімаюць з яго рукавіцы, шапку, посцілку. Птушкі вакол мітусяцца, крычаць... Дуб дыхнуў паветра і расправіў грудзі.*

ДУБ. Дзякую вам, дзеці мае! Адсланілі вы мне свет белы.
ВЯДУЧЫ *(у залу).* А вось і мараль гэтай гісторыі: усюды і ва ўсім трэба мець розум і ведаць меру.

**Канец**

***Ад аўтара.*** *Да «Казак жыцця» я звярнулася з нагоды юбілею Якуба Коласа. Прапікнёныя і поўныя жыццёвай мудрасці, яны проста прасіліся на сцэну. Пераклаўшы адну з казак на мову драматургіі, я ўпершыню паспрабавала сябе ў ролі рэжысёра. Мае навучэнцы (а я вяду гурток практычнай журналістыкі) таксама займелі новы вопыт — выступалі як акцёры на вялікай вечарыне.*

*Казка «Як птушкі дуб ратавалі» вучыць нас рабіць дабро, захоўваючы пачуццё меры. Бо і добрую справу, як вядома, можна загубіць, калі брацца за яе без розуму і здаровага сэнсу.*
*Інсцэніроўка дазваляе задзейнічаць многа выканаўцаў, праявіць фантазію і гумар у падборы касцюмаў і рэквізіту. Яе можна выкарыстаць для любога літаратурнага вечара ці школьнага свята.*

## ДЗЕНЬ ДОБРЫ, КАРАЛЕЎНА!

Зімовыя прыгоды малых і дарослых

Дзейныя асобы:

БАБА ШАПТУХА.
ЯНІНКА, дзяўчынка гадоў 10-12.
ШЭРЫ, сабака.
ЗУХ, МУХ, браты-падлеткі.
ГУМЕННІК, малады дух гумна.
СУСЕДКА.
ДЗЕЦІ.

## Уступ

*Зімовае, каляднае афармленне сцэны. Выходзяць дзеці.*

1-е ДЗІЦЯ. Ужо змяркаецца, зірні!
Ціха згаслі прамяні,
Зоркі першыя мігцяць...
2-е ДЗІЦЯ. Трэба казку пачынаць.
3-е ДЗІЦЯ. Казка, дзе ты?
4-е ДЗІЦЯ. Дзе ты, казка?
РАЗАМ. Не марудзь жа, калі ласка!
1-е ДЗІЦЯ. У тваёй краіне
Добрае не згіне.
2-е ДЗІЦЯ. Там дзівосаў цэлы воз.
3-е ДЗІЦЯ. Казка — праўда,
4-е ДЗІЦЯ. Казка — лёс.
2-е ДЗІЦЯ. Зачакалася малеча.
ЯНІНКА *(заходзіць).* Вось і я. Вам добры вечар!

*Янінку абступаюць дзеці, рассаджваюцца слухаць.*

ЯНІНКА. Раскажам вам гісторыю пра бабулю-варажбітку і яе любімага сабаку, пра дзяўчынку Янінку і многае-многае іншае. Ну, пара мне ў казку! А то без мяне яна не распачнецца.

## Карціна 1

*Хата бабы Шаптухі. На шыбах марозныя ўзоры. На сценах — вязкі сушаных зёлак. Збоку — лесвіца на вышкі. Гаспадыня вяжа шкарпэтку і размаўляе з Суседкай.*

СУСЕДКА. Каторую ноч не сплю. Як толькі збяруся класціся — у шыбу хтось скрабецца. Як быццам сказаць нешта хоча. Раз зірнула, авоечкі — калматы!
ШАПТУХА. І што?
СУСЕДКА. Як — што? Змарнавалася ўся. Сэрца тахкае...
ШАПТУХА. Напарыш пералёту. На, вазьмі *(дае пучок зёлак).* Пярэпалах у цябе, Наста.
СУСЕДКА. Мо ўчастковаму заявіць?

*Заходзіць захутаная, расчырванелая ад марозу Янінка.*

ШАПТУХА *(Янінцы).* Ухадзілася?
ЯНІНКА. Так, бабуля. Карову падаіць засталося.
ШАПТУХА. А курам нашым не халодна?
ЯНІНКА. Не, я ж ім у катух вугельчыкаў занесла. *(Паўза.)* Бабуля,

*Шэры ў хату просіцца.*

ШАПТУХА. У-у, лайдачына, ваўкі яго ядзяць... Усё каб у цёпленькае...
СУСЕДКА. Не кажы так, суседачка. Як у мяне летась сабака згінуў — я гэтак плакала, гэтак плакала...
ШАПТУХА. Бо жаласлівая надта. Табе і муху шкада пад мухабойкай. *(Янінцы)* Упусці яго.

*Янінка выйшла.*

СУСЕДКА. Залатая ў цябе ўнучачка. Працавітая, паслухмяная...
ШАПТУХА. Дзяцей у строгасці трымаць трэба, а то раздурацца.
СУСЕДКА. Бачу, бачу... Дык жа сіротка яна ў цябе.

*Заходзіць Янінка, за ёй шчаслівы Шэры.*

СУСЕДКА. Пайду я. За лекі пазней разлічуся. Дзякуй. *(Выходзіць.)*
ШАПТУХА. «Дзякуй» не масла, на хлеб не намажаш. *(Сабаку, уладарна.)* Хадзі сюды!

*Сабака ціснецца ў кут.*

ШАПТУХА. Да мяне, каму сказала!
ЯНІНКА. Бабуля, не трэба. Ён вас баіцца.
ШАПТУХА. У-у, каб ты ногі выцягнуў! Баіцца ён. Можа, і ты мяне баішся?
ЯНІНКА. Я... Я... Ой, зусім пра карову забылася... *(Накідвае палітончык, бярэ вядро і выбягае.)*
ШАПТУХА *(Шэраму).* Служыць! Што, не хочаш гаспадыню пацешыць? А якую аладачку я табе зараз дам!.. *(Шэры нясмела набліжаецца.)* Во якая... Што сонейка.

*Шэры раптам выхапіў з яе рукі аладку, адбегся і з'еў.*

ШАПТУХА. Паслужыў, называецца!
ШЭРЫ *(аблізваецца).* Дзякуй.
ШАПТУХА. Ой! І гэты — «дзякуй»!
ШЭРЫ. Самому дзіўна. Голас чалавечы прарэзаўся...
ШАПТУХА. Ай-я-яй, што я нарабіла! Сабаку дала не тую аладку...
ШЭРЫ. Няўдалы эксперымент.
ШАПТУХА. Маўчы, дурань!
ШЭРЫ. А мо, наадварот, удалы?
ШАПТУХА. Нашаптала на сваю галаву. Начаравала.
ШЭРЫ. І надоўта гэта ў мяне?
ШАПТУХА. Каб жа я ведала... Вось што: ні з кім іншым не размаўляеш, толькі са мною. Інакш... *(Грозіць кулаком.)*

**Карціна 2**

*У хату ўваходзіць Янінка з вядром, плача.*

ШАПТУХА. Зноў Лысуха вядро перакуліла?
ЯНІНКА. Не, капытом на нагу наступіла.
ШАПТУХА. Дык нага ж не босая!
ЯНІНКА. Усё роўна балі-і-іць...
ШАПТУХА. Сціхні, табе сказала! Замоўкні! *(Ганяецца за ёй з ручніком.)*

*Шэры падскочыў і адабраў ручнік.*

ШАПТУХА. А-а, заступнічак!
ШЭРЫ. Не смей біць Янінку!
ЯНІНКА. Шэры, ты загаварыў?! *(Ад здзіўлення перастала плакаць і ўцякаць.)*
ШАПТУХА *(Сабаку).* Вон адсюль! Зусім! І каб нагі тваёй у хаце больш не было!
ЯНІНКА. Тады я таксама пайду.
ШАПТУХА *(адчыняе дзверы).* Вон, псіна! І болей не вяртайся. *(Янінцы.)* А з табой асобная гаворка. *(Ходзіць па пакоі.)* Выгадавала на сваю галаву! Сабака ёй даражэй за бабулю.
ЯНІНКА. Дзе ён цяпер жыць будзе?
ШАПТУХА. Гэта яго клопат. А ты за няўдзячнасць будзеш пакарана.
ЯНІНКА. Я ў куце пастаю. *(Хуценька становіцца ў кут.)*
ШАПТУХА. Кута, бачу, мала. Выбірай: на вышкі, у склеп ці ў кладоўку. На гадзіну.

ЯНІНКА. У склепе мы-ы-шы.
ШАПТУХА. Пакаранне — сябра выхавання.
ЯНІНКА. У кладоўцы таксама мышы.
ШАПТУХА *(зміласцівілася).* Ну добра. На вышкі. Там комін цёплы. Бачыш, якая я адыходлівая.
ЯНІНКА. Бабуля, не забудзь навесці будзільнік, а то я зноў да паўночы там прасяджу.
ШАПТУХА. Навяду, навяду... *(Наводзіць будзільнік.)*

*Запальвае свечку і дастае з паліцы якуюсь тоўстую кніжку. Свечка тухне.*

ШАПТУХА. (Чытае па складах.) Як разлучыць жаніха і нявесту... Як прысушыць кавалера... Як...

*Чуваць выццё Шэрага.*

ШАПТУХА. Памерзні, псіна, будзеш ведаць, па чым фунт ліха.

*Пагрозны, размераны стук у шыбіну. Бабуля хавае кнігу.*

ШАПТУХА. Хто гэтак позна завітаў? Мо Трахім, якога сурочыла? Ці Аўдоля, якой пазыку не аддала? Такія людзі пайшлі ліхія, кожны можа з помстаю прыйсці.

*Стук паўтарыўся. Злавесны голас: «Выходзь, старая, я не адступлюся».*

ШАПТУХА. Мо сам нячысцік прыйшоў па маю душу? *(Забегала па хаце.)* Малітву трэба ўспомніць. Як жа гэта... Во! Ойча наш... Не слухала мамку, ой не слухала! Не любіла ні вучыцца, ні маліцца.

*З грукатам расчыняюцца дзверы, урываюцца два дураслівыя ўнукі — Зух і Мух, рагочуць.*

ШАПТУХА. Унучкі! Дык гэта вы сваю бабулю грукатам палохалі! Я ж вам пакажу! *(Ганяецца за імі з выбівалкаю па хаце.)*
МУХ. Не дагоніш! Не дагоніш!
ШАПТУХА *(задыханая).* Люблю дураслівенькіх. Сама такою была. Ну, расказвайце, што новага.

ЗУХ. Дзень сягоння аніякі. Ні з кім не пабіўся, нікому ножку не падставіў, ні з кога не пасмяяўся — хіба што з цябе, бабуля.
МУХ *(указвае на брата)*. А яго на вуліцы ледзь твой аўчар не пакусаў. Ён за ім ганяўся.
ШАПТУХА *(да Зуха)*. Сабака за табой?
ЗУХ. Я за сабакам.
ШАПТУХА. Вось гэта па-нашаму.
МУХ *(разглядвае сцены)*. Бабуля, а нашто табе столькі зёлак сушаных? Што ты з імі робіш?
ШАПТУХА. Многа будзеш ведаць — рана састарэеш.
ЗУХ. А ты ў нас, выпадкам, не ведзьма?
ШАПТУХА. Я, унучкі, ніякая не ведзьма, а звычайная вясковая чараўніца. Паўтарыце.
БРАТЫ *(разам)*. Ча-раў-ні-ца.
ШАПТУХА. Правільна. Таму і завуць мяне Шаптухай. На ваду шапчу, хваробы загаворваю. А зараз вам заданне, унучкі дарагія: злавіце майго прыблуднага сабаку і пастарайцеся дамоў прывесці. Каб я ніякіх стукаў-грукаў не баялася.
МУХ. А дзе малая?
ШАПТУХА. На вышках яна. Адбывае пакаранне.
МУХ. Ведаем. У каралеўну там гуляе. *(Гукае.)* Эй, каралеўна!
ЗУХ *(брату)*. Давай і яе папужаем.
ШАПТУХА *(грозна)*. Дзе мая выбівалка?
МУХ. Мы толькі зірнём, як яна там. Адным вочкам.

*Браты лезуць на вышкі, таўхаюцца, пакуль Мух не зваліўся. Зух падняў вечка — і з крыкам скаціўся ў хату.*

ЗУХ. Там... Там нехта ёсць. Ці то хлопец, ці то дзед.
ШАПТУХА. Наш дзед, царства яму нябеснае, дзесяць год як у лепшым свеце. Здалося табе. Там нікога, акрамя Янінкі, быць не можа.
МУХ. Форменныя глюкі.
ЗУХ. Сам паглядзі. Што, слабо?
ШАПТУХА *(кліча)*. Янінка! *(Чакае адказу, потым грукае ў столь чапялою.)* Выходзь, я ўжо адпусцілася!
ЗУХ *(пашаптаўшыся з братам)*. А што нам будзе за тое, што сабаку твайго вернем?
МУХ. Рынкавыя адносіны, сама разумееш.
ШАПТУХА. Чула, чула... Тэлевізар гляджу.

*Зух раптам абсыпае бабку з хлапушкі, а Мух запальвае бенгальскі агонь.*

ШАПТУХА. Свят-свят, чур мяне… Ай, шкоднікі! Ну, мала вам не будзе! Яшчэ хату спаліце!

*Унукі задаволена рагочуць.*

ШАПТУХА. Пагасцілі, унучкі дарагія, і хопіць. Вымятайцеся.
МУХ. А цукеркі?
ЗУХ. А шакаладкі?
ШАПТУХА. Наце пачастунак ды ідзіце. *(Дае па шакаладцы.)* Я ад вас стамілася, ды і позна ўжо. *(Выпраўляе, зноў кліча.)* Янінка! Напалохалі старую. Ваду ад спуду загавару. *(Шэпча на шклянку з вадой.)*

*Адкрываецца вечка — і па лесвіцы паволі, важна спускаецца Янінка. Яе валосікі распушчаны, а на галаве відаць маленькая бліскучая карона. Бабуля войкнула і пляснула рукамі.*

ШАПТУХА. Авоечкі, адкуль гэта ў цябе?
ЯНІНКА. Гэта? А-а, гэта мне панасіць далі.

**Карціна 3**

*Янінка вешае на дрэва дзве кармушкі з поліэтыленавых бутэлек. З-за плота чуваць ціхае завыванне.*

ЯНІНКА. Хто там? *(Зазірае за плот.)*

*Там ляжыць, скруціўшыся, Шэры і трасецца ад холаду.*

ЯНІНКА. Шэры, ты?
ШЭРЫ. А то сама не бачыш…
ЯНІНКА. А я цябе па ўсёй вёсцы шукала. *(Узіраецца.)* А чаму ў цябе вяроўка на шыі?
ШЭРЫ. Позна вечарам ад брацікаў-злыдняў адбіваўся.
ЯНІНКА. Чула я, як яны бабулю палохалі. *(Сыпле ў кармушкі корм.)* А што са мною ўчора было!.. Выходзь, раскажу.

*Шэры выходзіць з-за плота, азіраючыся.*

*Чуваць голас бабы Шаптухі.*

ШАПТУХА. Цю-цю-цю...
ШЭРЫ. Ой, бабуля!... Мяне няма і не было. *(Хаваецца за дрэва.)*

*З'яўляецца Шаптуха.*

ШАПТУХА. Зноў на птушак проса пераводзіш?
ЯНІНКА. Дык жа халодна ім. *(Паўза.)* Мне здаецца, што я сама некалі птушкай была. Сінічкаю.
ШАПТУХА. Ну, а я тады варонай. *(Азіраецца.)* Шэры табе на вочы не трапляўся?
ЯНІНКА. Не-а. Не відаць нідзе.
ШАПТУХА. Выкарміла, выгадавала, называецца... А-а-а... *(Махнула рукой.)* Аднолькавая падзяка — што ад людзей, што ад жывёлы. *(Пайшла.)*

*Шэры паказваецца з-за дрэва.*

ШЭРЫ. Ні-ко-лі. Ні-за-вошта ў яе жыць не буду. Лепей на сметніках карміцца.
ЯНІНКА. Ёсць ідэя, Шэры. Пойдзем да нашай суседкі цёткі Насты. Яна адзінокая, даўно хацела сабаку вартавога завесці.
ШЭРЫ *(круціць галавою).* Не-а. Блізка ад нашай бабы.
ЯНІНКА. Затое я цябе праведваць буду. Костачкі насіць...
ШЭРЫ. Падумаць трэба.
ЯНІНКА. Цётцы скажам, што бабуля цябе сама выгнала і ты цяпер нічыйны. Ты ж і праўда — нічыйны?
ШЭРЫ. Яно-то праўда... *(Падскаквае ад холаду, робіць практыкаванні.)* Галодны, затое вольны. У будку не вельмі хочацца... Ды што зробіш... Мы, сабакі, народ залежны. *(Ідзе за дзяўчынкай.)*

## Карціна 4

*Двор цёткі Насты, калодзеж, будка пры сцяне гумна. Цёмна, вые вецер. На прывязі Шэры.*

ШЭРЫ. Ноч аддзяжуру, а там адвяжуць. Не першы раз. Але ж холад бярэцца — проста сабачы. *(Бегае туды-сюды.)*

*За ім сочаць Зух і Мух,*

МУХ. Укусіць ці не?
ЗУХ. А ты правер — падыдзі бліжэй.
МУХ. Сам правер.
ЗУХ. У нашай бабкі ён паслухмяны быў, ціхі. Як мыш пад венікам.
МУХ. Што як зноў не дасца?
ЗУХ. Дзе дзенецца... Але давай яго перш пацкуём, падражнім.
МУХ. Ты, браток, што ні прыдумаеш — дабром не канчаецца.
ЗУХ. Ну, пачалі. *(Падступаюць з двух бакоў.)*

*Сабака насцярожыўся, перш схаваўся за будку, потым выскачыў — і схапіў Муха за каўнер.*

МУХ *(на Зуха).* Гэта ён мяне падвучыў! Ён!
ШЭРЫ *(Зуху).* Чаму брата не ратуеш?
ЗУХ *(здалёк).* Яшчэ чаго! Сам адпусціш, калі трымаць і надакучыць.
ШЭРЫ *(падазрона).* А чаго вы тут у цемры блукаеце?
ЗУХ. Пяты кут шукаем.
МУХ *(просіцца).* Пусці, псіна.
ШЭРЫ. Я не псіна, імя маю.
МУХ. Пусці, а то я бабулю нашу паклічу. Ой, пападзе табе!.. Ды яшчэ і верне на гістарычную радзіму. *(Глядзіць угару.)* Хараша як... Паглядзі, Шэры, якая ў небе зорачка міргае!

*Сабака загледзеўся, Мух, скарыстаўшы паўзу, вырваўся і адбег. Браты рагочуць, а потым селі воддаль на калоду.*

ЗУХ. Але сабачая ў цябе служба, Шэры, — цэлую ноч на двары кантавацца.
ШЭРЫ. Я не кантуюся, я карысную справу раблю — двор і хату вартую.
МУХ. А хто яе возьме, вашу хату? У кожнага свая *(рагочуць).*
ЗУХ. Жарты жартамі, але мы да цябе па справе. Вяртайся да нашай бабулі, яна табе даравала.
ШЭРЫ. Што даравала — для яе ж самой добра. А я ад новай гаспадыні нікуды не пайду.
ЗУХ. А хочаш, мы цябе адвяжам, а? Па вуліцы хадзілі б разам, шкоду рабілі б...
ШЭРЫ. А што такое шкода?

ЗУХ. Ну, гэта калі... *(Брату.)* Ты растлумач. Малады яшчэ, не разумее...
МУХ. Слухай. Прыйшлі да вас, скажам, госці, а ты ўзяў ды пагрыз чужы чаравік. Гэта і будзе шкода.
ШЭРЫ. А-а-а, зразумеў. Але якая ад шкоды радасць? Гаспадыня тапкам наб'е.

*Браты пераглядваюцца і паціскаюць плячыма.*
*Чуваць моцны гук — гэта пачынае раскручвацца ланцуг калодзежа. Грыміць вядро.*

ЗУХ. А ну, гайда адсюль! *(Хлопцы ўцякаюць.)*
ШЭРЫ. Зноў некага прынесла...

*Нечая рука пачынае шчыкатаць яго саломінай. Шэры скокнуў — і выцягнуў з-за будкі Гуменніка, той супраціўляецца.*

ГУМЕННІК. Жартаў не разумееш?
ШЭРЫ. Ты хто такі? Што тут робіш позні́м часам?
ГУМЕННІК. Скажу, як адпусціш.
ШЭРЫ *(прыглядзеўся).* Рэдкая здабыча. І не чалавек, і на звера не падобны...
ГУМЕННІК. Цішэй гавары, зараз сюды прыйдуць.
ШЭРЫ. Тут я вартую.
ГУМЕННІК. Ты вартуеш тры дні, а я 33 гады.
ШЭРЫ. Колькі, колькі? *(Адпускае яго.)*
ГУМЕННІК. Вось так лепей. *(Садзіцца на прыступку лесвіцы.)* Жыву я ў гумне, паказваюся толькі як сцямнее, і то не ўсім. А завуць мяне Гуменнік. *(Чутны крокі.)* Хавайся!

*Шэры схаваўся за будку. Ідзе Шаптуха.*

*ШАПТУХА (сабе).* Усе ведаюць: старая Шаптуха яшчэ нікому крыўды не спусціла. Пераманіць! Майго сабаку! *(Азіраецца.)* Няма яго тут. І добранька *(паціраe рукі).* Пачнём. Усе, як у кніжцы напісана. *(Дастае з кішэні іголку.)* Значыцца, так: апоўначы ўваткнуць у вушак загаворaную іголку і тройчы прамовіць праклён. *(Утыкае іголку.)*

*Гуменнік як закрычыць пеўнем — баба з перапуду войкнула і асела на ганак.*

ШАПТУХА. Авой, нячысцік, цьфу, цьфу...
ГУМЕННІК *(паказваецца).* Ну што, варажбітка, папалася?
ШАПТУХА. Чур мяне, чур мяне...
ГУМЕННІК. Дык якую шкоду ты надумала ўчыніць маёй гаспадыні?
ШАПТУХА. Х... х... хваробу маленечкую. І ўсё. Во, бажуся! *(Хрысціцца.)*
ГУМЕННІК. А хто ўвесну яе карову на полі сурочыў?
ШАПТУХА. Не я гэта! Не я!
ГУМЕННІК. Даўно за табой, бабка, назіраю. Ой не падабаешся ты мне... Ой не падабаешся... Вока ў цябе завідушчае, нядобрае...
ШАПТУХА. А чаго вашы куры на мае грады хадзілі, а? Усе агуркі спляжылі! *(Спрабуе падняцца, але не здолела.)* Што гэта са мной?
ГУМЕННІК. Рыхтуйся, баба. Хоць я і не злосны, але будзеш пакарана. *(Падступае.)*
ШАПТУХА. Ратуйце! Рэжуць! Тэрарысты!
ШЭРЫ *(выходзячы са схову).* Дзе тут тэрарысты?
ШАПТУХА. Цюцька мой дарагі, заступіся! Не ўцямлю, чаго ён уз'еўся на мяне. А помніш, як я цябе маленькага на дарозе знайшла? Выкарміла, выхадзіла... Заступіся!
ШЭРЫ. Доўга служыў я табе, але болей не магу: злому служыць — душу загубіць.
ГУМЕННІК *(Шаптусе).* Хочаш скажу, пра што ты зараз думаеш?
ШАПТУХА. Не лезь у мае думкі! *(Зноў спрабуе падняцца.)* Ой, ногі не слухаюцца...
ГУМЕННІК. Ты ж за вушак бралася, а ён з загаворанай іголкай. Вось сама сябе і пакарала.

*Паказваюцца Зух і Мух, Гуменнік і Шэры хаваюцца.*

ШАПТУХА *(працягвае рукі).* Унучкі! Унучачкі мае!
МУХ. Бабуля, што ты тут робіш?
ШАПТУХА. Ай-я-яй, на старасці з розуму выжыла...
ЗУХ. Такой парой... На чужым двары...
ШАПТУХА *(рукі ўбокі).* Пара як пара — сонца нядаўна села. А што вы тут, даражэнькія, згубілі?
МУХ *(глядзіць пад ногі).* Згубілі, ага, згубілі... *(Брату.)* Лепей глядзі, мо бліснe.
ЗУХ *(падхоплівае гульню).* Такую рэч клёвую пасеялі...
ШАПТУХА. Зноў падманваюць, дурацъ старую! Зараз, зараз я вам... *(Не можа скрануцца з месца.)*
МУХ. Ці не прымерзла ты да ганка, бабуля?

ЗУХ. Дрэнь справы.
ШАПТУХА *(галосіць).* А ножанькі вы мае, а быстрыя...
МУХ. Так бы і сказала, што ногі адняліся. *(Бяруць яе пад рукі і спрабуюць несці.)*
ЗУХ. На выгляд — божы адуванчык, а не падняць!
МУХ. Я прыдумаў: на санках яе дадому завязём.
ЗУХ. Правільна. Санкі возьмем... *(Разам.)* У суседзяў! *(Бабулі.)* Пачакай, мы мігам. *(Знікаюць.)*

*Паказваецца Гуменнік.*

ГУМЕННІК. Праўду кажуць: не рый другому яму — сам увалішся. *(Кліча сабаку.)* Шэры, выходзь. Давай мы і братоў заадно правучым.

*Гуменнік штосьці шэпча і робіць рухі рукамі.*

ГУМЕННІК. Ну вось. Цяпер яна да раніцы маўчаць будзе і стане лёгкай, як пёрка. *(Бярэ бабулю на плячо, як куль саломы, і нясе з двара.)*

*Шэры важна ходзіць каля будкі. З'яўляюцца задаволеныя браты з санкамі.*

ЗУХ. Хоць адну добрую справу зробім.
МУХ. Шакаладкай не абыдзецца. Можа, плейер абломіцца.

*Глядзяць, а бабулі няма. Мух праціраее вочы.*

ЗУХ *(Шэраму).* Ты нашай бабкі не бачыў?
ШЭРЫ. Дзе?
ЗУХ. На ганку.
ШЭРЫ. Не-а. Я спаў у будцы.
МУХ. Вартаўнік называецца...
ШЭРЫ. А што яна тут рабіла? А? Падазрона. Ды і вы не проста так прыйшлі. На чужы двор, з чужымі санкамі...
МУХ *(брату).* І куды яна магла падзецца?
ЗУХ. Мабыць, у яе ногі на месца сталі.
МУХ. Дарма санкі свіснулі.
ШЭРЫ. Кажаце, я дрэнны вартаўнік? Зараз пабачыце. *(Ганяецца за імі з брэхам.)*

ЗУХ. Выключы сігналізацыю!

*Тым часам Гуменнік залазіць на канёк гумна і задаволена пацірае рукі.*

МУХ. Гляньце! Гляньце! Чорт сядзіць!

## Карціна 5

*Вышкі. На двары дзень, а тут прыцемкі. Павуцінне. На бэльцы вісяць старыя валёнкі. Янінка захуталася ў посцілку ды гуляе сама з сабой.*

ЯНІНКА. Ну, у што сёння гуляем? У каралеўну. *(Завязвае посцілку вакол шыі, як мантыю.)* А маім слугою будзе Мішка. *(Выпорвае плюшавага мядзведзіка.)* Ану, слуга, прынясі мне кілаграм цукерак і два тарты з крэмам! Ды хутчэй. Толькі цукеркі каб з вафелькамі былі! *(Чуваць шолах за комінам.)* Ой, мышы!
ГОЛАС ГУМЕННІКА. Я гэта, каралеўна, я!
ЯНІНКА *(уваходзіць у ролю).* Ну вось, нарэшце з'явіўся. Ды яшчэ сядзіць за комінам і не паказваецца.
ГОЛАС ГУМЕННІКА. Баюся напалохаць сваю каралеўну.
ЯНІНКА. Думаеш, я баязліўка? *(Паўза.)* Ты чаго замоўк?
ГОЛАС ГУМЕННІКА. Вецер слухаю.
ЯНІНКА. Ага, завывае. А давай разам слухаць. Выйдзеш з-за коміна?

*Гуменнік паказваецца.*

ГУМЕННІК. Дзень добры, каралеўна! *(Кланяецца.)*
ЯНІНКА. І весткі добрыя: я прызначаю вас маім першым дарадчыкам. Але чаму вы так доўга не прыходзілі?
ГУМЕННІК. Мушу напомніць, што я жыву на суседняй сядзібе, а сюды...
ЯНІНКА. Ведаю, ведаю... Сюды вы прыходзіце... Як бабуля кажа? Гады ў рады. У госці. *(Схамянулася.)* А пачастунак для госця дзе? Адны семкі. *(Абняла мядзведзіка, задумалася.)* А праўда, што я малою ледзь у калодзеж не ўвалілася?
ГУМЕННІК. Было такое... Цябе мой брат, Лазеннік, выцягнуў.
ЯНІНКА. А дзе ён цяпер?
ГУМЕННІК *(сумна).* Няма нікога — ні Лазенніка, ні Хлеўніка, ні нават Дамавіка. Я за усіх тут, адзін...

ЯНІНКА. А мамку маю ты помніш?
ГУМЕННІК. А як жа. Добрая была, усё галубоў на дварэ карміла. Я сам бачыў, як анёлы яе душу на неба панеслі.
ЯНІНКА. А якой я была — маленькай?
ГУМЕННІК. Ты была...
ЯНІНКА. Ну?
ГУМЕННІК. Ты была... *(Паўза.)* Янінка, так нецікава. Звычайна ты прыдумвала гульні, а сёння...
ЯНІНКА *(скідае «мантыю»).* А сёння я хачу пагаварыць. Хачу даведацца, якой бывае сапраўдная каралеўна.
ГУМЕННІК. Каралеўна? *(Паўза.)* Ну... *(Чухае патыліцу.)* Сапраўдная каралеўна... Першае: не дае сябе крыўдзіць. Другое: велікадушна даруе таму, хто яе пакрыўдзіў. Трэцяе: слухае свой унутраны голас.
ЯНІНКА. Які голас?
ГУМЕННІК. І апошняе: яна заўсёды гатова сесці на каня — і...
ЯНІНКА. Што — і?
ГУМЕННІК. Скакаць, скакаць, скакаць...
ЯНІНКА. Куды?
ГУМЕННІК *(яўна зайшоў у тупік).* Туды... Туды, дзе яе чакае прынц. Во!
ЯНІНКА *(не адразу).* Я паскакала б, але ў нас ёсць толькі карова. І ўвогуле... Хопіць гульняў, Гуменнік. Тут павуціна, пыл... І карона мая, да таго ж, згубілася.
ГУМЕННІК. Гэта не важна.
ЯНІНКА. Ну ты і скажаш — «не важна»! Хіба бывае каралеўна без кароны?
ГУМЕННІК. Бывае. Твая карона заўсёды пры табе. Спінку выпрастала?
ЯНІНКА. Выпрастала.
ГУМЕННІК. Галоўку падняла?
ЯНІНКА. Падняла.
ГУМЕННІК. А цяпер — я запрашаю цябе, каралеўна, на танец.

*Яны танцуюць танга, павуціна ператварылася ў цудоўныя празрыстыя тканіны, валёнкі зніклі, а замест посцілкі на дзяўчынцы — атласная накідка.*

## Карціна 6

*Хата бабы Шаптухі. Гаспадыня ўжо апрытомнела, але яшчэ ў ложку. Янінка падносіць ёй кубак з напоем.*

ЯНІНКА. Табе ўжо лепей, бабуля?
ШАПТУХА *(жаласна).* Унучачка мая дарагая... Памочніца мая залатая...
ЯНІНКА. А што з табой здарылася ўчора?
ШАПТУХА. Паслізнулася на дварэ, упала, галаву аб лёд пабіла...
ЯНІНКА. А мой унутраны голас падказвае, што ты гаворыш няпраўду.
ШАПТУХА. Які яшчэ голас?
ЯНІНКА. Зноў тоўстую кнігу з паліцы даставала? Не падабаецца мне гэта кніга, ой не падабаецца...
ШАПТУХА. Ад прабабкі яна засталася. Прабабку, праўда, уся вёска баялася... Чарнакніжніцай яе звалі...
ЯНІНКА. Паспі, бабуля. А я печ дапалю.

*Бабуля засынае, а Янінка падстаўляе табурэт і дастае з паліцы тоўстую кнігу. Нясе ў руцэ на адлёце, як жабу, а потым кідае ў печ. Адтуль як паверне дым, як завые вецер у коміне!.. Раптам усё сціхла. Раздаецца стук у дзверы.*
*Янінка адчыняе — гэта Суседка. Шаптуха прахапілася.*

СУСЕДКА. Добрай раніцы, суседачка.
ШАПТУХА. А-а, ты, Наста... Праходзь. Янінка, падай на што сесці.
СУСЕДКА *(садзіцца пры ложку).* Занядужала, бачу?
ШАПТУХА. Вой, зусім сілы нямашака.
СУСЕДКА. Я табе мядку прынесла. *(Ставіць на стол слоічак.)* Мусіць, ты з-за сабакі свайго перажываеш. Дык ён жа з вуліцы да мяне прыйшоў, пашкадавала я яго...
ШАПТУХА *(выцірае слязу).* А мне хіба не шкада? Маленькага знайшла, худзенькага... На Каляды... У шапачцы змяшчаўся.
СУСЕДКА. Яго ж не ты адна — і ўнукі твае, бейбусы, крыўдзілі. Чаму ж ты іх у строгасці не трымала?
ШАПТУХА. Ой, твая праўда, суседка: раздурыла дык раздурыла...

*Заходзяць Зух і Мух, яны вядуць Шэрага, той упіраецца.*

ЗУХ. Прымай, бабуля.

ШАПТУХА *(спрытна выкулілася з ложка).* А сабачка жы ты мой даражэнькі!.. *(Унучцы.)* Чаго стаіш, есці не нясеш нашаму цюцьку залатому?
ЯНІНКА. Нешта ўсе ў цябе залатыя сёння... А заўтра як? Будзеш, бабуля, чапіцца — сыду і я да цёткі Насты.
СУСЕДКА *(падміргвае дзяўчынцы).* Сыдзе, далібог сыдзе!
ШАПТУХА *(кланяецца ім у пояс).* Даруйце мне, Бог і людзі!
МУХ. Вачам не веру... Добранька-раздобранька!
ЗУХ. З'ехала з катушак наша бабця.
ЯНІНКА. Наадварот — уз'ехала. *(Паўза.)* А давайце ў Шэрага спытаем — застанешся з намі, Шэры, ці не?
ШЭРЫ. Гаў!
ТТТАПТУХА *(з палёгкай, у залу).* Ну вось, сабака як сабака. Зняліся чары.
ЯНІНКА. Але я не разумею: «гаў» — гэта «так» ці «не»?
ЗУХ і МУХ *(разам).* Так!
СУСЕДКА. Ну, калі так — мне чужога не трэба. *(Пайшла.)*
ШАПТУХА. Казала мне матуля: лячыць — лячы, а варажыць ды чараваць — бойся...
ЯНІНКА. Бабуля, а ад чаго дзівасіл п'юць?
ШАПТУХА. Пра ўсе зёлкі табе раскажу. І пра дзівасіл, і пра крываўнік, і боль зубны знімаць навучу.
ЗУХ *(брату).* Хадзем, бо тут як у аптэцы. *(Выходзяць.)*
ШАПТУХА *(услед).* А шакаладку? *(Углядаецца ў Янінку.)* Але ж і прыгожая ты ў мяне дзяўчынка... Каралеўна проста!

*Шэры падышоў і даверліва паклаў галаву бабулі на калені.*

**Канец**

**Ад радасці да суму — толькі крок.**
**Ад суму і да радасці — паўкрока.**
**Жыццё, табе я ўдзячна за ўрок**
**І за парыў да лепшага высокі.**

## ЛЮБОЎ ЗА ЎСЁ МАЦНЕЙ

Сцэнічны абразок для батлейкі

Дзейныя асобы:

МУЖ.
ЖОНКА.
АНЁЛ-АХОЎНІК.
ЧОРЦІК.
СМЕРЦЬ.

*Верхні ярус. Маладая Жонка калыша на руках дзіцятка.*

ЖОНКА *(спявае).* «Люлі, люлі, люлі, дзеткі ўсе паснулі»... Позна ўжо, а таткі нашага няма. На рабоце, мабыць, затрымаўся. Працавіты ён у нас. І ты, сынок, гэткім вырасцеш... «Люлі, люлі, люлі спаць, а я буду калыхаць. Прыйдзе шэранькі ваўчок...».

*Ніжні ярус. Мужчына выходзіць з дзвярэй, на якіх напісана «ГАРАЖ». Зіма, сыплецца снег.*

МУЖ. Цяжкі сёння дзень выдаўся. Ну нічога, не ўпершыню. Работа ў нас такая. *(Паўза.)* Можа, у краму зайсці па дарозе? Піўца куплю ды і хлеба заадно, жонка прасіла.
АНЁЛ *(з правага боку).* Лепей без піва абысціся. Галава будзе цяжкай, вочы — мутнымі... Спаць адразу завалішся, з сыночкам не пагуляеш...
ЧОРЦІК *(з левага боку).* Ой і смачнае ж яно, піва... «Старажытнае» возьмеш ці «Балтыку» нумар восем. Пеністае, хмельнае... Адну бутэлечку не грэх кульнуць.
МУЖ. Праўду кажаш. Адну, для расслабону толькі — і дадому, у цяпло, да мілай маёй жоначкі.
ЧОРЦІК. Хі-хі! Усё па плану, усё як я хачу! *(Скача ад радасці.)*

*Верхні ярус. Жонка вешае пялёнкі ды распашонкі.*

ЖОНКА. Дзе ж ён? Хлеба на вячэру няма, хоць бы не забыўся купіць. Мабыць, зноў сваім півам накачаецца...
АНЁЛ *(збоку).* Не думай кепскага, жанчына!
ЖОНКА. Столькі хлопцаў заляцалася, а я яго чамусьці выбрала. От падабаўся — і ўсё. Сэрцу, кажуць, не загадаеш...
АНЁЛ. Ты ж пакахала яго, і ён да цябе прыкіпеў, а з каханнем вы ўсё пераадолееце. Толькі не трэба сумнявацца. Маліся, кліч архангела Міхаіла!
ЖОНКА. Забыўся пра нас Бог, няйначай...

*Ніжні ярус. Муж выцірае вусы, пагладжвае жывот. З кішэні курткі відаць бутэлька.*

МУЖ. Ой, адразу лепей стала... Зусім другі настрой. Да сябрука наведацца, ці што?

ЧОРЦІК *(прыхаваўшыся, сабе).* Здорава! У нас на дзве галавы адна думка!
АНЁЛ *(спяшаючы на дапамогу).* Позна ўжо! Цябе жонка чакае з малым дзіцем, непакоіцца. Ды і сябра твой ужо спаць кладзецца.
МУЖ *(весела).* А я яму — тук-тук. Хто там? Паштальён Печкін. Толькі не запіску прынёс, а беленькай бутэлечку. Я што, дазволіць сабе не магу? Мы з сябруком у адным класе вучыліся, за адной партай сядзелі. Жукоў майскіх лавілі ды дзяўчат палохалі. Пайду!
АНЁЛ *(у залу).* Вы створаны свабоднымі і выбіраеце самі — якой пайсці дарогай, служыць дабру ці злу.

*Верхні ярус. Жонка горка плача, дзіця заліваецца ўслед за ёй.*

ЖОНКА. А дзіцятачка ж маё… Каб хаця сіратою табе не застацца…
ЧОРЦІК *(дражніць).* У-у-у! У-у-у! Развяла сырасць. Гэткай бяды — мужык да сябра ў госці падаўся. Падумаеш, чарку-другую перакуліць… Дом жа не турма, каб сядзець тут бязвылазна. *(Спявае.)* «Ой ты, жыццё-маркота, жыў бы, каб не лянота…»

*Ніжні ярус. Муж улукаткі брыдзе па вуліцы, гараць ліхтары.*

МУЖ. Вось і дом відаць. Акно наша свеціцца. Яшчэ б наверх піўца для шліфоўкі — і поўны парадак. Спявае «Ой, мароз, мароз, не марозь міня…»
АНЁЛ. А мароз сапраўды бярэцца, да касцей прабірае. Сцеражыся, чалавеча!
МУЖ. Перабраў трохі, сам бачу. Ну і што? Я рабацяга, на працы мяне паважаюць. А што выпіць люблю — такой бяды… Прасплюся — і такі самы.
СМЕРЦЬ *(выглядваючы, Чорціку).* Мой кандыдат.
ЧОРЦІК. Любім мы на гатовенькае прыперціся.
СМЕРЦЬ. Бачу, што стараешся. Прэмію квартальную выпішу.
ЧОРЦІК. Каторы раз абяцаеш.
СМЕРЦЬ. Т-сс… Цішэй! *(Паднімае касу.)* Яны ўсе мае — тыя, што меры не знаюць. Дзе гарэліца, там і бяда. Там муж на жонку, сын на бацьку, брат на брата паднімаецца.
ЧОРЦІК. Сам ведаю. Многа каго перасварыў і на той свет адправіў. А ад цябе нават «дзякуй» не дачакаешся. Звольнюся к чорту! На пенсію пайду!

СМЕРЦЬ *(смяецца).* На пенсію... Ха-ха-ха! Напрацаваўся ён... Я вунь колькі касой махаю — і яшчэ як маладзенькая. *(Паўза.)* Глядзі, наш скора дасца.

*Муж абапёрся аб ліхтарны слуп, потым аб'ехаў. Спрабуе спяваць: «Ой, мароз, мароз...» Нерухома ляжыць. Нідзе ні душы, толькі завывае вецер.*

СМЕРЦЬ *(Чорціку).* Хадзем, мы сваю справу зрабілі. (*Абняўшыся, знікаюць.)*

*Прыляцеў Анёл, мітусіцца, спрабуе падняць чалавека, а потым кідаецца да жонкі. Тая накідвае цёплую хусту і бяжыць на вуліцу.*

ЖОНКА. Любы мой! Я так і ведала, што з табою штосьці кепскае здарылася. Сэрцам адчувала... *(Паднімае мужа.)* Уставай, пойдзем. Я з табою. *(Вядзе.)* Цяпер усё будзе добра.

*Верхні ярус. Муж сядзіць у крэсле з забінтаванымі рукамі. Жонка корміць яго, як малога.*

ЖОНКА. З'еш яшчэ дранічка. Смачненькія... Вось і цудоўна. А зараз з сыночкам нашым пагуляй. *(Садзіць дзіця Мужу на калені, Анёл забаўляе таго бразготкай.)*
ЧОРЦІК *(выглядваючы).* Кідай ты яго, дурніца! Навошта табе гэты калека?
ЖОНКА. Акыш, паганы! *(Праганяе таго ручніком.)*
СМЕРЦЬ *(знізу).* Упусціла!.. Праваронiла!.. *(Рве валасы на галаве.)*
АНЁЛ *(дэкламуе).* Я знаю: між людзей
Любоў за ўсё мацней!

*Урачыстая мелодыя К. Орфа з балета «Карміна Бурана».*

**Канец**

**УСІМ ГУД БАЙ!**

П'еса-мініяцюра

Дзейныя асобы:

БАЦЬКА.
ДАЧКА.
СЯБРОЎКА.
МАЦІ.

*Дзеянне адбываецца ўзімку. Зала звычайнай гарадской кватэры. Трумо, чырвоны дыван на сцяне, баксёрскія рукавіцы на цвіку. Відаць дзверы ў два сумежныя пакоі. Туды-сюды бегае Дачка, дзяўчына ў кароткім халаціку і з ручніком на галаве, — збіраецца.*
*Заходзіць Бацька. Перш выглянуў з сімвалічнай прахожай, пасля, не распранаючыся, прысеў на банкетку пры ўваходзе. Нядобра назірае за зборамі.*

ДАЧКА. Рана ты нешта...
БАЦЬКА. Намылілася, бачу...
ДАЧКА. Я на гадзінку.
БАЦЬКА. За гадзінку ты толькі да вакзала даедзеш.

*Дачка сушыць галаву фенам.*

БАЦЬКА. Як на стрэлку, дык сваім ходам. А як дадому, дык вязуць, як каралеву, на таксоўцы.
ДАЧКА. Ты зноў пад півам? Ці пад белай?
БАЦЬКА. Пад зялёнай.
ДАЧКА. Званіла маці. Яна мне дазволіла да васьмі.
БАЦЬКА *(павышаючы голас)*. А я не дазваляю! *(Устае, здымае куртку.)* Ні да васьмі, ні да сямі! Будзеш дома.
ДАЧКА. Я абяцала!
БАЦЬКА. Пераб'ецца.
ДАЧКА *(ледзь не плачучы)*. Ён будзе чакаць!
БАЦЬКА. Я таксама чакаў, як быў нежанаты. Твая маці ні на адну спатканку воўрамя не прыйшла.

*Дачка выбягае ў свой пакой.*

ДАЧКА *(з пакоя)*. Усё роўна паеду!
БАЦЬКА. Няма такога закона, каб роднага бацькі не слухацца. *(Ідзе ў свой пакой.)*

*Выбягае дачка, расчэсваецца перад трумо, потым гаворыць па сотавым.*

ДАЧКА *(ціха)*. Таня? Завал. Ён не пускае. А што я зраблю? Так, пад мухай. Прыязджай. Так. Пакуль.

*Дачка наводзіць марафет. Выходзіць Бацька ў спартыўных штанах і клятчастай кашулі.*

БАЦЬКА. Сказаў — не паедзеш! Толькі чурак у нашым раду не хапала!
ДАЧКА. Сам ты... Сам... нярускі!
БАЦЬКА. Я нярускі? А хто ж тады я?
ДАЧКА. Хто-хто... Беларус, вось ты хто.
БАЦЬКА. Ты мне мазгі не пудры. Усе мы рускія. То есць славяне. І як-небудзь абыдземся без граждан арабскай нацыянальнасці.

*Дачка рагоча.*

БАЦЬКА. Панаязджаюць... На дармавую вучобу... Сваіх інсцітутаў у іх няма. Не, нашы смачнейшыя! І дзеўкі, і інсцітуты... Мёдам ім тут намазана. Павучацца, павучацца, а пасля нам унукаў гадуй чарнамазенькіх...
ДАЧКА. Замаўчы! Я маме ўсё раскажу! *(Пабегла ў свой пакой.)*

*Званок у дзверы. Бацька адчыняе. Заходзіць Сяброўка.*

СЯБРОЎКА. Ларыса дома?
БАЦЬКА. Пераводчыкаў мы не вызывалі.

*З'яўляецца апранутая на выхад Дачка.*

ДАЧКА. Прывет. Праходзь, не стой у парозе. Я зараз.
БАЦЬКА. Панаязджаюць... Галовы дурацць нашым кралям. А гэтыя і рады. Быццам сваіх хлопцаў мала.
ДАЧКА. Свае без мата слова сказаць не могуць.
СЯБРОЎКА. Правільна. *(Расшпіліўшыся, прысаджваецца на банкетку.)*
БАЦЬКА *(Дачцы)*. Культу-урна-ая... Першы курс скора агорае. Каб свінчо каму трэба з вёскі не падвезлі...
ДАЧКА. Ой, чула я гэту песню! Я і сама паступіла б — здала на прахадны бал.
БАЦЬКА. Прывыклі ехаць на бацькавых плячах... От пасядзіш хоць вечар дома — будзеш ведаць.

*Дачка набірае нумар па сотавым, раве, як малая, у трубку.*

ДАЧКА. Мама-а-а... Ён не пускае да Маруана. А я абяцала. І Таня зайшла, мы ўтраіх будзем...
БАЦЬКА. Любоў утраіх. Ён, яна і пераводчыца. Во дзівосы! Во распуста!
ДАЧКА *(у трубку).* Пайду і не вярнуся... Калі такія... Мне 18, не малая. Магу галасаваць.
БАЦЬКА. Я табе пакажу — «не вярнуся»! Я табе прагаласую! *(Падаўся ў свой пакой і вяртаецца з рэменем.)*
ДАЧКА. Мама! Ён б'ецца!

*Выключае тэлефон, спрабуе ўцячы.*
*Паміж Бацькам і Дачкой становіцца Сяброўка.*

СЯБРОЎКА. Дзядзя Пеця... Вы што?
БАЦЬКА *(завёўшыся).* Не вернецца яна!
ДАЧКА. З дому сыду!
СЯБРОЎКА. Дзядзя Пеця!

*Бацька хвастануў-такі Дачку ніжэй спіны.*

ДАЧКА. Павешуся! *(Вылятае без паліто за дзверы.)*
БАЦЬКА. Ідзі праветрыся.
СЯБРОЎКА. Як вам не сорамна! Сыночка выхоўвайце — што дома не стыкаецца, з камп'ютэрнага клуба не вылазіць. Дачку!.. Дарослую!.. У наш час!

*Бацька кінуў рэмень сеў на канапу, астывае.*

СЯБРОЎКА. А я знаю, знаю, чаму вы Ларысу да Маруана не пускаеце. Хочаце, скажу? *(Паўза.)* Ды проста раўнуеце сваю дачку. Я чытала. Так бывае.
БАЦЬКА. Што-о-о??
СЯБРОЎКА. Падсвядомасць — яна як айсберг. Як тая частка айсберга, што над вадою. І там, у падсвядомасці...
БАЦЬКА. Вон!

*Усхопліваецца і зноў бярэцца за рэмень. Сяброўка адступае.*

СЯБРОЎКА. Пасмейце толькі! Я 02 набяру.

БАЦЬКА *(наступаючы).* Гэта ты іх звяла... Пераводчыца... Без цябе яны ні бэ, ні мэ паміж сабою...

*Заходзіць Маці — худзенькая, далікатная жанчынка ў доўгім прыталеным паліто, вядзе заплаканую Дачку.*

МАЦІ. Акалела ўся... Гаротніца. І я з гэтым сатрапам 20 год пражыла! Не пражыла — прамучылася... *(Сяброўцы.)* Прабач, Танечка. У нас такія сканадалы праз дзень.
БАЦЬКА. З'явілася... Добранькая. Разам на маіх плячах едзеце... На маіх грашах... А мне яны лёгка даюцца? Вы б цэлы дзень, як я, на марозе...
МАЦІ. Прычым тут грошы? Самадур! *(Дачцэ.)* Ну, хопіць, не плач. Няма чаго тут слёзы ліць. Лепей бы накарміла бацьку... З работы... Галодны...

*Сяброўка звоніць па сотавым, гаворыць па-англійску некалькі фраз:* «Мы ўжо едзем... Добра. Пакуль».

*У Дачкі імгненна высахлі слёзы, яна ўстрапянулася, прывяла сябе ў парадак і накідвае футрачку.*

ДАЧКА. Мамачка, я ненадоўга. Дай я цябе пацалую. *(Цалуе Маці, падыходзіць да прыгнечанага Бацькі, але загаварыць не рашаецца.)*
БАЦЬКА. Чаго табе?
ДАЧКА. Ты не думай... Я не злапамятная. Я разумею: ты проста баішся за мяне. Праўда? *(Сяброўцы.)* Хадзем, Танёк. Усім гуд бай!

*Сяброўкі знікаюць. Маці падыходзіць да Бацькі і прыціскае да грудзей яго схіленую галаву.*

**Канец**

## **ЯК ЛІСКА ЗАЙЦА АБДУРЫЛА**

Сцэнічны жарт для дарослых

Дзейныя асобы:

ЛІСКА РЫЖЫКАВА.
ЗАЙ БЯЛЕВІЧ.

*На палянцы восеньскага лесу мы бачым (у разрэзе) лазовы дамок Зая Бялевіча. Гаспадар у добрым гуморы рассеўся ў крэсле і чытае газету «Навіны лесу».*

ЗАЙ. Ну што ў нас новенькага? Так... Мядзведзя выбралі спікерам ляснога парламента... Даўно пара. Вавёрка стала эстраднай зоркай і развялася з мужам... Ліса шукае работу. *(Углядаецца.)* Не можа быць. Ліса? Хоча быць нянькай для куранят?! Ваўка, інспектара ДАІ, арыштавалі за хабар. Ну, калі іх за гэта арыштоўваць, то мы застанемся без...

*Нягучны стук у дзверы (яны адсоўваюцца уверх, як вароты ў гаража). Гэта Ліска Рыжыкава — з тых, што ў стане вечнай маладосці.*

ЗАЙ. Госці нібыта... *(Выглядае ў акно.)* О не, рыжую я не ўпушчу...
ЛІСКА. Адчыні, калі ласка. Я ж ведаю, што ты дома. Маю адну дужа дзелавую прапанову.
ЗАЙ. Ведаю я, Рыжыкава, твае прапановы. Усё роўна абдурыш.
ЛІСКА. Як кепска ты пра мяне думаеш. А мы з табой у адным класе вучыліся, за адной партай сядзелі...
ЗАЙ. Ну, сядзелі, ну і што? Бо ты на першай парце круцілася, вось цябе на галёрку і пасадзілі. Да мяне. І ты ўвесь час у мяне спісвала.
ЛІСКА *(убок).* І пяцёрачкі атрымлівала! *(Заю.)* Такая восень золкая... Зноў дождж пачынаецца, футрачка маё намокне... *(Абтрасаецца.)* А з мокрым футрам я падобна на бяздомную кошку.
ЗАЙ. Прабач, Рыжыкава, але я не вінаваты, што ты ніяк жытла сабе не збудуеш. Дарэчы, дзе ты падзела грошы, зробленыя на конкурсах прыгажосці? Ты ж на адным з іх другое месца заняла, наколькі мне вядома.
ЛІСКА. Ой, калі гэта было?! Ты б яшчэ мінулагодні снег успомніў.
ЗАЙ. Дарэчы, пра снег. Я адну рэч заўважыў: прыходзіш ты да мяне выключна з наступленнем халадоў.
ЛІСКА. Гэта проста жорстка — напамінаць мне пра зіму. *(Шморгае носам.)* Дазволь хоць нос пагрэць, Бялевіч.
ЗАЙ. Угаварыла. Але толькі нос, дамовіліся?

*Крыху паднімае дзверы. Ліса прасунула галаву ў праём і закрыла вочы ад асалоды.*

ЛІСКА. Ах, як у цябе хораша, як утульна... Мой нос табе дужа ўдзячны. Добрая ў цябе душа, Бялевіч!
ЗАЙ. Сам ведаю, што добрая.

*Уключае прыёмнік, гучыць лірычная мелодыя.*

ЛІСКА. А памятаеш, як мы на экскурсію ў пушчу ездзілі ды заблудзіліся там з табою?
ЗАЙ. Зубра спалохаліся...
ЛІСКА. Ты быў проста героем: стаў грудзьмі на маю абарону. Дай я табе за гэта лапу пацісну. *(Трасе Заю лапу.)* А лапу мне пагрэць можна? Адну толькі. Левую ці правую — выбірай.
ЗАЙ. Мабыць, лепей... Сам не ведаю, ад якой меней шкоды. Хай будзе левая.
ЛІСКА. Пашанцавала маёй левай лапе. Вязунчык яна ў мяне. Ты памятаеш, што я ляўша, а? *(Уздыхае.)* А правая крыўдзіцца.
ЗАЙ. Што?
ЛІСКА. Кажу, што правая мая лапка таксама хоча ў цяпло.
ЗАЙ. Так ты ўся сюды прасочышся.
ЛІСКА *(убок).* А няўжо ж... Абавязкова. *(Заю.)* Калі адна лапа цёплая, а другая халодная, то можа прыкінуцца запаленне.
ЗАЙ. Хітрасці запаленне, ці што...
ЛІСКА. Не, я сур'ёзна. А ты ведаеш, Бялевіч, дзе ў нас знаходзіцца «трэцяе вока»?
ЗАЙ. Не чуў я пра такое. *(Выключае прыёмнік.)*
ЛІСКА. Бось тут *(паказвае),* прама пасярод ілба.
ЗАЙ. Ну і што?
ЛІСКА *(хіхікае).* А тое, што мае лапкі хочуць быць разам. *(Залезла ў домік з лапамі.)*
ЗАЙ. Эй, Рыжыкава, мы так не дамаўляліся! А ну, вылазь. Вылазь, пакуль я харошы!
ЛІСКА. А хочаш, я табе па лапе пагадаю. Будучыню табе прадкажу.
ЗАЙ. Я і сам усё наперад ведаю. Хутка зіма будзе, а за ёй вясна.
ЛІСКА. Жыццё непрадказальнае, Бялевіч... Давай, давай лапу. *(Разглядае лапу зайца.)* Лінія жыцця ў цябе выразная, доўгая. Доўга жыць будзеш. А лінія розуму... *(Спахапілася.)* І яна ніштаватая. А вось наконт кар'еры не ўпэўнена. Мне здаецца, і кар'еру зробіш.
ЗАЙ. Маніш ты, рыжая.
ЛІСКА. Што ні кажы, а галоўнае — гэта асабістае жыццё. Сам ведаеш, у мяне яно не склалася. З мужам развялася, дзетак Бог не даў... А я,

між іншым, пірагі ўмею пячы. Не адну шарлотку, як некаторыя. З грыбамі, з яйкамі, з капустаю...
ЗАЙ. Капуста такой парою — дэфіцыт.
ЛІСКА. А я чаго прыйшла? Я і хацела табе прапанаваць: давай створым фірму па продажу капусты.
ЗАЙ. Фірму? А дзе мы яе возьмем, тую капусту?
ЛІСКА. На полі, дзе ж яшчэ... Наладзім нарыхтоўку на зіму.
ЗАЙ. Насушым, ці што?
ЛІСКА. Тэхналогія — мой клопат. А твая справа — зарэгістравацца. У нас тут *(у цябе, дакладней)* офіс будзе. Улады зусім звар'яцелі: без офіса цяпер ліцензію не выдаюць.
ЗАЙ. Ага, падаткі як заплаціш — зубы на паліцу пакладзеш.
ЛІСКА. Дзіўнае ў мяне становішча, Зай. Пярэдняя частка тулава — у раі, а задняя нібыта ў пекле. Мерзне, бедненькая, пакутуе... Яшчэ б заднюю лапу прыстроіць. Век Богу за цябе маліцца буду.
ЗАЙ. Першы раз чую, што ты маліцца ўмееш. *(Задумаўся.)* А якому богу — лісінаму ці заечаму?
ЛІСКА. Бог адзін, Бялевіч, гэта я табе аўтарытэтна заяўляю. Ну, а калі ты асцерагаешся авантуры з капустай, то я маю яшчэ адну задуму: давай адкрыем астралагічную школу. *(Крыху пасунулася ў дамок.)*
ЗАЙ. У мяне, Рыжыкава, ад тваіх прапаноў дах едзе. Ты, аказваецца, не толькі хірамантка, але да таго ж і астролаг!
ЛІСКА. Мяне, даражэнькі, само жыццё вучыла, і вучыла шмат чаму. Я нават піфагораву матрыцу магу табе скласці.
ЗАЙ *(выціраецца ручніком)*. Аж узмакрэў я ад тваіх праектаў.
ЛІСКА. Скажы толькі дакладны год, месяц і дзень тваіх народзінаў.
ЗАЙ. Маю метрыку маці згубіла, калі за ёй сабака гнаўся.
ЛІСКА. І што, зусім не ведаеш? *(Прасунулася ў дамок амаль уся, адно хвост знадворку.)*
ЗАЙ. Прыблізна толькі.
ЛІСКА. Шкада. Астралагічная школа, лічы, накрылася. Адно застаецца...
ЗАЙ. Што?
ЛІСКА *(горача)*. Цяпер гэтым усе займаюцца. Біядабаўкі. Жывыя грошы. Увесь лес вітамінамі засыплем. Пачысцім у звяроў кішэчнікі, нармалізуем абмен, палепшым кроў... *(Азірнуўшыся, ціха.)* Хвосцік, пачакай, ужо мала засталося...

*Зай раптам абвяў — страціў прытомнасць. Ліска кінулася яго ратаваць і ўся аказалася ў дамку. Пырскае на яго вадой, расцірае скроні.*

ЛІСКА. Што з табой?
ЗАЙ *(слаба).* Ты знарок... пра кроў... А?
ЛІСКА. Даруй, даражэнькі! Я зусім забылася, што ты не пераносіш гэтага слова... А хочаш, масаж табе зраблю?
ЗАЙ. Яшчэ і масаж! Хопіць з мяне! Капуста, астралогія, дабаўкі... Дурдом нейкі.
ЛІСКА. Валяр'янка трэба. *(Пераводзіць яго і ўкладвае на канапу, сама размясцілася побач.)* А прызнайся, любы, у шостым класе я табе падабалася.
ЗАЙ. І ў шостым, і ў сёмым... Грыўка ў цябе была такая... смешная...
ЛІСКА. Эх, дзе яна, маладосць?... Час ляціць... *(З пафасам.)* Але нават час не ўладны над сапраўднымі пачуццямі.
ЗАЙ *(расчулена).* Дай абніму цябе, рыжая... Што ні кажы, а другой такой у лесе не знойдзеш.
ЛІСКА. Гэта праўда. *(Адсоўваецца, пераходзіць на дзелавы тон.)* Што за камод старасвецкі? Бабулін, ці што? Дзе ты такія бачыў цяпер? І люстра гэта ні к сялу, ні к гораду. Павесім бра. Фэн-шуй, даражэнькі, трэба паляпшаць.
ЗАЙ. Фэн — што?
ЛІСКА. Як, ты не чуў пра фэн-шуй?! Усе толькі і гавораць: «Фэн-шуй, фэн-шуй»... Усе літаральна на ім памяшаліся. Ты што, кітайскі народ не паважаеш? *(Ходзіць туды-сюды як гаспадыня.)* Шторы закажам сучасныя, на Жданах. З фальбонамі. Званочкаў навешаем і ладанам усё гэта абкурым. Будзе поўны адпад!
ЗАЙ. Ладанам? Абкурымся? О-о-о... *(Зноў абсоўваецца.)*
ЛІСКА. А каб ты не думаў, што ўсё гэта занадта дорага і нам не па кішэні, — сукенку возьмем на пракат.
ЗАЙ *(паднімаецца).* Даруй, а нашто сукенка?
ЛІСКА *(цалуе яго ў лоб).* На вяселле, разумненькі ты мой. На наша вяселле. *(У залу.)* Адзін у майго мужа недахоп: даверлівы занадта...

*Гучыць марш Мендэльсона.*

**Канец**

**БУНТ НА КАРАБЛІ**

Амаль дэтэктыўная камедыя ў дзвюх дзеях

Дзейныя асобы:

ЗАГАДЧЫК ЛАБАРАТОРЫІ, ён жа ШЭФ.
НЯНЬКА-АХОЎНІЦА.
НЯВЕСТА Д.
НЯВЕСТА С.
НЯВЕСТА К.
ПСІХОЛАГ, ён жа РОБАТ.
АПЕРАТАР.
ЖАНІХ.
ЖАНІХ-2.
РОБАТЫ.
НЯВЕСТЫ.
ФОТАРЭПАРЦЁРЫ.

## ДЗЕЯ 1

### Карціна 1

*Нешта падобнае на цэнтр упраўлення касмічнымі палётамі: пульт з лямпачкамі і кнопкамі, вялікі экран, крэслы. Усё звышсучаснае. Аператар ва ўніформе, досыць шчыгульнай, пераключае тумблеры, пры ім уключаны транзістарны прыёмнік з гучнай электроннай музыкай. Пакой часткова прахадны, мы бачым калідор, дзе час ад часу сноўдаюць супрацоўнікі ў белым і цяжка тупае Робат.*
*Заходзіць Шэф, накіроўваецца да экрана.*

ШЭФ. Што там у нас?
АПЕРАТАР. Што? *(Выключае прыёмнік.)* Далажыць абстаноўку?
ШЭФ. Лепш пакажы, а не далажы.
АПЕРАТАР. З вялікай прыемнасцю.

*Пстрыкае, і перад намі па чарзе загараюцца вялікія экраны. Перад намі дзяўчаты ў сваіх пакойчыках. Яны не бачаць, што за імі назіраюць, заняты сваім. На грудзях у кожнай — вялікая літара. Нявеста К. прычэсваецца перад люстэркам. Нявеста С. вышывае сурвэтку крыжыкам, час ад часу дзьмухаючы на сколатыя пальцы. Нявеста Д. засяроджана чытае тоўстую кнігу, седзячы ў позе лотаса.*

ШЭФ *(пра апошнюю).* Даўно гэта з ёй?
АПЕРАТАР. Тыдні са два.
ШЭФ. Адкуль кнігу бралі?
АПЕРАТАР. З архіва, кажуць. Спецыяльна заказалі па яе патрабаванні.
ШЭФ. Відэа глядзіць?
АПЕРАТАР. Нават не ўключае.
ШЭФ. А што за кніга?
АПЕРАТАР. Адсюль не разгледзець. Тоўстая! Такой чалавека забіць можна...
ШЭФ. Прызначыць кансультацыю ў псіхіятра.
АПЕРАТАР. Псіхолаг глядзеў, ніякіх адхіленняў.
ШЭФ. Ведаеш, чым псіхолаг адрозніваецца ад псіхіятра? Не ўмее паставіць дыягназ.

АПЕРАТАР. Наш, здаецца, на гэтых *(ківае на экран)* зубы з'еў. *(Выключае экран.)*
ШЭФ. Як ты кажаш? Зубы з'еў? *(Запісвае у блакноцік.)* Пазнач: для нявесты Д. паклікаць псіхіятра.
АПЕРАТАР. Але яна ў нас ідзе па праграме «духоўнасць».
ШЭФ. Гэтыя асабліва патрабуюць кантролю. Не ведаеш, што заўтра выкінуць...

*Званок па тэлефоне. Шэф бярэ трубку.*

ШЭФ. Ало... Дарагая, я на рабоце. На рабоце, разумееш? На працы. На выставу ты можаш з'ездзіць і без мяне. Ну, будзь разумненькай. Выдатна. Цалую. *(Кладзе трубку.)* Здаецца, ёй не хапае фізічнай нагрузкі. Бег на свежым паветры, аэробіка — і яна прыйдзе ў норму.
АПЕРАТАР. Вы пра жонку?

*Голас па гучнай сувязі: «Прыміце заказчыка».*

АПЕРАТАР. Нарэшце! Кліент! *(Паціраe рукі.)*
ШЭФ *(у мікрафон).* Прапусціце. *(Па гучнай сувязі.)* Службе прыёму: падрыхтавацца да сустрэчы першага кліента. Усё строга па сцэнарыю. *(Садзіцца ў крэсла і прымае афіцыйны выгляд.)*

*Рассоўваюцца дзверы на элементах, з'яўляецца ўпэўнены ў сабе малады чалавек — Жаніх.*

ЖАНІХ. Добры дзень. *(Вітаюцца за руку.)*
ШЭФ. Добры. Сядайце. Вы азнаёміліся з каталогам?
ЖАНІХ. Натуральна. Асартымент мяне цалкам задавальняе, але...
ШЭФ. Мы стараемся не ўжываць падобных слоў. Вы прыйшлі ў навуковую ўстанову, якая служыць гуманным мэтам.
ЖАНІХ. Так, я ведаю.
ШЭФ. Стварыць сям'ю — што можа быць важней для чалавека? У наш неспакойны час, калі пакаленні не здольны паразумецца, калі новае варагуе са старым... У старажытнасці, ёсць звесткі, за нявест мужчыны ўступалі ў жорсткія паядынкі. Бацькі прадавалі дзяўчат за вялікія грошы. Здаецца, гэта называлі... *(Гартае блакноцік.)* Калым, вось як гэта называл!!
ЖАНІХ *(паспешна).* Я прынёс даведку з месца працы. *(Падае.)*

ШЭФ. Цудоўна. Самі разумееце, у нас павінны быць гарантыі, што нашы выхаванкі трапяць у прыстойныя ўмовы. Заўважце, мы пазбягаем рэкламы. У рэкламы заўсёды ёсць душок пошласці. Нашы паслугі строга канфідэнцыяльныя. Існуе невялікая сетка спецыяльна падрыхтаваных агентаў.
ЖАНІХ. І многіх... многім ужо знайшлася пара?
ШЭФ. Скажу па шчырасці: вы — першы. Так што, натуральна, мы таксама хвалюемся. Даведку ад нарколага не забыліся ўзяць?
ЖАНІХ. Вось, калі ласка. Усё па форме.
ШЭФ. Я папрашу вас прайсці невялікі тэст у нашага псіхолага. Прайдзіце вунь у тыя дзверы.
ЖАНІХ. Але ў мяне з усім усё нармальна. Усё нармальна! *(Пад настойлівым паглядам мусіць пайсці куды сказалі.)*
ШЭФ *(Аператару).* Што скажаш?
АПЕРАТАР. Невядома, як ён успрыме кошт паслугі.
ШЭФ. Пра цану ў апошні момант!
АПЕРАТАР. А чаму не спыталіся пра выбар?
ШЭФ. Гэта справа пятая. Выбера. Каб не выбраць з нашых — трэба быць поўным дэбілам.
АПЕРАТАР. Мне асабіста даспадобы наша Ляля. У яе столькі... *(Сустрэў погляд Шэфа — і асекся.)*

*Вяртаецца Жаніх, на яго твары напісана палёгка.*

ШЭФ. А вы баяліся. А цяпер самае галоўнае.

*Бярэ, як малога, за руку, вядзе да экрана, адна за адной мільгаюць дзявочыя постаці і буйна — твары.*

ШЭФ. Хто яна — тая, якую вы нагледзелі і якая — без усялякага сумнення — ашчасліваць вас?

ЖАНІХ. Але я яшчэ не выбраў!
ШЭФ *(адразу пасуровеўшы).* Не зразумеў. Да нас прыходзяць тыя, што вызначыліся. Разабраліся ў сваіх патрэбах і жаданнях. Вы кансультаваліся з асабістым аналітыкам?
ЖАНІХ. Ну вядома ж.
ШЭФ. І што ён вам сказаў?

ЖАНІХ. Сказаў, што мае справу з дзіўным выпадкам. Што мне нібыта — па маіх псіхалагічных і асабовых якасцях — на карысць будзе цэлібат.

*Шэф пераглядваецца з Аператарам, павісае нядобрая цішыня.*

ШЭФ. Тады ваш прыход увогуле незразумелы. Цэлібатныя, наколькі мне вядома, раней жылі ў спецыяльных месцах. У манастырах, ашрамах і скітах. Я не памыляюся?
АПЕРАТАР *(няўпэўнена).* Ашрамы — штосьці іншае. З другой, як кажуць, оперы...
ШЭФ *(Жаніху).* Але вернемся да мэты вашага візіту. Вы сапраўды ні на адну, як казалі ў старажытнасці, не паклалі вока? Магу параіць жонку-каханку — варыянт нетрывіяльны.
ЖАНІХ. А які яшчэ варыянт вы маглі б прапанаваць?

*Аператар шчоўкае і зноў паказвае дзяўчат па чарзе, Шэф каменціруе.*

ШЭФ. Нявеста С. Праграма «Сям'я». Ідэальная прадаўжальніца роду. Будзе нараджаць праз кожныя два-тры гады. Фізічна падрыхтавана. Неблагія вынікі па бегу, скачках у даўжыню, кіданні дыска. Праверана ў экстрэмальных сітуацыях. Займаецца боксам.
ЖАНІХ. Чым-чым?
ШЭФ. Вы што, не чулі пра жаночы бокс?
ЖАНІХ. Дазвольце спытаць, навошта гэтым спакуслівым стварэнням такі грубы від спорту?
ШЭФ. Мы не можам адкрыць заказчыкам усе карты адразу. Тым больш, што вы не вызначыліся і проста марнуеце наш час. *(Паўза.)* А вы, выпадкам, не з газеты?
ЖАНІХ. Я ж прынёс вам даведку з работы. Чорным па беламу напісана...
ШЭФ. А можа, вы па сумяшчальніцтву?
ЖАНІХ. Калі па праўдзе, якраз туды мяне мама і хацела адправіць.
ШЭФ. Мама? На Эдыпаў комплекс правяраліся?
ЖАНІХ. Даруйце, мне тут шыюць невядома што. *(Шэф дастае блакноцік і штосьці запісвае.)* Можна ўзяць з сабою каталог?
ШЭФ. Ні ў якім выпадку. *(Праводзіць да дзвярэй.)* Не засмучайцеся, малады чалавек. Цэлібат дык цэлібат. Спецыялістам відней... У

кожнага свая, як кажуць, планіда. Свой крыж. Карма, адным словам...

*На выхадзе Жаніха пераймаюць з кветкамі і маршам. Сярод супрацоўнікаў — сексапільная, але строга апраінутая Нянька.*

НЯНЬКА *(урачыста).* Віншуем вас з рашэннем уступіць у шлюб. Як першы наш наведвальнік прыміце падарункі і кветкі.

*Жаніх ніякавее, Шэф беспаспяхова спрабуе спыніць віншаванне, Аператар трасецца ад смеху.*

**Карціна 2**

*Пакойчык Нявесты С., больш падобны на кухню. На пліце каструля. Рослая, мажнаватая дзяўчына кідае ў яе то лісцік, то перчык, нюхае, спрабуе.*
*Заходзіць Нянька, размаўляе з ледзь улоўнай іроніяй.*

НЯНЬКА. Ты засекла час гатавання?
НЯВЕСТА С. Ой, забылася.
НЯНЬКА. Другая за тыдзень заўвага. Пасля трэцяй, мілая, цябе пазбавяць прагулкі.

*Накіроўваецца да ложка і нешта шукае пад падушкай. Выпорвае адтуль пудру.*

НЯНЬКА. Зноў?

*Дзяўчына губляецца і закрывае твар рукамі.*

НЯНЬКА. *(Спачувальна.)* Я разумею, без прагулкі цяжка. Ды яшчэ ў цёплую пару года. Але я не робат. Я жывы чалавек і нават больш — жанчына. На гэты раз я дарую табе гэта парушэнне. *(Хавае пудру ў кішэню белага, падобнага на бальнічны, халата.)*
НЯВЕСТА С. Але чаму некаму можна, а мне — нельга?
НЯНЬКА. Ва ўсіх розныя прызначэнні. Пудра, памада, цені, румяны — атрыбуты лёгкадумнасці. Яны неабходны тым, хто будзе мяняць спадарожнікаў жыцця.
НЯВЕСТА С. А навошта іх мяняць?

НЯНЬКА. Табе, мілая, гэта не пагражае. Ты свой век пражывеш з адным. Будзеш паслухмянай, адданай, гаспадарлівай. Аплотам сям'і. Скажу болей — толькі не ўздумай ганарыцца: твая праграма карыстаецца асаблівым попытам у мужчын. Вельмі жаданая ты ў нас нявеста. Перспектыўная...
НЯВЕСТА С. А мне гаварылі, што раджаць — балюча.
НЯНЬКА. Усё, што трэба па тэме, табе скажуць спецыялісты. Але толькі тады, калі знойдзецца рэальны кандыдат.
НЯВЕСТА С. А вы... вам даводзілася?
НЯНЬКА. Не. Я не падыходжу па некаторых паказчыках. Бачыш, грудзі малыя, клубы вузкія... А ты ў нас — люба глянуць. Ды выключы нарэшце пліту!
НЯВЕСТА С. *(выключыўшы пліту, са страхам).* І нават... Казалі, нават парвацца можна, калі раджаеш.
НЯНЬКА. Якіх толькі жахаў не прыдумаюць! Сапраўды, нешта падобнае было ў маёй бабулі. Яна без асаблівай пашаны ставілася да дужай паловы. І казала, што калі б мужчыны самі нараджалі дзяцей, то даўно б вынайшлі сродкі, як зрабіць гэты працэс не такім траўматычным. *(Пераводзячы гаворку на іншую тэму.)* З кім ты цяпер сяброўеш? Па-ранейшаму з К.?
НЯВЕСТА С. З гэтай?.. *(Хмыкае.)* Ну не.
НЯНЬКА. Якая катэгорыя, такія і інтарэсы.
НЯВЕСТА С. Але ж яна таксама ў каталогу?
НЯНЬКА. Як табе растлумачыць... Мужчыны розныя. Ёсць прыстойныя, надзейныя, заможныя. А ёсць такія, што апусціліся і нічога добрага не заслугоўваюць. Але ж ім таксама неабходна пара. Я правільна разважаю? Ну чаму ты маўчыш?
НЯВЕСТА С. Не ведаю.
НЯНЬКА. А ты падумай. Паразважай. Калі мужчына, няхай сабе і апушчэнны, не знойдзе пары, яго замучыць комплекс непаўнавартасці.
НЯВЕСТА С. Штосьці тут не так...
НЯНЬКА. Сумненні? Ну гэта бывае перад крытычнымі днямі. А мо медробата паклічам?
НЯВЕСТА С. Гэтага? *(Дражніць.)* «Усё нармальна. Усё нармальна».
НЯНЬКА. Ну як хочаш. Не забудзь, што заўтра ў цябе залік па дамаводству, а праз тыдзень — экзамен па кармленні дзяцей. *(Пайшла.)*

*Высвечваецца постаць Нянькі. Азіраючыся, яна размаўляе па сотавым.*

НЯНЬКА. Усё ідзе па плану. Так, закручваю гайкі. Так. Ёсць не сарваць разьбу! Канец сувязі.

*Дзяўчына спавівае ляльку, туліць яе да грудзей.*

НЯВЕСТА С. Якія мы харошанькія, якія слаўненькія... Люлі-люлі-люлі спаць, а я буду калыхаць. Прыйдзе шэранькі ваўчок...

*Двайны стук зверху, са столі. Яна залазіць на кухонны стол і завешвае сурвэткай малапрыкметную камеру высочвання. Потым адчыняе фортку і становіцца на падаконнік. Размаўляе прыглушана.*

ГОЛАС НЯВЕСТЫ К. Зрабіла, як я сказала?
НЯВЕСТА С. Так, закрыла. Цяпер не ўбачаць,
ГОЛАС. Хто пападзецца, выпадзе з каталогу. Тады загрыміш у абслугу.
НЯВЕСТА С. Дык праўда, што ён не робат?
ГОЛАС. Ты што, вачэй не маеш? Ну і дурніца, блін.
НЯВЕСТА С. Ты мяне проста палохаеш. І тым, што баліць, і робатам гэтым...
ГОЛАС. Мужчына ён! Мужык! Самы сапраўдны мужык!
НЯВЕСТА С. А навошта яму прытварацца?
ГОЛАС. А халера яго ведае. Трэба так, мабыць.
НЯВЕСТА С. А як адрозніць робата ад мужчыны?
ГОЛАС *(хіхікае)*. Я табе пазней раскажу. Запіску пакладзі дзе і раней — у спортзале пад лаўку. Пакедава!
Нявеста С. хуценька зачыняе фортку і знімае сурвэтку з камеры. Як ні ў чым не бывала, бярэцца вышываць.

## Карціна 3

*Па калідоры мерна рухаецца Робат.*
*У лабараторыі курыць Шэф. Заходзіць Нянька, і ён тут жа хавае «бычок».*

НЯНЬКА. Лятучка ў нас сёння ці заўтра?
ШЭФ. На тым тыдні.

НЯНЬКА. Вытворчых сходаў ужо месяц як не было.
ШЭФ. Усё, што трэба, абмяркоўваем у рабочым парадку.
НЯНЬКА. Парадак — гэта якраз тое, чаго ў нас нестае.
ШЭФ *(скрывіўшыся).* Калі ласка, не ганіце хвалю. Выхаваўчы працэс ідзе нармальна, у тым ліку і дзякуючы вам. Вашым нястомным намаганням.
НЯНЬКА. Гэта іронія? *(Паўза.)* Ну, не будзем высвятляць адносіны. Я проста хацела б давесці...
ШЭФ. Я наперад ведаю ўсё, што вы скажаце. Што кантроль аслаб, што мала дысцыпліны, што выхаванкі занадта многа сталі ведаць...

*Нянька змерала Шэфа знішчальным позіркам і пакінула пакой. Заходзіць Робат.*

РОБАТ *(механічным скрыпучым голасам).* Абход закончаны. Усё нармальна.

*Знімае шлем і аказваецца чалавекам. Гэта Псіхолаг, ён моўчкі ўцірае пот з твару.*

ПСІХОЛАГ. І чаго зноў Ляля патрабуе?
ШЭФ. Вытворчых сходаў, ці бачыце, мала ёй...
ПСІХОЛАГ. Хто каго любіць, той таго і чубіць.
ШЭФ. Барані Бог ад старой дзевы!
ПСІХОЛАГ. Ты забыўся прымаўку запісаць. А што да старой дзевы... Хіба не ты прыдумаў на пасаду нянькі-ахоўніцы браць незамужніх? Дарэчы, што сказалі ў спецупраўленні?
ШЭФ. Галаву намылілі. Там паднялі архіўныя звесткі пра нашу Лялю...
ПСІХОЛАГ. Знайшлі што-небудзь цікавае?
ШЭФ. Само сабой. Яе бабуля была феміністкай.
ПСІХОЛАГ *(перамяніўшыся з твару).* Не можа быць!
ШЭФ. На пяць гадоў была ізалявана ад грамадства за дэструктыўныя паводзіны.

*Шэф нервова ходзіць па пакоі, потым адшуквае свой «бычок» і курыць.*

ПСІХОЛАГ. І што з гэтым цяпер рабіць? Зрэшты, у мяне сваіх праблем хапае. Дакуль я буду, напрыклад, камедыю ламаць з гэтым пераапрананнем?

ШЭФ. Такая ўмова эксперымента. Яны не павінны бачыць мужчын, хіба толькі на фотаздымках і спецыяльных відэароліках.
ПСІХОЛАГ. Закажыце тады для абходаў сапраўднага робата новага пакалення.
ШЭФ. Закажам. Але для гэтага трэба выдаць замуж хаця б парачку нявест. Так што пацярпі. Інакш мы не можам захаваць чысціню эксперымента.

*Гудок тэрміновага выкліку.*

ШЭФ. Што там?
ГОЛАС. Праблемы ў нявесты Д.
ШЭФ. Ну, гэта без праблем не можа... Мы ёй ніколі пару не падбяром, вось пабачыш. Сам будзеш жаніцца.
ПСІХОЛАГ. Не з маёй зарплатай.
ШЭФ. Зарплата падрасце, як абароніш доктарскую.
ПСІХОЛАГ *(усцягваючы на сябе касцюм).* Перагружана наша Д. Філасофія, культуралогія, сусветныя рэлігіі... Звіхнуцца можна. А ёй жа яшчэ трэба будзе азнаёміцца з каббалай, ёгай і народнай магіяй. У тым ліку са сродкамі прысушкі.
ШЭФ. Не зразумеў. Якая можа быць прысушка ў праграме «духоўнасць»?!
ПСІХОЛАГ. Згодны, прысушку адмяню. *(Надзявае шлем і паходкай Робата выпраўляецца на выклік.)*
ШЭФ *(па гучнай сувязі).* Узмацніць кантроль над нявестай Д. *(Уключае экран. Нявеста Д. стаіць на галаве ў позе «бярозка».)*
ГОЛАС. Прыміце заказчыка.

*Шэф выключае экран і напускае на сябе выгляд вялікага начальніка. Заходзіць Жаніх.*

ЖАНІХ. Даруйце, што турбую. Я яшчэ раз перагледзеў ваш каталог...
ШЭФ. Каву? Чай? Тонік? Ды вы сядайце, сядайце...
ЖАНІХ. Не ўжываю. *(Па-дзелавому.)* Перш я спыніўся на вобразе «Душачкі». Нешта ў ім ёсць... Што можа быць прыемней палавіны, якая глядзіць на цябе закаханымі вачамі і падзяляе ўсе твае захапленні? Але я падумаў і выбраў іншае. Якраз тое, што адпавядае маёй... маёй натуры, адным словам.
ШЭФ. Вы мяне заінтрыгавалі. Каторая ж гэта?
ЖАНІХ. У вас выхоўваецца асоба з высокімі духоўнымі памкненнямі.

ШЭФ. Вы маеце на ўвазе Музу?
ЖАНІХ. Не. Муза для паэтаў, мастакоў, кампазітараў... А я нават кошыкаў не пляту.

*Шэф хапаецца за каталог і нервова яго гартае.*

ЖАНІХ. Яе няма ў каталогу. *(З націскам.)* Пакуль няма.
ШЭФ. Вось што, малады чалавек. Мы не шлюбная кантора, мы сур'ёзная навуковая ўстанова і працуем на карысць усяго грамадства. Яшчэ раз пераконваюся, што вам нельга даверыць ніводную нашу выхаванку. Бывайце здаровы. Я спадзяюся, вы забудзеце да нас дарогу.
ЖАНІХ. У мяне сур'ёзныя намеры! Вы не маеце права...

*Яго выводзяць два робаты.*

ШЭФ *(па гучнай сувязі).* Тэрміновы выклік! Тэрміновы выклік! Старэйшым выхавацелям неадкладна сабрацца!

*Першы прыбягае ўскалмачаны Аператар, потым Нянька, апошнім валачэцца Псіхолаг у касцюме робата і пачынае вылузвацца са сваёй уніформы.*

ШЭФ *(не хаваючы раздражнёнасці).* Можа, вам дапамагчы? *(Да ўсіх.)* Надзвычайнае здарэнне. У нас уцечка інфармацыі. *(Пільна ўглядаецца ў твары супрацоўнікаў.)*
АПЕРАТАР *(Няньцы).* У нас то панос, то залатуха...
ШЭФ. Заказчыку стала вядома пра існаванне праграмы «Духоўнасць». Праграма, як вы ведаеце, засакрэчаная. Кожны з вас даваў падпіску і нясе — самі ведаеце, якую — адказнасць. Давядзецца далажыць у вышэйшую інстанцыю.
НЯНЬКА. Нас усіх выганяць!
АПЕРАТАР. І пасадзяць.
ПСІХОЛАГ. Пасадзяць, дапусцім, не ўсіх, а толькі таго, у каго доўгі язык.
ГОЛАС. Прыміце заказчыка!
ШЭФ. У нас лятучка, няхай пачакае.
ГОЛАС. Ён патрабуе.
ШЭФ. Не разыходзьцеся, давядзецца прыняць.

*За далейшым кожны назірае па-свойму. Псіхолаг з цікавасцю, Нянька без усялякіх знешніх эмоцый, Алератар з ухмылачкай.*
*З'яўляецца Жаніх-2 — мужчына гадоў пад 50 у паношаным пінжаку на спартыўныя штаны. Ён, што называецца, пад мухай, пасінелы нос выдае аматара Бахуса.*

ЖАНІХ-2. Пардон, ізвіняюся. Дзела не церпіць адлагацельства.
ШЭФ. Я вас уважліва слухаю.
ЖАНІХ-2 *(порацца па кішэнях).* Спраўкі шукаю. Вось адна... Вось другая. *(Замест трэцяй дастае брудную насоўку.)*
ШЭФ. Па вас бачу, што даведкі ад нарколага не будзе.
ЖАНІХ-2. Савяршэнна правільна. Адна, но пламенная страсць. Не я адзін грэшны, не я адзін...
ШЭФ *(падсоўваючы адзін з двух каталогаў).* Можа б, азнаёміліся ў прыёмнай?
ЖАНІХ-2. Мне вунь той, з залатымі буквамі.
ШЭФ. Бачыце, у нас нявесты дзвюх катэгорый. З золатам не для вас.
ЖАНІХ-2. Пазвольця!
ШЭФ. Вас што, не азнаёмілі з нашымі правіламі?
ЖАНІХ-2 *(аціхаючы).* Ладна, што тут у наліччы? *(Чытае.)* Гулёна, гультайка, ганарліўка... Усе на «Г». Ясненька... Як мне, дык на «Г», а як астатнім, дык... А вы мяне не разыгрываеце?
ШЭФ. У нас салідная навуковая ўстанова. Вось *(паказвае на Псіхолага),* перад вамі доктар псіхалогіі, свяціла сучаснай навукі. Канцэпцыю распрацоўвалі самыя светлыя галовы краіны. Мазгавым штурмам. Усё прадумана. Нават тое, што заказчыкі, як правіла, ідэалізуюць сябе і не ўяўляюць, якая з нявест ім будзе на карысць.
ЖАНІХ-2. А хіба можа быць карысць... ну, з гэтай... з гультайкі?
ШЭФ. Яшчэ якая! На яе фоне вы будзеце адчуваць сябе верхам дасканаласці.
ЖАНІХ-2. Ну не. Я працястую. Я хоць і бяру лішнюю, але не поўны прыдурак. Вы мне проста падсоўваеце другі сорт.
ШЭФ. Згодна закону адпаведнастці. Чулі пра такі? Падобнае прыцягваецца падобным.
ЖАНІХ-2 *(углядаючыся ў Аператара).* Я вас где-та відзеў. *(Аператар угінае галаву.)* Не, вы мне проста пудрыце мазгі. Такую, як вы мне прадлагаеце, я магу знайсці і бясплатна.
НЯНЬКА. Чаму ж не знайшлі?

ЖАНІХ-2 *(не зважаючы).* Скажу як ёсць. На мяне звалілася бальшая ўдача: выйграў грошы ў казіно. Абалдзенную суму! Так што магу выбіраць і з першага сорта. Понялі?
ШЭФ. Я-то поняў. Дакладней — зразумеў. Але даруйце, неадкладныя справы.
ЖАНІХ-2. І Біблію я ў руках трымаў, не думайце. Калі Ева з маёй рабрыны, то які ні ёсць — уважаць далжна. Ногі мыць і ваду піць.
НЯНЬКА. Негігіенічна!
ШЭФ. Як вы сказалі? Ногі мыць... *(Запісвае, потым выправаджвае пад руку.)* Прашу вас наведацца другім разам.
ЖАНІХ-2. Нету гаранціі.
ШЭФ. Не зразумеў.
ЖАНІХ-2. Грошы так быстра расходзяцца... *(У бок Аператара.)* Точна бачыліся. У мяне памяць, як у вожыка. *(Шэфу.)* Ізвіняюся, калі што не так. З чыстым сэрцам прыйшоў. З лепшымі намярэніямі... *(Выходзіць.)*
АПЕРАТАР *(захоплена).* Во гэта экземпляр!
ШЭФ. Давядзецца правяраць аддзел маркетынгу. Калі яны будуць нам падсоўваць такіх кандыдатаў...
НЯНЬКА. Тыповы прадстаўнік дужага полу.
ШЭФ *(Няньцы).* Спадарыня, на вас скардзяцца нявесты. Прыдзіркі, прычэпкі, пастаянная раздражнёнасць... Мы ў адказе за душэўны стан выхаванцелек, а не толькі за іх фізічнае здароўе. *(Аператару.)* А вы ўчора з трох да пяці адсутнічалі на рабочым месцы.
ПСІХОЛАГ. А я, цікава, у чым вінаваты?
ШЭФ. Далібог, я стаміўся. У мяне распухла галава. А я не робат, я жывы чалавек! Мне і жыць трэба — не толькі працаваць! У мяне не жалезныя нервы! *(Абхапіў галаву рукамі, усе прыгнечана маўчаць.)*
ПСІХОЛАГ. Прапаную вярнуцца да нашага асноўнага пытання. Чым нам увогуле пагражае розгалас? Я пра ўцечку...
АПЕРАТАР. У нас супрацоўнікаў, як смецця. Адной абслугі паўсотні.
ШЭФ. Абслуга не ведае сутнасці эксперымента, а тым больш дэталяў.
АПЕРАТАР. У мяне тут думка з'явілася... Знайсці таго першага заказчыка. Хай скажа, адкуль у яго інфармацыя. А не скажа, мы яго...
ШЭФ. Табе гэта і даручаю. На сёння ўсе вольныя.

**Карціна 4**

*Пакой, падобны на школьны клас. Дошкі на магнітах, крэйда, надпіс: «Урок сёмы».*

*За сталамі тры нявесты — С., Д. і К., якую мы ведаем толькі па голасу. У ролі настаўніцы — Нянька, яна ў іншай, больш жаноцкай форме.*

НЯНЬКА. У мінулы раз мы вучыліся ўзаемадзейнічаць з людзьмі ў месцах адпачынку. Дзе іменна?
НЯВЕСТА Д. У парку, на атракцыёне, на дыскатэцы.
НЯВЕСТА К. *(хіхікае).* Здорава было!
НЯВЕСТА Д. А я адчувала сябе скаванай. Шматлюддзе мяне стамляе.
НЯНЬКА. Давядзецца прывыкаць.
НЯВЕСТА Д. Сядзець у сваім пакойчыку, чытаць, марыць, маліцца — што можа быць прыемней?
НЯНЬКА. Тым не менш, некалі вам давядзецца выйсці ў свет. А свет — ён бывае розны. Для таго і існуюць гэтыя заняткі, каб вы вучыліся жыць у соцыўме. Прыступім. *(Дастае з шафы шклянкі, талеркі, прыборы, электрачайнік.)* Сітуацыя першая. Вы ў горадзе. Прагаладаліся, зайшлі ў кафэ.
НЯВЕСТА К. Хто ў кафэ, а хто і ў звычайную забягалаўку.
НЯНЬКА. У вас з сабою будуць грошы. У каго большая сума, у каго меншая...
НЯВЕСТА Д. Дзіўна, людзі калісь лічылі, што грошы адыдуць. Адамруць самі сабой, як маманты. А яшчэ яны ўсур'ёз думалі, што можна пабудаваць ідэальнае грамадства.
НЯНЬКА *(ставячы перад кожнай сталовы прыбор).* Я буду ў ролі афіцыянткі.

*Калі Нянька адвярнулася, Нявеста К. падае знак суседцы, тая хуценька дастае штосьці з кішэнькі.*

НЯВЕСТА К. Піць хочацца.
НЯНЬКА *(адзяючы фартушок).* Што будзем заказваць?
НЯВЕСТА К. Мне чырвонага віна.
НЯНЬКА *(запісвае ў блакноцік і звяртаецца да наступнай).* Вам, калі ласка?
НЯВЕСТА Д. Будзьце ласкавыя, апельсінавага соку.
НЯВЕСТА С. Марожанае з шакаладам. Не, з шакаладам і арэхамі.

*Нянька адышлася, гатуе заказанае. Спачатку падала сок. Пакуль яна адкаркоўвае бутэльку віна, Нявеста С. у шклянку з сокам падсыпала парашок на сон.*

НЯВЕСТА Д. *(паспрабаваўшы сок, гідліва).* Гэтага я піць не збіраюся.
НЯНЬКА. Што такое?
НЯВЕСТА Д. Сок сапсаваны.
НЯВЕСТА К. Дык колькі я буду чакаць?
НЯНЬКА *(разгублена).* Сок як сок. Нядаўна прывезлі.
НЯВЕСТА Д. Ён пахне цвіллю. Не верыце — паспрабуйце.

*Нянька адпівае соку — крышку, затым больш. Потым захісталася, асела на крэсла... і заснула, звесіўшы галаву.*

НЯВЕСТА С. Чыстая работа! Колькі дзейнічае?
НЯВЕСТА К. Амаль паўгадзіны. Не будзем траціць часу! Дык што мы ўжо ведаем?
НЯВЕСТА С. ...што з нас выхоўваюць ідэальных жонак.
НЯВЕСТА Д. ... што ўсе мы — сіроты...
НЯВЕСТА К. Брахня! Некаторых малымі забралі ад мацярок-адзіночак. Купілі проста!
НЯВЕСТА Д. Адкуль інфармацыя?
НЯВЕСТА К. З запіскі. Пад сталом валялася запіска, і ў ёй напісана было. Чорным па беламу.
НЯВЕСТА С. А наш псіхолаг — зусім не робат, а звычайны мужык.
НЯВЕСТА К. *(з гонарам).* Я першая выгледзела!
НЯВЕСТА С. Усім трэба перадаць. Каб усе ведалі, які тут у нас цырк на дроце.
НЯВЕСТА Д. Сёстры, я перад вамі вінавата. *(Бухаецца на калені.)* Даруйце!
НЯВЕСТА К. Чокнулася!
НЯВЕСТА Д. Я даўно ведала, што ён не робат. Ён знімаў у маім пакоі шлем. Мы размаўлялі... ну як з вамі...
НЯВЕСТА К. Можа, вы яшчэ што-небудзь рабілі?
НЯВЕСТА С. Дзяўчаты, давайце без разборак. Вы заўважылі, што нас кормяць па-рознаму? Мне ўсё супчыкі ды катлеткі...
НЯВЕСТА Д. Мне рыбу і салату...
НЯВЕСТА К. А мне... *(Ледзянее ад здагадкі.)* Блін! Яны мяне спойваюць: кожны дзень прыносяць па бакалу віна! Кажуць, што ад малакроўя.
НЯВЕСТА С. Але навошта ім гэта?
НЯВЕСТА Д. У кожнай з нас свая праграма.
НЯВЕСТА С. Хто табе сказаў?
НЯВЕСТА Д. Доктар.

НЯВЕСТА К. Наш чалавек!
НЯВЕСТА С. Мне ўсё ясна! Мая праграма — «Сям'я».
НЯВЕСТА Д. А мая — «Духоўнасць».
НЯВЕСТА К. А мая тады якая?
НЯВЕСТА Д. Атрымліваецца, што мы — паддоследныя мышы! Але гэта дзікунства! У XXII стагоддзі, у час усеагульнай камп'ютэрызацыі і геннай інжынерыі...
НЯВЕСТА К. *(усхліпвае).* Бедная мамачка... Добра, калі яшчэ каго нарадзіла... А калі Бог не даў?
НЯВЕСТА Д. Ты таксама вывучаеш багаслоўе?

*Нянька заварушылася, застагнала скрозь сон.*

НЯВЕСТА К. Прачынаецца!
НЯВЕСТА С. Хоць бы ёй кепска не стала...
НЯВЕСТА К. Чорт яе не возьме!
НЯВЕСТА Д. Дык табе і дэманалогію выкладаюць!..
НЯВЕСТА К. Чаго ты, блін, прыстала са сваімі навукамі? Значыцца, так: з сённяшняга дня — ціхі страйк.
НЯНЬКА *(скрозь дрымоту водзіць рукою па стале, згрэбла лыжкі, апрытомнела).* Што са мной? Дзе я?
НЯВЕСТА С. Мы так напалохаліся, пані. Вы страцілі прытомнасць.

### Карціна 5

*Анератар «балдзее» ў навушніках. Праходзячы міма, яго пагладзіла па шыі Нянька.*
АПЕРАТАР. А, Лялечка... *(Спрабуе абняць.)*
НЯНЬКА *(не вельмі рашуча ўхіляецца).* Хацела б я ведаць, хто мне даў такую бабскую мянушку.
АПЕРАТАР. Зусім і не бабская, Мне падабаецца. *(Жартам залез у кішэню яе халата і выцягнуў адтуль самалёцік.)* О, у самалёцікі гуляем!
НЯНЬКА. Аддай!
АПЕРАТАР. Дагані!

*Ён бегае паміж сталамі і пультамі, яна спрабуе дагнаць.*

АПЕРАТАР. А тут нешта напісана...

*Нянька нарэшце адабрала самалёцік і баявым прыёмам паклала нахабніка на падлогу.*

АПЕРАТАР. Пусці!

*Набліжаецца Шэф, Нянька паспешна знікае з вачэй.*

ШЭФ. Эратычныя гульні? *(Глядзіць на гадзіннік.)* У нас, дарэчы, час прагляду.

*Аператар уключае першы экран. Мы бачым Нявесту С., якая ўрачыста нясе торт Робату. Той відавочна разгубіўся і схаваў рукі за спіну.*
*Вусны дзяўчыны шавеляцца, але голасу мы не чуем. Робат, як рак, задам пасоўваецца да выхаду.*

ШЭФ. Не зразумеў...
АПЕРАТАР. Яна раскусіла псіхолага! Завал.
ШЭФ. Рана ці позна ўсе будуць ведаць.

*На наступным экране Робат і Нявеста К. Яна падкрадаецца з-за спіны і спрабуе закрыць яму вочы рукамі.*

ШЭФ. Прасачы за наступнымі. *(Выбягае.)*

*Аператар паспешна выцягвае са стала відэакамеру і пачынае здымаць флірт з «Робатам»-Псіхолагам.*

АПЕРАТАР. Ну, яшчэ... Яшчэ трошкі... Не спыняйся.

*У Нянькі сеанс сувязі. Як заўсёды, азірнулася — праверыла бяспеку. Размаўляе па сотавым.*

НЯНЬКА. Дакладваю. Працэс ідзе. Браджэнне ў калектыве. Нарастае пратэст. Слухаю. Канец сувязі.

## Карціна 6

*Пакой Нявесты Д. Тут перамешаны ўсе стылі і эпохі: патрэсквае свечка і курыць усходняя пахкая палачка, на сцяне вісяць індыйскія*

*званочкі і старажытны праваслаўны абразок. Дзяўчына ўслых чытае псалом.*

НЯВЕСТА Д. «Ты мой прыпынак і цвярдыня мая, мой Бог, на якога спадзяюся... Не бойся страхаў начных, ні стралы, што ўдзень ляціць...» *(Паўтарае.)* «Ні стралы, што ўдзень ляціць...»

*Адкладвае псалтыр і складае рукі ў так званай мудры.*
*У фортку залятае самалёцік. Яна перш разглядвае яго, потым разгортвае і чытае: «Шукай камеру назірання. (Азіраецца.) Толькі асцярожна». Анучкай пачынае праціраць усё, што ёсць у пакоі. Калі даходзіць да ўсходняй драўлянай маскі, тая звальваецца са сцяны і адкрывае спецыяльнае вочка.*

НЯВЕСТА Д. Вось яно! *(Шукае, чым закрыць, нарэшце накідвае шалік. Самалёцік ірве на дробныя кавалачкі.)*

*Пасля трайнога стуку заходзіць Псіхолаг у амуніцыі робата і з медыцынскім куфэркам.*

НЯВЕСТА Д. Цябе не было цэлую вечнасць. *(Хоча зняць шлем.)*
ПСІХОЛАГ. Асцярожна, убачаць!
НЯВЕСТА Д. Не. На гэты раз мы можам быць спакойнымі: нагляду не будзе. Ведаеш, што я зрабіла? *(Паказвае на завешанае вочка.)*
ПСІХОЛАГ. Гэта яшчэ небяспечней: западозраць і прыйдуць з праверкай. *(Здымае шлем.)*
НЯВЕСТА Д. Мне зноў прысніўся страшны сон. Як быццам ты на самай справе ператварыўся ў робата, але робат гэты ўвесь растурзаны, латаны-пералатаны, і з яго сыплюцца гайкі. А самае недарэчнае, што на галаве гэтага робата была ваенная фуражка.
ПСІХОЛАГ. Фуражка? *(Думае.)* Дзіўныя рэчы выдае твая падсвядомасць!
НЯВЕСТА Д. А ведаеш, чаго жадае мая свядомасць? Цябе пацалаваць.
ПСІХОЛАГ *(адхіляецца)*. Блудніца Вавілонская! Давай хоць ціск праверу для прыліку. *(Дастае з куфэрка сучасную прыладу, што надзяваецца на руку.)*
НЯВЕСТА Д. Ты таксама не ідэал. Цябе нядаўна бачылі з нашай нянькай... Шапталіся ў цёмным кутку.
ПСІХОЛАГ. Рэўнасць — пачуццё аджыўшае.

НЯВЕСТА Д. Сама ведаю. А як пячэ... вось тут... *(Паказвае на грудзіну.)* У вас сур'ёзна?
ПСІХОЛАГ. Кінь дурное. З Ляляй мы абмяркоўвалі адно вытворчае пытанне. Разумееш: вы-твор-ча-е!
НЯВЕСТА Д. І яшчэ ёсць навіна. Хтось падкінуў запіску, што мы зусім не сіроты. Гэта праўда?
ПСІХОЛАГ. А вы тут часу дарма не губляеце!
НЯВЕСТА Д. Значыць, мая маці жывая-здаровая. Так?
ПСІХОЛАГ. Інфармацыя такога роду для мяне недаступная.
НЯВЕСТА Д. Ты адказваеш, як сапраўдны робат! Давай я цябе ажыўлю. *(Туліцца да яго, лашчыцца.)*
ПСІХОЛАГ. Ды нельга мне! *(Паўза.)* Што ты робіш са мной? Маё сэрца растае, як воск. Нават вершы пачалі прыходзіць. Чужыя і свае. Абрыўкі фраз, мелодый... Быццам ува мне прачнуўся, абудзіўся нехта іншы, інакшы, лепшы за мяне...
НЯВЕСТА Д. Дык гэты «лепшы» кахае мяне ці не?
ПСІХОЛАГ. Паслухай мяне. Мы будзем разам. Абавязкова. Я забяру цябе адсюль. Толькі трэба пачакаць. Пацярпець.
НЯВЕСТА Д. Мне надакучыла іграць гэту недарэчную ролю. І я не святоша, і ты не робат, і навуковая ўстанова — зусім не навуковая. Мы сапраўды многа ведаем, і скора ўсё зменіцца. Мы станем вольнымі, а вы... вы ўсе пойдзеце пад суд.
ПСІХОЛАГ *(з усмешкой).* Можа быць... *(Знімае прыбор з яе рукі.)* 120 на 80, як у касманаўта.
НЯВЕСТА Д. Пачакай!
ПСІХОЛАГ. Дысцыпліна і яшчэ раз дысцыпліна!
НЯВЕСТА Д. Баішся страціць месца працы, так?
ПСІХОЛАГ. Цябе баюся страціць. І хопіць пра асабістае. Тут і так усё гудзе, як вулей. Твая праграма рассакрэчана, могуць быць непрыемнасці. Уводзіцца ўзмоцнены кантроль. Ёсць прапанова не толькі сачыць за вамі візуальна, але і падслухоўваць. *(Накіроўваецца да дзвярэй.)* Верагодна, што вас возьмуць пад замок. І папярэдзь дзяўчат: у выпадку ўскладнення сітуацыі меры будуць самымі жорсткімі. *(Пайшоў.)*

## ДЗЕЯ 2

### Карціна 7

*У Шэфа паседжанне. Змяніліся і яго тон, і ўвогуле атмасфера ў калектыве.*

ШЭФ. З сённяшняга дня ўведзены рэжым павышанай пільнасці. Узмоцнена сістэма аховы — як людзьмі, так і тэхнікай. Кожны з вас пройдзе паглыбленую праверку; ёсць інфармацыя, што некаторыя ўтаілі біяграфічныя звесткі. Будзе перагледжана аплата працы. А цяпер далажыце абстаноўку.
НЯНЬКА. Заўважаны адхіленні ў паводзінах выхавальніц. Нявеста К., напрыклад, пакідае нявыпітай традыцыйную шклянку віна. Дэманстратыўна. А магла б проста выліваць яго ў ракавіну.
ШЭФ *(Апаратару).* Час адсочвання падоўжаны?
АПЕРАТАР. Барахліць сістэма. Я даўно казаў, што рамонт патрэбен.
ШЭФ. Што яшчэ?
НЯНЬКА. Псіхіятр глядзела Нявесту Д. Адзначаны высокі ўзровень трывожнасці. Мала таго: Д. заявіла, што ўвогуле не жадае выходзіць замуж.
ШЭФ *(Псіхолагу).* Дацацкаўся!
НЯНЬКА. Я разумею, што гэта не лезе ні ў якія вароты. Столькі сіл патрачана, столькі сродкаў...
ШЭФ. А памятаеце, з якой цяжкасцю дабіліся дазволу на эксперымент? І як няпроста было захаваць рэжым сакрэтнасці?
АПЕРАТАР. Пранюхаюць рэпарцёры — нам кранты.
ШЭФ *(Апаратару).* Ты даведаўся, адкуль у кліента закрытая звесткі?
АПЕРАТАР. Каардынаты здабыў *(ляпае па кішэні).* Астатняе — справа тэхнікі.
ШЭФ *(Псіхолагу).* А вы што маўчыцё, як вады ў рот набралі?
ПСІХОЛАГ *(паднімаецца з месца).* У мяне вусная заява. *(Пракашліваецца.)* Мушу далажыць: я расчараваўся ў выніках сваёй навуковай дзейнасці і прашу дазволу на звальненне.

*Аператар прысвіснуў.*

ШЭФ. Бунт на караблі? *(Паўза.)* Вы не можаце ў такіх умовах пакінуць установу. Вы ўсе пад падазрэннем! Урэшце, гэта не па-мужчынску — пры першых цяжкасцях даваць драла.

ПСІХОЛАГ. Тым не менш, з гульні я выходжу.
ШЭФ. Я падумаю над вашай прапановай. *(Аператару)* Уключы экран.

*Мы зноў па чарзе бачым нявест. Адна робіць гімнастыку, другая пазірае ў акно, трэцяя малюе. Чарговы экран аказаўся белым.*

ШЭФ. Вось яно. Працэс пайшоў... *(Аператару)* Неадкладна праверыць, што там робіцца. *(Няньцы.)* Прывядзіце сюды Нявесту Д. *(Псіхолагу)* Апрані форму.

*Аператар выходзіць, Псіхолаг пераапранаецца ў робата. Нянька прывяла Нявесту Д. і выйшла.*

ШЭФ. Добры дзень. Ты змушаеш мяне парушаць уласныя правілы. Я ўпершыню размаўляю з выхаванкай. *(Чакае рэакцыі.)* Ты не супраць, калі робат будзе прысутнічаць?
НЯВЕСТА Д. *(хмыкнуўшы).* Ен зусім не робат.
ШЭФ. Хто вам сказаў?
НЯВЕСТА Д. Праверылі. Часам яшчэ самалёцікі прылятаюць... З цікавымі навінамі.

*У Шэфа пачынае нервова тузацца вейка. Псіхолаг дэманстратыўна вылазіць са «скафандра».*

ШЭФ. А цяпер адкажы: ты сапраўды не хочаш замуж?
НЯВЕСТА Д. Пайду ў манастыр.
ШЭФ. Ну, па-першае, апошні манастыр зачынены гадоў дзвесце таму. А па-другое, дзяржава патраціла вялікія сродкі, каб ты стала такой, якая ёсць. Надышоў час сплочваць. Аддаваць. Твая задача — стаць жонкай, спадарожніцай жыцця. Будзіць, весці, акрыляць.
НЯВЕСТА Д. Акрыляць такіх, як вы?
ШЭФ. Ды не, я ўжо даўно і з крыламі, і з рагамі. Час сказаць табе галоўнае: ты стала першай, каго выбралі са спісу.
НЯВЕСТА Д. Хто выбраў?
ШЭФ *(ківае на Псіхолага).* Ён і выбраў.

*Псіхолаг разявіў рот. Дзяўчына ашаломлена. Шэф любуецца эфектам.*

ШЭФ. Я ўпэўнены: ты ўмееш любіць. Твая рэлігія навучыла цябе адсякаць сваю волю і пакарацца абставінам. Ты нясеш спакой і згоду, творча падыходзіш да ўсялякай справы. Урэшце ты прыгожая. У вас будуць не дзеці, а анёлкі. А цяпер ідзі і падумай. Можа, не варта адкрываць манастыр на а дну асобу...

*Дзяўчына пайшла.*

ШЭФ. (Псіхолагу) Я ведаю, кім мы цябе заменім. Мы возьмем на стаўку святара. Мы прымусім іх спавядацца і такім чынам возьмем сітуацыю пад кантроль. *(Паціраe рукі ад задовольненая.)* Бацюшка або ксёндз — вось хто нам патрэбен!

## Карціна 8

*Куток гарадскога двара. Вечар. Удалечыні агні рэкламы. Чуваць гукі бойкі. Аператара дагнаў Жаніх і валтузіць яго.*

ЖАНІХ. Вось табе, гад, вось!

*Аператар вырваўся і адбег, разглядае падраны рукаў.*

АПЕРАТАР. Чаго ты хочаш?
ЖАНІХ. Вярні грошы.
АПЕРАТАР. Я выканаў дамову. Ты хацеў самую лепшую — я сказаў. Я ж не гарантаваў, што яе вынесуць на талерачцы. І прытым, ты сам усё сапсаваў.
ЖАНІХ. Падазроная нейкая кантора... Падпольная, ці што?
АПЕРАТАР. Маем ліцэнзію, так што ўсё па закону.
ЖАНІХ. І ў газетах ні разу не пісалі... Падазрона.
АПЕРАТАР. Добра, я аддам табе палову, толькі не цяпер. І з адной умовай: прыдумаем версію, адкуль ты дазнаўся пра сакрэтную праграму. У нас з-за цябе такі вэрхал усчаўся, хоць святых вынось. Шэф раз'юшаны... Праверка за праверкай... Няма жыцця.
ЖАНІХ. Ну і дурань я! Як я адразу не даўмеўся: цябе трэба проста залажыць, і ўсе дзялы!
АПЕРАТАР. А якая табе выгада? Ну, выганяць мяне... І ты яе не ўбачыш як сваіх вушэй.
ЖАНІХ. А на касеце?
АПЕРАТАР. А касету ты мне вернеш. Як дамаўляліся.

ЖАНІХ. Не магу. Дня пражыць не магу, каб не паглядзець. Не выходзіць яна ў мяне з галавы… А скажы, многа ты такіх відзікаў наздымаў?
АПЕРАТАР. Камерцыйная тайна.
ЖАНІХ. Сам распаўсюджваеш… альбо з дапамогай?
АПЕРАТАР *(садзіцца на прыступку ганка).* Ну якая табе розніца! Сам, не сам… І ўвогуле, мы ўсяго толькі аднакласнікі. Мы нават сябрамі ніколі не былі.
ЖАНІХ. А не трэба мне грошай. *(Паўза.)* Давай прыдумаем штонебудзь. План які, ці што…
АПЕРАТАР. Які яшчэ план ?
ЖАНІХ. Як яе ад вас умыкнуць.
АПЕРАТАР *(круціць пальцам ля скроні).* Зусім ужо? І потым, у нас не турма. Дзеўкі сам бачыш — якія. Дагледжаныя, спраўныя…
ЖАНІХ. У вас горай, чым турма. У вас душы заняволены.
АПЕРАТАР. Э не… Ты мяне не ўцягвай. Я падпіску даваў аб неразглашэнні.
ЖАНІХ. Ну-ну. А сам відзікі здымаеш і прадаеш…
АПЕРАТАР. Відзікі — гэта іншае. Хаця і за іх па галаве не пагладзяць… Думаю я часам пра ўсё гэта і не разумею: чаго яны на самай справе хочуць? Новую пароду людзей вывесці? Альбо проста жанчын узяць пад кантроль, бо тыя многа хочуць?
ЖАНІХ. Не кажы! Ходзяць чуткі, што яны нават у Раду старэйшын прэтэндуюць!
АПЕРАТАР. Байкі… Хто іх пусціць у Раду! Калі яны за дзве тысячы гадоў ва ўладу не прарваліся… Толькі ваду муцяць. Тэхніка ім замінае, экалогія не падабаецца, норавы нібыта дэградуюць…
ЖАНІХ. А яшчэ я чуў быццам з'явілася падпольная бабская арганізацыя… тыпу ваенізаванай… І нібыта яны помсцяць крыўдзіцелям. Нам, мужыкам, значыцца.
АПЕРАТАР. Здорава! Трэба ў Лялі распытаць.
ЖАНІХ. А я вось што думаю пра вашу лабараторыю. Можа, яе арганізатары надумалі спраўдзіць адвечную нашу мару — знайсці сваю палавінку. Свайго двайніка. Сваё люстэрка. Каб паглядзеў — і ўбачыў сябе самога.
АПЕРАТАР. Мае бацькі ўсё жыццё грызуцца і нават б'юцца толькі таму, што падобныя.
ЖАНІХ. А мая артысткай была, усё па гастролях… Дома не стыкалася. Бацька ўрэшце яе пакінуў — разам са мною.

АПЕРАТАР. Праграма «Выпрабаванне». У нас таксама адна такая ёсць. Аторва, а не дзеўка! Але твой, выходзіць, не да канца адпрацаваў.
ЖАНІХ. Знайшоў другую. Тая ўвогуле алкагалічка.
АПЕРАТАР. Праграма «Карма». Клас! З агню ды ў полымя! *(Раздаецца гудок пэйджара.)* Тэрміновы выклік. Сустрэнемся заўтра вечарам у мяне. А шэфу я далажу, што ты пакуль не раскалоўся і расколешся, як добра заплацяць.
ЖАНІХ. Ну ты мудрэц! Ды яны мяне зусім кокнуць!
АПЕРАТАР *(ляпае па плячы).* Не будзем забягаць наперад.

## Карціна 9

*У лабараторыі паніка. Бегаюць супрацоўнікі, мільгаюць чырвоныя лямпачкі, гучыць сігнал трывогі. Чуваць дружныя воклічы дзяўчат: «Сва-бо-ду», «Сва-бо-ду»...*

ШЭФ *(схапіўшыся за галаву).* Бунт! Сапраўдны бунт! *(Па гучнай сувязі.)* Тэрмінова выявіць падбухторшчыцу! Выклікаць паліцыю! Не, з паліцыяй пачакайце.

*Званок тэлефона.*

ШЭФ. Алё. Куды? На базар? У мяне гэтаксама базар, дарагая. Растлумачу дома. І не сёння.

*Убягае Аператар.*

АПЕРАТАР. На вуліцы збіраецца прэса.
ШЭФ. Гэтага толькі не хапала...
АПЕРАТАР. Адзін з камерай залез на слуп. Як альпініст. Сцягнуць?
ШЭФ *(па тэлефоне).* Алё, міністэрства бяспекі? Звоняць з Інстытута сацыяльных адносін. Так, з сакрэтнага аддзела... Просім дадатковай аховы. Неадкладна. *(Паўза.)* Як не можаце? Не павінны?! *(Кідае трубку.)* Загавар нейкі!

*Вяртаецца Аператар.*

ШЭФ. Дзе нянька?

АПЕРАТАР. Справы дрэнь. Яны ўзялі яе закладніцай.

*Галасы яшчэ мацней: «Далоў тыранію», «Не — сацыяльным эксперыментам», «Жанчыны таксама людзі»...*
*Акрамя таго, частка іх прарываецца да выхаду. У ахоўнікаў адабрана зброя!*

ШЭФ. Давядзецца пайсці на крайнія меры. *(Па гучнай сувязі.)* Групу робатаў! Рэжым актыўнасці!

*Марудна рухаюцца два робаты. Адзін з іх зусім як пераапрануты Псіхолаг.*

1-шы РОБАТ. Слухаем загад.
ШЭФ. Патушыць агрэсію.
2-гі РОБАТ. Ёсць патушыць агрэсію. *(Выходзяць.)*

## Карціна 10

*Нявесты трымаюць дзверы, Нянька з завязаным ротам прывязана да спінкі стула. Усе ўзбуджаны, настроены рашуча. Камандуе Нявеста К.*

НЯВЕСТА К. Калі мы здрэйфім — усім хана. Пратрымаемся колькі зможам, а там Бог бацька.
НЯВЕСТА Д. У крайнім выпадку сядзем на галадоўку.
НЯВЕСТА С. Табе добра, ты прывычная. А я і дня не вытрымаю.
НЯВЕСТА Д. Існуе яшчэ адзін метад. Праўда, завельмі радыкальны... Самаспальванне.
НЯВЕСТА К. Не дачакаюцца.
НЯНЬКА *(тузаецца)*. Развяжыце!
НЯВЕСТА Д. Заложніца, паводзьце сябе прыстойна!

*Нявеста К. развязвае Няньцы рот.*

НЯВЕСТА К. Ну, прызнавайся. Гэта ты даносіла пра кожны наш крок? Ты прыдумала адбіраць у нас булачкі ў знак пакарання?
НЯВЕСТА С. А куды ты падзела ўсе рэквізі... рэквізіраваныя памады і пудры?
НЯНЬКА. Я памятаю вас дзецьмі. *(Нявесце Д.)* Ты была самай худзенькай, самай дробненькай. Я чытала табе вершы і расказвала

казкі. А Нявесце С. заплятала коскі. А Нявесце К. стрыгла ногцікі на нагах...
НЯВЕСТА К. У нас, даражэнькая, ёсць імёны. Мы не мэбля якая, блін, каб называць нас інвентарнымі літарамі.
НЯНЬКА. Скажыце свае патрабаванні.
НЯВЕСТА К. Каб нас адпусцілі. Каб мы самі сабе былі гаспадынямі...
НЯВЕСТА С. Самі распараджаліся сваім жыццём і сваімі пачуццямі.

*На дзверы з таго боку пачынаюць напіраць робаты. Вось яны ўвальваюцца ў пакой.*
*Дзяўчаты збіліся ў купку вакол Нянькі.*

НЯВЕСТА Д. *(кідаецца да Робата).* Доктар!

*Робат лёгенька ўскінуў яе на спіну і панёс.*

НЯНЬКА *(уладарна).* Рукі! Рукі мне развяжыце!

*Дзяўчаты падпарадкаваліся. Нянька дастае з кішэні пульт упраўлення і адключае першага Робата. Накідваецца другі, усчалася куча-мала. Але тут зашчоўкалі фотаапараты. На чале трупы рэпарцёраў — чалавек у масцы (ён жа Жаніх).*

ЖАНІХ. Тут парушаюцца правы чалавека! Тут гандлююць жаночымі целамі і душамі!
НЯНЬКА *(мяняючыся на вачах).* Няхай жыве свабода! Слухайце ўсе! Доўга чакала я гэтай хвіліны! Свет павінен ведаць праўду. Адказнасць за ўсё, што здарылася, бярэ на сябе вызвольная жаночая арганізацыя «Рух». Мы праніклі ў гэту паўкрымінальную структуру, каб разбурыць яе знутры. Мы ўсялякімі шляхамі даносілі праўду да гэтых няшчасных дзяўчат, пазбаўленых дзяцінства і права распараджацца сваім лёсам. У іх адкрыліся ўрэшце вочы, нашы шэрагі папаўняюцца.

*З'яўляюцца Шэф з Аператарам, яны хапаюць Жаніха і зрываюць з таго маску.*

ШЭФ. А-а, знаёмы...
НЯНЬКА *(паказвае на Шэфа).* Вось ён арганізатар і натхніцель гэтай бруднай справы! Хай яго ведае свет!

У Шэфа адвісла сківіца. Дзяўчаты абдымаюць Няньку і верашчаць ад радасці.
ЖАНІХ *(паказваючы на Аператара).* Гэта ён упусціў сюды прэсу.
ШЭФ. Здраднікі! Паўсюль здраднікі! Дзе ахова? Дзе паліцыя?
НЯНЬКА *(уключае робатаў і дае каманду).* Патушыць агрэсію!
1-шы РОБАТ. Ёсць патушыць агрэсію.

*На Шэфа наступаюць робаты. Дзяўчаты скандзіруюць: «Гань-ба», «Гань-ба», Жаніх абдымае Нявесту Д., уваходзіць Псіхолаг у вайсковым мундзіры і трасе руку Няньцы, якая выцягнулася ў струнку.*

ПСІХОЛАГ. Дзякую за службу.

**Канец**

**ЗМЕСТ**


НА СЦЭНЕ ДНЯ

**Частка I**

ШУКАЙЦЕ КВЕТКУ-ПАПАРАЦЬ
ЧАРНАБОГ
А ЯК ЖА НЕПАСЕДА?
ЗОРНЫ ХЛОПЧЫК
ЛЯСНОЕ БРАЦТВА
ЯК ПТУШКІ ДУБ РАТАВАЛІ
ДЗЕНЬ ДОБРЫ, КАРАЛЕЎНА!

**Частка II**

ЛЮБОЎ ЗА ЎСЁ МАЦНЕЙ
УСІМ ГУД БАЙ!
ЯК ЛІСКА ЗАЙЦА АБДУРЫЛА
БУНТ НА КАРАБЛІ

*Літаратурна-мастацкае выданне*

*Каржанеўская Галіна Анатольеўна*

НА СЦЭНЕ ДНЯ

Зборнік п'ес
для лялечных і драматычных аматарскіх тэатраў

*Рэдактар В.М. Паўлючэнка*
*Кампьютэрны макет і вёрстка Ю.В. Шабан*
*Дызайн І.В. Мацкевіч*
*Карэктар А.В. Норына*

Падпісана да друку 11.02.2004. Фармат 60x84 1/16.
Папера афсетная. Гарнітура Baltica.
Ул.-выд. арк. 7,5. Ум. друк. арк. 10,58. Тыраж 200 экз.
Зак. 94.

Беларускі дзяржаўны інстытут праблем культуры.
ЛВ № 163 ад 28.01.2003 г.
220086, г. Мінск, вул. Каліноўскага, 12.

Надрукавана ў тыпаграфіі ТДА "Геапрынт".
ЛП № 427 ад 17.11.2000 г.
220037, г. Мінск, вул. Даўгабродская, 16.

© OCR: Камунікат.org, 2011 год
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2011 год
© PDF: Камунікат.org, 2011 год
© ePUB: Камунікат.org, 2011 год